ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

№6 (1053), ЧЭРВЕНЬ, 2021

Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

Палітыка. Эканоміка. Культура

ISSN 0320-7544



## ВІВАТ ВЯЛІКІ!

ISSN 0320-7544

ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАННЕ «ГОЛАС РАДЗІМЫ» — НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY

## Газета для суайчыннікаў, якую чытаюць па ўсім свеце



# ЗМЕСТ




БЕЛТА


**8** **Заманлівыя перспектывы для інвестараў**

У бліжэйшы час у рабоце Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка чакаюцца перамены, якія, як мяркуюць эксперты, зробяць "Вялікі камень" яшчэ больш прывабным






**12** **Строгае запатрабаванне часу**

Моцная ўлада патрэбна для мірнага і спакойнага жыцця краіны. Аб гэтым у інтэрв'ю газеце "СБ. Беларусь сегодня" заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка

**12** **Меры патрабуюць узгодненасці**

Падтрымку турыстычнай галіны краін СНД ва ўмовах пандэміі абмеркавалі ў Мінску

**13** **Памяць пра воінаў у зялёных фуражках**

У Інстытуце пагранічнай службы адбылася цырымонія гашэння спецыяльным памятным штэмпелем мастацкага маркіраванага канверта "Подзвіг пагранічнікаў у пачатку Вялікай Айчыннай вайны"

**13** **Вайна не адмяняла жыццё...**

Фотавыстава "Лёсы, складзеныя ў трохкутнік" прайшла ў Брэсцкай крэпасці





БЕЛТА


**14** **Якаў Пеўзнер — японіст з "шанхайскай пяцёркі"**

Здараецца, што ў жыцці чалавека галоўным складнікам яго біяграфіі з'яўляецца пэўны эпізод, які займае зусім няшмат часу. А далей чалавек жыве ўспамінамі пра тое важнае здарэнне, той важны адрэзак часу, які спраектаваў яго біяграфію на ўсё астатняе жыццё



**Беларусь. Belarus**

Грамадска-палітычны часопіс

**№ 5 (1053), чэрвень, 2021**
Выдаецца з 1930 года.
Аднойлены ў 1944 годзе.

**Заснавальнік:**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

**Галоўны рэдактар**
Харкоў Віктар Міхайлавіч

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Б. Хмяльніцкага, 10а,
г. Мінск, Беларусь, 220013.
Тэл.: +375 (17) 287-19-19,
+375 (17) 292-66-92.
Тэл./факс: +375 (17) 287-15-26.
**www.zviazda.by**
**E-mail:** belarus.mag@mail.ru

**Падпісны індэкс** — 74820.

Рэгістрацыйнае пасведчанне 8, выдадзена 16.07.2018 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Дызайн і вёрстка:**
Андрэй Сіняўскі

**Карэктар:**
Аліса Гюнгер

**«Беларусь.Belarus»** выходзіць на беларускай, англійскай і кітайскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **«Беларусь. Belarus»** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

Падпісана да друку 22.06.2021.
Фармат 60х84 ⅛.
Афсетны друк.
Папера крэйдаваная.
Ум.-друк. арк. 5,58
Ул.-выд. арк. 7,30

Агульны наклад — 815 асобнікаў (на беларускай мове — 296).

**Заказ**

Друкарня:
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект»
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014,
вул. В. Харужай, 13/61, Мінск, Рэспубліка Беларусь, 220123.



© Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"», 2021


*На першую старонку вокладкі фота прадастаўлена Вялікім тэатрам Беларусі*

# ЯШЧЭ Ў НУМАРЫ





**26 Новыя магчымасці — новыя ўражанні**

Тое, што турыстычная галіна ва ўсім свеце перажывае не лепшыя часы — далёка не навіна. Галоўная праблема гэтага, якая не абмінула, вядома ж, і Беларусь, таксама добра вядомая. Пандэмія. Менавіта яна ўнесла тыя негатыўныя карэктывы, што наўпрост закранаюць і сферу абслугоўвання. А таму найбольш актуальным стала пытанне аб тым, у якой меры змаглі своечасова перафарматаваць сваю працу беларускія турыстычныя арганізацыі

**38 Упершыню на кітайской мове**

Часопіс "Беларусь. Belarus", бадай — першая пляцоўка сучаснага часу, дзе пачалі друкаваць кітайскія пераклады беларускіх твораў для дзетак. Паэтычную падборку да гэтага нумара пераклаў Сюэ Цзінцянь. Ён вучыцца ў трэцім класе мінскай гімназіі №29







**30 Прыгажосць на вулічнай пляцоўцы**

У юбілейны год праекта "Мастак і горад" выстава на адной з вуліц Мінска прысвечана творчасці народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва

**42 Віват Вялікі!**

Нетрадыцыйны падарунак з нагоды свайго Дня нараджэння — святочны канцэрт — паднёс Вялікі тэатр Беларусі прыхільнікам опернага і балетнага мастацтва



## 1 ЭКСПАРТНАЯ ГЕАГРАФІЯ ПАШЫРАЕЦЦА

**Беларускую сельгастэхніку паставяць у Манголію з дапамогай экспартнага крэдыту, які прадаставіць Банк развіцця**

Калі дакладней, Банк развіцця прафінансуе экспартную пастаўку трактараў Belarus і іншай сельскагаспадарчай тэхнікі вытворчасці ААТ "МТЗ" агульным коштам 4,5 млн еўра на адрас Міністэрства харчавання, сельскай гаспадаркі і лёгкай прамысловасці Манголіі.

Гэта ўжо трэцяя індывідуальная крэдытная лінія ў рамках заключанага ў красавіку 2019 года генеральнага пагаднення паміж урадамі Беларусі і Манголіі аб прадастаўленні экспартнага крэдыту. Дакумент скіраваны на пашырэнне геаграфіі паставак беларускіх экспарцёраў, садзейнічае ўмацаванню знешнеэканамічных і гандлёвых сувязяў паміж прадпрыемствамі дзвюх краін.

Варта нагадаць, што Банк развіцця ў рамках пагаднення за 2019-2020 гады прафінансаваў пастаўкі пажарнай тэхнікі на адрас Нацыянальнага агенцтва па надзвычайных сітуацыях Манголіі, а таксама тэхнікі, якая рэалізуецца ААТ "МАЗ" — кіруючая кампанія холдынга "БЕЛАЎТАМАЗ", на адрас Цэнтра дарожна-транспартнага развіцця пры Міністэрстве развіцця дарог і транспарту Манголіі.

Уладзімір **Хромаў**

## 2 СТРАТЭГІЧНЫЯ НАПРАМКІ ЕЎРАЗІЙСКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

**Усе мэты Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе павінны быць дасягнуты да 2025 года, лічыць старшыня Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Міхаіл Мясніковіч**

Аб гэтым ён заявіў на сесіі Пецярбургскага міжнароднага эканамічнага форуму "ЕАЭС: поспехі і выклікі інтэграцыі, новая парадыгма развіцця".

"Да 2025 года павінны быць дасягнуты ўсе мэты, якія закладзены ў Дагаворы аб Еўразійскім эканамічным саюзе 2014 года", — сказаў Міхаіл Мясніковіч. Паводле яго слоў на гэта скіраваны і зацверджаныя ў канцы мінулага года прэзідэнтамі "пяцёркі" стратэгічныя напрамкі еўразійскай інтэграцыі да 2025 года.

"На якой пазіцыі мы знаходзімся сёння? Тое, што тычыцца гандлю таварамі, — паказчыкі каля 75 працэнтаў ад тых, будзем гаварыць, арыенціраў, якія былі закладзеныя ў дагаворы. Што тычыцца рынку паслуг і рынку працоўных рэсурсаў — недзе дзве трэці, больш за 60 працэнтаў. Крыху адстае фінансавы рынак: паводле ацэнак спецыялістаў — каля 40 працэнтаў. І ў гэтым плане, безумоўна, трэба будзе прыкладаць дадатковыя намаганні, каб выраўноўваць пазіцыі і рухацца далей", — адзначыў кіраўнік Калегіі ЕЭК.

Аляксей **Верамееў**

## 3 "БЕЛАГРА" — У 31-Ы РАЗ

**Больш за 350 кампаній з 16 краін свету прынялі ўдзел у міжнароднай спецыялізаванай выставе "Белагра-2021"**

Трэба сказаць, што "Белагра" традыцыйна з'яўляецца адной з самых маштабных падзей для аграпрамысловага комплексу Беларусі. Сёлета экспазіцыю дасягненняў айчынных аграрыяў на выставе зноў арганізавала Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Апошнія распрацоўкі па механізацыі сельскагаспадарчых працэсаў, па земляробстве, бульбаводстве і плодаагароднцтве прадэманстравалі навукова-практычныя цэнтры Нацыянальнай акадэміі навук. Спецыяльную экспазіцыю прадставіў навукова-практычны цэнтр НАН па жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі.

Прафесійным суправаджэннем выставы стала дзелавая праграма. У ходзе двух дзясяткаў тэматычных канферэнцый і семінараў абмяркоўвалася шырокае кола пытанняў па забеспячэнні канкурэнтаздольнасці сельгаспрадукцыі, выкарыстання зямельных рэсурсаў, развіццю племяннай жывёлагадоўлі, перспектывы супрацоўніцтва Беларусі з краінамі блізкага і далёкага замежжа ў сферы вытворчасці інавацыйных тэхналогій у галіне сельскай гаспадаркі. Дзелавая праграма выставы была напоўнена прэзентацыямі, майстар-класамі і конкурсамі.

Варта адзначыць, што 31-я Міжнародная спецыялізаваная выстава "Белагра-2021" праходзіла на тэрыторыі выставачнага цэнтра Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка "Вялікі камень". Экспазіцыя размяшчалася ў двух павільёнах і на адкрытай пляцоўцы.

Аляксандр **Піменаў**

# У САЮЗНІКАЎ — АДКАЗНАЯ СУТНАСЦЬ АДНОСІН



**Не будзе перабольшаннем сказаць, што ў апошні час Беларусь і Расія выступаюць галоўнымі ньюсмейкерамі навінавых стужак Захаду, што тлумачыцца сутнасцю пазіцый Масквы і Мінска па знешнепалітычных пытаннях. Нездарма на другі план сусветных медыя адыйшло нават супрацьстаянне ЗША і Кітая. Некаторыя эксперты ўжо заяўляюць, што калектыўны Захад губляе ініцыятыву і не можа прыняць існуючую рэальнасць, а такія абставіны толькі ўзмацняюць інтэграцыю як паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь, так і ўнутры СНД і ЕАЭС. У гэтым кантэксце вельмі паказальная майская сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна ў Сочы, парадак якой Кіраўнік беларускай дзяржавы напярэдадні акрэсліў наступным чынам: эканоміка, рэалізацыя сумесных праектаў у розных сферах, інтэграцыйная тэматыка, рэагаванне на знешні ціск і санкцыйную палітыку.**

Так, кіраўнікі абедзвюх дзяржаў на той сустрэчы былі адзіныя ў меркаванні, што з пункту гледжання эканомікі беларуска-расійскае ўзаемадзеянне развіваецца цалкам дынамічна. Нездарма Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Уладзіміра Пуціна, тады адзначыў:

— Эканоміка ў Расіі расце. Натуральна, прывязаная да Расіі і наша эканоміка нармальна рухаецца.

Уладзімір Пуцін таксама пацвердзіў у Сочы гэтую тэндэнцыю, падкрэсліўшы, што ў першым квартале гэтага года Расія застаецца ключавым гандлёва-эканамічным партнёрам Беларусі:

— Мы назіраем значны рост тавараабароту — 18,4 працэнта. Гэта добрая тэндэнцыя. Важна яе захаваць пры актыўнай працы ўрадаў.

Дарэчы, якраз у дзень сустрэчы Прэм'ер-міністр Расіі Міхаіл Мішусцін знаходзіўся ў Беларусі, прымаючы ўдзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў СНД. Менавіта Мішусцін паведаміў Пуціну з Мінска аб тым, што ў чэрвені будзе здадзены ў прамысловую эксплуатацыю першы блок БелАЭС.

— Гэта таксама яшчэ адзін добры прыклад нашага супрацоўніцтва. Ёсць добрыя пазітыўныя тэндэнцыі па іншых напрамках, — рабіў выснову Уладзімір Пуцін.

Прэзідэнт Расіі, у прыватнасці, адзначыў тады, што працягваецца праца і над пытаннямі будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Удакладнялася, што гэта робіцца зыходзячы з таго, каб забяспечыць інтарэсы як Беларусі, так і Расіі. Уладзімір Пуцін выказаў упэўненасць у тым, што гэтая праца дае канкрэтныя вынікі:

— Пытанне толькі ў тым, каб рабіць усё паслядоўна, не спяшаючыся, не забягаючы наперад; дзейнічаць паэтапна, маючы на ўвазе якраз забеспячэнне нашых інтарэсаў, як кожны з бакоў сам для сябе вызначае.

Прэзідэнт Беларусі, у сваю чаргу, выказаўся адносна таго, што было шмат размоў наконт самой сустрэчы:

— Нечакана нават для мяне. Маўляў, сустракаюцца вельмі часта і іншае... Але гэта наш план. Мы пра тое абвясцілі яшчэ ў канцы мінулага года: паступова будзем абмяркоўваць пытанні. Калі мы ўперліся ў нейкае пытанне і не можам яго без спецыялістаў разгледзець, то перадаем яго спецыялістам, яны рыхтуюць нам. Мы сустракаемся, зноў рухаемся. Галоўнае, што рухаемся наперад. Вы правільна адзначылі рост тавараабароту. Мы пралічваем цяпер літаральна кожную долю працэнта. І бачым, што перасягнем сёлета — Беларусь і Расія — свой тавараабарот дакавіднага ўзроўню. Тут якраз у нас тэмпы няпрэнныя.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў Беларусі тэмп росту ВУП прыкладна такі ж, як і ў Расіі.

Прэзідэнт Беларусі на сустрэчы таксама праінфармаваў расійскага калегу аб сітуацыі з самалётам RyanAir, які здзейсніў пасадку ў мінскім аэрапорце з-за сігналу аб мініраванні. Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб сітуацыі мінулага года, калі розным краінам прыйшлося вывозіць сваіх грамадзян з іншых дзяржаў на фоне абмежаванняў, выкліканых пандэміяй:

— Напэўна, больш Расіі ніхто не ратаваў сваіх людзей, вывозячы з курортаў. І нават з Індыяй нам вы дапамагалі, чалавек 200 вывезлі беларусаў, дзесьці мы адначасна вывозілі расійцаў — "Белавія" наша. Тады ўсё закрылася. Адзін аэрапорт у Мінску працаваў. Яны

(шэраг замежных краін, у тым ліку ў Еўрасаюзе, ЗША. — **Аўт.**) папрасілі "Белавія", і наша кампанія вывезла тысячы чалавек: шведаў, немцаў, палякаў, амерыканцаў. Не ўяўляеце, як яны былі нам удзячныя — "Белавія" — за вывезеных людзей, выратаваных!

У сувязі з гэтым Прэзідэнт Беларусі акцэнтаваў увагу на рэакцыі гэтых жа краін паводле выпадку з самалётам RyanAir, які здзейсніў пасадку ў Мінску з-за паведамлення аб мініраванні.

— За што пакаралі працоўны калектыў "Белавія"? За тое, што яны ў COVID іх вывозілі тысячамі. Вось іх твар...

Уладзімір Пуцін у гэтай сувязі прыгадаў выпадак, калі на Захадзе ў свой час пасадзілі самалёт прэзідэнта Балівіі:

— Прэзідэнта вывелі з самалёта, і нічога — цішыня.

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся і адзначыў, што ёсць і іншыя выпадкі ў свеце, калі прымушалі да пасадкі самалёты тых ці іншых краін і пры гэтым ніхто не крычаў з гэтай нагоды:

— Проста зразумела, што ад нас хочуць гэтыя "сябры" нашы заходнія. Што тут абмяркоўваць?.. Але няма тых вышынь, якія бальшавікі не бралі. Возьмем і мы...

Пазней ужо ў Мінску Прэзідэнт Беларусі яшчэ больш раскрыў падрабязнасці перамоў у Сочы і пазначыў галоўныя прынцыпы і прыярытэты беларуска-расійскай інтэграцыі. Адбылося гэта ў Палацы Незалежнасці на нарадзе з удзелам вышэйшых службовых асоб і членаў Урада.

Справа ў тым, што сочынскія перамовы лідараў дзвюх краін нарабілі шмат шуму ў медыйнай прасторы. Уласна, кожная сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна заўсёды выклікае непадробную цікавасць. Але ў апошні час адбылося нямала рэзанансных падзей, а з боку Захаду было зроблена шмат гучных заяваў у адрас Беларусі і Расіі. Таму ўсе чакалі сумеснай рэакцыі вышэйшага палітычнага кіраўніцтва дзвюх краін. Тым больш, што яшчэ да пачатку цяперашніх перамоў і асабліва пасля іх на розных сеткавых рэсурсах, у тэлеграм-каналах сталі з'яўляцца разнастайныя здагадкі. На гэты конт Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз нагадаў, што парадак яго перамоў з расійскім калегам быў вызначаны яшчэ ў канцы мінулага года, і тая сустрэча стала працягам папярэдніх кантактаў на розных узроўнях. Абмяркоўваць на ёй загадзя вызначалася перш за ўсё эканоміку. Так яно і атрымалася. Само сабой, не абышлі ўвагай і падзеі апошніх дзён: супрацьстаянне санкцыям, аднаўленне авіяпералётаў паміж краінамі, затрыманне Рамана Пратасевіча і Сафіі Сапегі. Дарэчы, следства па абедзвюх персонах будзе праходзіць у Беларусі, заявіў Аляксандр Лукашэнка:

— Гэта непахісна. Пра гэта я сказаў Прэзідэнту Расіі. Я запэўніў, што ніякіх не будзе пытанняў з доступам консулаў. Па-мойму, яны не крыўдзяцца. Мы не толькі даём інфармацыю, хочаце сустракацца — сустракайцеся. Гэта міжнародная практыка.

Але галоўным пунктам парадку сочынскіх перамоў, як зноў падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі, было эканамічнае супрацоўніцтва. У прыватнасці, пастаўка расійскай нафты на беларускія нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы:

— Урады вельмі сур'ёзна прапрацавалі гэтае пытанне, і як мінімум мы дамовіліся, што ніякіх праблем з пастаўкамі нафты не будзе. Расіі гэта выгадна. Мы можам 22 мільёны тон нафты перапрацаваць.


БЕЛТА

На сустрэчы ў Сочы




На нарадзе ў Мінску

Тое ж самае тычыцца і імпарту прыроднага газу. Пастаўкі ідуць пад поўную патрэбнасць, і праглядваюцца перспектывы нядрэнныя, лічыць Аляксандр Лукашэнка:

— Прэзідэнт мне паабяцаў, што яны збяруцца і падумаюць, як у гэтай сітуацыі дапамагчы Беларусі з коштам на газ. Але маё адчуванне такое, што мы можам купляць у Расіі газ у будучым годзе не вышэй кошту гэтага года.

Відавочна, што пытанне па газе яшчэ будзе прапрацоўвацца з наступным заключэннем міжурадавага пагаднення.

Акрамя таго, на сустрэчы ў Сочы дасягнута прынцыповая дамоўленасць па мінімізацыі страт беларускіх НПЗ ад падатковага манеўру ў Расіі з 1 студзеня 2022 года. Урадам даручана канчаткова адпрацаваць гэтую схему.

— Па падатковаму манеўру мы знайшлі развязкі. Нават не мы, а ўрады. Мы проста гэта ўзгаднілі і зацвердзілі. Далей будзем весці дыялог і дамаўляцца, — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Што тычыцца падатковага заканадаўства Саюзнай дзяржавы ў цэлым, расійскі бок прапануе яго таксама зблізіць. Аляксандр Лукашэнка згодны, але на ўмовах узаемнасці:

— Гаворка ідзе аб спалучэнні дзвюх сістэм. Не трэба нічога тут баяцца, усё будзе на роўных умовах. Мы будзем бачыць усё, што ў Расіі, яны будуць бачыць усё, што ў нас. Каб быў давер — без гэтага мы нікуды не рушым.

Гаварылі на сустрэчы і пра збліжэнне мытнага заканадаўства, у цэлым аб уніфікацыі працы мытных органаў. Перашкод да гэтага Аляксандр Лукашэнка не бачыць — пытанне ўжо сур'ёзна прапрацаванае ў рамках ЕАЭС, а беларускае і расійскае заканадаўства ў прынцыпе вельмі блізкае:

— Розныя былі меркаванні наконт гэтага: давайце ледзь не наднацыянальны нейкі орган ствараць, нейкае міністэрства. Мы з Пуціным адмовіліся ад усялякіх інсінуацый, каб нас не папракалі. Але я прапанаваў: давайце створым супольны цэнтр, калі ён патрэбны, які будзе мець доступ як да пытанняў мытнай мяжы Расійскай Федэрацыі, так і ў нас.

Беларускі бок гатовы даць на гэты конт усходняй суседцы любую неабходную інфармацыю.

На сустрэчы ў Сочы бакі пацвердзілі узаемную цікавасць да пытанняў працы ваенна-прамысловых комплексаў абедзвюх краін, развіцця кааперацыі і паставак у Беларусь сучаснага ўзбраення.

— Ніякіх абмеркаванняў у плане перакідвання Узброеных сіл Расіі на пастаяннай аснове, стварэння нейкіх баз — пра гэта нават гаворкі не ішло. І гэта нам не трэба. Па нашай канцэпцыі ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы ў гэтым пакуль няма ніякай неабходнасці, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Але будзе нейкая насцярожанасць, будзем бачыць актывізацыю ў НАТА, аж да ваеннага канфлікту, на працягу сутак (базы, аэрадромы ды іншае ў нас вызначаны) расійскія падраздзяленні і войскі будуць перакінутыя ў Беларусь.

Значны час на перамовах у Сочы прэзідэнты прысвяцілі адказу на санкцыі. Меры рэагавання прапрацаваць даручылі ўрадам. Адказваючы на пытанні журналістаў, Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся з тым, што санкцыйная палітыка калектыўнага Захаду супраць Беларусі ўсё больш падобная на спробу рэйдарскага захопу сектараў беларускай эканомікі. Але прапанаваў паглядзець на пытанне глыбей, нагадаўшы аб тым, што, насуперак прагнозам некаторых экспертаў, якія прадракалі крах беларускай эканомікі, за 4 месяцы гэтага года ВУП Беларусі вырас на 2,5 працэнта:

— Хто б мог падумаць... Я, напрыклад, гэтага не чакаў. Ну і па іншых напрамках — прамысловасць нарэшце дадала, выходзіць аграрны сектар на добрыя паказчыкі.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што любы крызіс — гэта не толькі цяжкасці, але і магчымасці. І той, хто першым выйдзе з крызісу, той і атрымае пэўныя дывідэнды. Таму адна з мэтаў Захаду — ударыць па бюджэтаўтваральных прадпрыемствах, каб пагоршыць сітуацыю ў эканоміцы і ў краіне ў цэлым. Гэта датычыцца і пагрозы Еўрапейскага Саюза забараніць транзіт расійскага газу праз Беларусь па трубе Ямал — Еўропа. На гэты конт у Аляксандра Лукашэнкі такая пазіцыя:

— Я не думаю, што еўрапейцы зробяць стрэл сабе ў нагу. Яны ж — не Украіна. Таму я не думаю, што яны возьмуцца за гэты рычаг. Гэта ім ужо тады зусім дарага абыйдзецца. І тут яны ўжо будуць мець справу не толькі і не столькі з Беларуссю, колькі з Расіяй. А з Расіяй, яны разумеюць, што лепш не мець справы.

Відавочна, што Мінск і Масква маюць намер разам рэагаваць на выклікі і пагрозы звонку. Нездарма Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў:

— Разуменне таго, што вакол нас пачынаюць аб'ядноўвацца пэўныя сілы і ціснуць на нас, і ў Прэзідэнта Пуціна, і ў мяне ёсць. Мы выдатна разумеем, што адбываецца вакол нашай краіны, і абсалютна аднолькава ацэньваем гэтую сітуацыю. І поўныя рашучасці разам супрацьстаяць усім гэтым нападкам.

На відэакадрах з Сочы многія звярнулі ўвагу на чорны дыпламат, які захапіў з сабой на перамовы Прэзідэнт Беларусі. Аляксандр Лукашэнка на нарадзе сказаў:

— Калі б мы ў адкрыты эфір выклалі ўсе дакументы гэтага чамаданчыка, то, напэўна, шмат было б размоў. І было б што абмяркоўваць.

Паводле слоў Прэзідэнта, у дыпламаце знаходзіліся аналітычныя матэрыялы, падрыхтаваныя беларускімі спецслужбамі:

— Аб сітуацыі вакол Беларусі і Расіі, у цэлым Саюзнай дзяржавы, аб тым, якое сёння стаўленне Амерыкі, Еўрапейскага саюза ды іншых да Кітайскай Народнай Рэспублікі, і шмат іншых падобных матэрыялаў. Гэта вельмі вялікая праца нашых ведамстваў, перш за ўсё спецыяльных службаў, аналітыка, з якой я хацеў азнаёміць Прэзідэнта Пуціна.

Аляксандр Лукашэнка перасцярог ад таго, каб у грамадстве ўспрымалі гэта як нейкую справаздачу. Прэзідэнты Беларусі і Расіі даўно ўзялі за практыку абменьвацца такой інфармацыяй, калі яна тычыцца адной з бакоў.

***"Ніякіх абмеркаванняў у плане перакідвання Узброеных сіл Расіі на пастаяннай аснове, стварэння нейкіх баз — пра гэта нават гаворкі не ішло. І гэта нам не трэба. Па нашай канцэпцыі ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы ў гэтым пакуль няма ніякай неабходнасці."***
Аляксандр Лукашэнка

Між тым, у Сочы абмяркоўвалася і сітуацыя з "Белавія". Пазіцыя Аляксандра Лукашэнкі: авіякампанія не мае ніякага дачынення да інцыдэнту з самалётам RyanAir. Лідары Беларусі і Расіі даручылі міністрам транспарту ў самыя кароткія тэрміны вызначыцца, у якія расійскія гарады "Белавія" хацела б лётаць. У першую чаргу гэта найбуйнейшы хаб — Масква, у якой цяпер будуць стыкавацца рэйсы для беларускіх турыстаў. Акрамя таго, Кіраўнік беларускай дзяржавы папрасіў расійскіх калег вывучыць пытанне пералёту "Белавія" ў Сочы і Краснадарскі край, дзе размешчаны беларускія здраўніцы:

— Нам галоўнае — даць працу нашым пілотам і задзейнічаць тыя самалёты, якія мы з такой цяжкасцю ў няпросты час закуплялі. А ў нас сур'ёзна абнавіўся парк самалётаў. І я абяцаў, што "Белавія" мы ў бядзе не кінем. Гэтую кампанію, чаго б нам ні каштавала, справа нашага гонару — падтрымаць. Па ўсіх напрамках.

Рэалізацыя адпаведных дамоўленасцяў даручана Прэм'ер-міністру, міністрам замежных спраў, транспарту і камунікацый. Патрабаванне Прэзідэнта адно — калектыў "Белавія" (амаль дзве тысячы чалавек) павінен мець працу і быць упэўненым, што дзяржава іх не кіне.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што ў Сочы канчаткова вырашана пытанне аб пералічэнні Беларусі другога транша расійскага крэдыту. Як вядома, пагадненне аб прадастаўленні Беларусі расійскага крэдыту ў суме мільярда долараў падпісана 21 снежня 2020 года. Першы транш у памеры 500 мільёнаў долараў Мінфін Беларусі атрымаў 30 снежня мінулага года.

Ацэньваючы вынікі сочынскай сустрэчы ў цэлым, Прэзідэнт Беларусі на нарадзе ў Мінску зрабіў высnову, што ў яго засталося ад яе добрае ўражанне.

У сваю чаргу Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка па выніках нарады распавёў журналістам, што блізкая да завяршэння праца над саюзнымі праграмамі па эканамічнай інтэграцыі Беларусі і Расіі:

— Фактычна мы выходзім на фінішную прамую па ўзгадненні ўсіх саюзных праграм, якія ахопліваюць пабудову адзінай эканамічнай прасторы дзвюх краін дзеля таго, каб забяспечыць роўныя ўмовы працы суб'ектаў гаспадарання Беларусі і Расіі. У цэлым гэтыя падыходы падтрыманы, і нам засталося дашліфаваць некалькі пытанняў з тым, каб не пазней за лета завяршыць усю працу і ўнесці кіраўнікам дзяржаў падрыхтаваныя рашэнні з гэтай нагоды.

Раман Галоўчанка падкрэсліў, што гаворка ў прынцыпе не ідзе аб якой-небудзь шкодзе палітычнаму ці эканамічнаму суверэнітэту Беларусі:

— Мы выбудоўваем новую мадэль стасункаў у рамках адзінай эканамічнай прасторы, каб стварыць не проста роўныя ўмовы, а нейкія новыя мадэлі эканомік, якія павінны развівацца сінхронна.

Васіль **Харытонаў**

# ЗАМАНЛІВЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ ДЛЯ ІНВЕСТАРАЎ




У бліжэйшы час у рабоце Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка чакаюцца перамены, якія, як мяркуюць эксперты, зробяць "Вялікі камень" яшчэ больш прывабным

### ЧАС АБНАЎЛЯЦЬ ПРАВІЛЫ

Перш за ўсё трэба адзначыць той факт, што напачатку Прэзідэнту Беларусі быў прадстаўлены праект указа, скіраванага на паляпшэнне інвестыцыйнага клімату ў Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку "Вялікі камень". Як распавёў журналістам кіраўнік адміністрацыі парка Аляксандр Ярашэнка, Прэзідэнт адобрыў прапановы, чакаецца, што указ у хуткасці быў падпісаны. У ліку ключавых змен — спрашчэнне адміністрацыйных працэдур, наданне большай самастойнасці органам кіравання парку, пашырэнне яго відаў дзейнасці, падтрымка стартапаў. "Прапановы накіраваны на дэбюракратызацыю вядзення бізнесу, прыцягненне новых інвестараў у праект "Вялікі камень", — удакладніў Аляксандр Ярашэнка.

Такім чынам, адміністрацыі індустрыяльнага парку ў першую чаргу плануецца перадаць дадатковыя паўнамоцтвы мясцовых органаў улады. Калі дакладней, амаль 60 новых адміністрацыйных працэдур будзе курыраваць цэнтр комплекснага абслугоўвання парка, які працуе па прынцыпе "адна станцыя". Гэта ў выніку дасць магчымасць павысіць хуткасць і эфектыўнасць прымаемых рашэнняў.

— Нават выкарыстанне ўжо дзеючых нормаў дазволіла нам у некалькі разоў скараціць тэрміны будаўніцтва, — распавёў Аляксандр Ярашэнка. — Напрыклад, сумесны праект "МАЗ-Вэйчай" пабудаваны ў рэкордныя тэрміны, за восем месяцаў, і цяпер актыўна выпускае прадукцыю. Аналагічная сітуацыя і па многіх іншых прадпрыемствах, што дазваляе нам хутка рухацца ў прыняцці рашэнняў.

У сукупнасці ў адміністрацыі будзе каля 90 працэдур адміністрацыйна-дазвольнага характару. Гэта амаль палова тых працэдур, якія неабходныя для вядзення бізнесу ў любым пункце Беларусі. Акрамя таго, у "Вялікім камені" ўсе адміністрацыйныя працэдуры ўжо ажыццяўляюць у электронным выглядзе, імкнуцца і надалей да таго, каб максімальную іх колькасць праводзіць без папяровых носьбітаў. Гэта значыць — укараніць літаральна лічбавы рэжым.

Трэба сказаць, што пашыраецца і склад суб'ектаў, якія абслугоўваюцца ў "адной станцыі". Скарыстацца яе паслугамі змогуць не толькі рэзідэнты, але і літаральна ўсе кампаніі, якія працуюць у парку, а таксама фізічныя асобы, якія жывуць або працуюць тут.

У адпаведнасці з новым указам плануецца пашырыць асноўныя напрамкі дзейнасці індустрыяльнага парка "Вялікі камень", каб павялічыць кола прыцягваемых інвестараў. У ліку новых кірункаў — вытворчасць медыцынскай прадукцыі, медыцынскае абслугоўванне, лабараторная дыягностыка, біяфармацэўтыка. Адным з рэзідэнтаў парка ўжо запланаваны праект па стварэнні Цэнтра традыцыйнай кітайскай медыцыны. Таксама перспектыўным напрамкам Аляксандр Ярашэнка лічыць прымяненне тэхналогій 5G. "У нас быў ужо такі пілотны праект. А з прыняццем новага ўказа з'явіцца прававая база для ўкаранення 5G, штучнага інтэлекту", — растлумачыў ён.

### ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО ДЛЯ ІНАВАЦЫЙ

Варта нагадаць, што ў канцы 2020 года ў "Вялікім камені" адкрыўся Цэнтр трансфармацыі навукова-тэхнічных дасягненняў. Гэта — сумесны беларуска-кітайскі праект. Дык вось, згодна з ім на працягу першых двух гадоў розныя стартапы змогуць карыстацца ўсімі асноўнымі льготамі рэзідэнтаў парку, пры гэтым самі яны не будуць з'яўляцца рэзідэнтамі "Вялікага каменя".

"На конкурснай аснове, адабраўшы адпаведны праект, мы праз шэсць месяцаў пасля праходжання інкубіравання будзем глядзець на прамежкавыя вынікі. Калі яны станоўчыя, то мы даем вырасці з ідэі ў камерцыйны праект і магчымасць стаць рэзідэнтам пар-

ка", — распавёў кіраўнік адміністрацыі "Вялікага каменя", адзначыўшы, што сфера інавацый — вельмі рызыкоўная. Калі стартапам не аказваецца падтрымка, то, як правіла, выжывае толькі адзін з дзесяці праектаў. Калі ж дзяржава і інвестары дапамагаюць маладым кампаніям, то ўзровень выжывальнасці дасягае 70-80 працэнтаў.

Цяпер дадатковыя льготы змогуць атрымаць праекты з інвестыцыямі не менш як $50 млн. Сярод іх — ільготныя цэны на зямельныя ўчасткі, спрашчэнне ў сферы мытнага адміністравання і іншыя. У "Вялікім камені" ўпэўненыя, што прыцягненне буйных інвестараў дазволіць пашырыць кластарны прынцып дзейнасці. У далейшым, па асобных рашэннях Урада, змогуць скарыстацца прэферэнцыямі і прадпрыемствы па-за паркам, але толькі тыя, якія ўдзельнічаюць у капітале і вытворчым працэсе рэзідэнтаў. Акрамя гэтага, для стымулявання стварэння субпаркаў, перш за ўсё, буйных кітайскіх рэгіёнаў, у прыватнасці, правінцый Сычуань, Шэньсі, Цяньцзінь, па новым указе кампаніі — стваральнікі субпаркаў — змогуць атрымаць статус рэзідэнта.

## ДАДАТКОВЫЯ БОНУСЫ ДЛЯ ІНВЕСТАРАЎ

Кіраўнік адміністрацыі парка растлумачыў, што праца над дакументам вялася працяглы час, улічваліся многія фактары, у тым ліку сучасныя ўмовы вядзення бізнесу, сітуацыя ў эканоміцы ў цэлым. Многія прапановы паступалі ад саміх рэзідэнтаў, з улікам іх вопыту работы ў парку. Падрыхтоўка прапаноў вялася таксама ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам камерцыі Кітая. Уласна кажучы, жыццё само патрабуе такіх правілаў, таму што нельга стаяць на месцы нават у заканадаўчым плане.

Між іншым, тыя вынікі, якія дэманструе "Вялікі камень" у цяперашні час, пацвярджаюць эфектыўнасць яго працы. "Я хачу не без гонару сказаць, што ў парку сярод працуючых — больш за 80 працэнтаў беларусаў і ў іх годная заработная плата — парадку Br2,7 тыс.", — прывёў прыклад Аляксандр Ярашэнка. Паводле яго даных, на 1 рубель падатковых ільгот, прадастаўленых рэзідэнтам парка, Беларусь атрымлівае каля 10 дадатковых рублёў у эканоміку краіны. Калі казаць аб інвестыцыях, то суадносіны 1 да 60, інфраструктурных укладаннях — 1 да 9. То бок, эфект досыць добры, станоўчы.

## СМЕЛЫ ПАЧАТАК, УПЭЎНЕНЫ ПРАЦЯГ

Калі ж звярнуцца да вытокаў з'яўлення пад Мінскам індустрыяльнага парка, то варта нагадаць аб тым, што ў свой час Беларусь стала адной з першых еўрапейскіх дзяржаў, хто адгукнуўся на заклік Кітая прыняць удзел у рэалізацыі глабальнай ініцыятывы "Адзін пояс, адзін шлях". І вось сёння "Вялікі камень" справядліва называюць пярлінай новага Шаўковага шляху. Таму як парк прывабны адмысловымі фінансавымі ўмовамі, развітой інфраструктурай і лагістыкай.

***Усяго ў парку зарэгістраваныя 69 рэзідэнтаў з 13 краін з заяўленым аб'ёмам інвестыцый больш за 1,25 млрд долараў. Каля паловы рэзідэнтаў ужо запусцілі вытворчасці, што дазволіла стварыць звыш 1660 працоўных месцаў.***

Аб гэтым, дарэчы, кажа стабільны і паступальны рост колькасці рэзідэнтаў парка і ствараемых імі вытворчасцяў. Паводле інфармацыі кіраўніка адміністрацыі "Вялікага каменя" ў інфраструктуру парка ўкладзена каля 295 мільёнаў долараў, з іх бюджэтных — 31 мільён. Так, эксперты палічылі: на адзін рубель дзяржаўных грошай у інфраструктуру прыцягнута дзевяць рублёў інвестыцый. І, безумоўна, галоўнае цяпер, у тым ліку пасля прыняцця новага заканадаўчага акта, — маштабаваць і развіваць агульны поспех. Дарэчы, сёння ў парку рэалізуюцца праекты 69 рэзідэнтаў з заснавальнікамі з 13 краін, у тым ліку Кітая, Германіі, Швейцарыі, ЗША. Капіталаўкладанні — каля паўтара мільярда долараў. Разам з тым, у падрыхтаваным праекце ўказа прапануецца скарэкціраваць умовы працы рэзідэнтаў. Гэта тычыцца, напрыклад, фарміравання прамысловых кластараў і падтрымкі інавацыйнай дзейнасці. У цэлым парк арыентаваны на некалькі базавых кластараў: аўтакампаненты, электратранспарт і электраабсталяванне, медыцынская прадукцыя і абсталяванне, фармацэўтыка, комплексная лагістыка.

Па словах Аляксандра Ярашэнкі, сусветны вопыт паказвае, што без падтрымкі выстрэльвае каля дзесяці працэнтаў праектаў, а пры актыўным удзеле дзяржавы і інвестараў працэнт рэалізацыі, як ужо адзначалася, можа ўзрасці да 70-80. Да таго ж, прыцягненне буйных інвестараў дазволіць пашырыць той жа самы кластарны прынцып дзейнасці. Пілотным у гэтым сэнсе можа стаць прыход у парк карпарацыі Geely з планамі па выпуску рухавікоў.

Галоўнае ж патрабаванне Прэзідэнта пры разглядзе гэтага праекта — які эфект, перш за ўсё, эканамічны, фінансавы можа атрымаць "Вялікі камень" ад прыняцця новай заканадаўчай базы. "Сваёй мэтай мы ставім дасягнуць сур'ёзных эканамічных вынікаў, — сказаў аб планах кіраўнік адміністрацыі парка, падкрэсліўшы пры гэтым, што сутнасць не ў пагоні за колькасцю рэзідэнтаў альбо за другараднымі паказчыкамі. Варта, каб праект працаваў на эканоміку Беларусі і ва ўзаемадзеянні з ёй. Вядома ж, прыносіў пэўную выгаду і інвестарам.

Аляксей **Фядосаў**



Кантралёр станочных і слясарных работ Чжан Сяоган і слесар ААА "Фаст-МАЗ" Цімафей Макаранка

# МЕДЫЯТРЭНДЫ ПАДНЯБЕСНАЙ

## Куды рушыць інфармацыйная прастора найбуйнейшай краіны?

Паднябесная — неаспрэчны сусветны лідар "эры лічбы". Пра гэта, дарэчы, сведчаць дадзеныя, апублікаваныя Кітайскай акадэміяй даследаванняў кіберпрасторы. Як адзначаюць эксперты, аб'ём лічбавай эканомікі КНР ужо ў 2019-м перасягнуў гістарычную мяжу ў 5 трыльёнаў долараў. На долю "лічбы" прыпадала 35,8 трыльёна юаняў ($5,45 трлн.) — 36,2 працэнта ВУП краіны. Пандэмія каранавіруса стала адным з фактараў, які стымуляваў імклівае развіццё гэтага кірунку. Зразумела, адпаведная трансфармацыя закранула і інфармацыйную прастору. У гэтай найважнейшай сферы Паднябесная стала заканадаўцай шэрагу сусветных медыятрэндаў. Куды ж рушыць інфапрастора найбуйнейшай краіны свету?




Лагатып сумеснага праекта з "Жэньмінь Жыбаа"

### "ЗУМЕРЫ" І ПЕНСІЯНЕРЫ

Аўдыторыя Паднябеснай — найвялікшая ў свеце. Як вядома, паводле дадзеных апошняга перапісу колькасць насельніцтва кантынентальнай часткі Кітая дасягнула 1 мільярда 411,78 мільёна чалавек. Аб гэтым паведамілі ў Дзяржаўным статыстычным упраўленні (ДСУ) КНР са спасылкай на дадзеныя сёмага агульнанацыянальнага перапісу насельніцтва.

На IV саміце "Лічбавы Кітай", які арганізаваны Дзяржаўнай канцылярыяй інтэрнэт-інфармацыі, былі прадстаўлены "Даклад аб развіцці лічбавага Кітая (2020)". Згодна з дакументам, у апошнія пяць гадоў КНР быў лідарам па маштабах будаўніцтва інфармацыйнай інфраструктуры. Паднябесная стварыла самую вялікую ў свеце оптавалакновую сетку і сетку 4G. Да канца мінулага года колькасць інтэрнэт-карыстальнікаў павялічылася да 989 мільёнаў, а каэфіцыент распаўсюджвання інтэрнэту дасягнуў 70,4 працэнта. Такія дадзеныя па выніках спецыяльнага даследавання найбуйнейшай газеты не толькі Паднябеснай, а і ўсяго свету — "Жэньмінь Жыбаа" — узгадаў рэдактар цэнтра новых медыя партала "Жэньмінь жыбаа" анлайн" Ні Таа. Тэндэнцыі былі акрэслены падчас маштабнага міжнароднага сеткавага семінара, які праводзіць Кітайскі камітэт ШАС па добрасуседстве, сяброўстве і супрацоўніцтве сумесна з парталам "Хуаньцюван" пры газеце "Жэньмінь жыбаа". У мерапрыемстве ўдзельнічала і "Звязда".

Галоўным чынам падключэнне да "сусветнага павуціння" ў Кітаі адбываецца праз смартфоны — 99,7 працэнта карыстальнікаў выходзяць у глабальную сетку менавіта так. Кітайцы ў сярэднім цяпер праводзяць у інтэрнэце амаль чатыры гадзіны штодня. Гэта менш, чым год таму, такая тэндэнцыя тлумачыцца тым, што летась у людзей было больш вольнага часу з-за пандэміі. Самая вялікая колькасць карыстальнікаў — 20,5 працэнта — людзі ва ўзросце 30-39 гадоў. Аўдыторыя 40-49-гадовых — 18, 8 працэнта, 20-29-гадовых — 17,8 працэнта. У Кітаі вельмі ўважліва вывучаюць запыты розных катэгорый карыстальнікаў. Цікава, што апроч сусветнай стаўкі на "зумераў" вялікая ўвага надаецца пенсіянерам. І гэта апраўдана — як вядома, колькасць насельніцтва ў Паднябеснай ва ўзросце 60 гадоў і старэй перавышае чвэрць мільярда чалавек.

У Кітаі праводзіцца трохгадовая кампанія, накіраваная на аказанне дапамогі пажылым грамадзянам у пераадоленні лічбавага бар'ера, каб яны маглі цалкам карыстацца выгодамі пастаянна інтэлектуальных тэхналогій і інфармацыйных паслуг. Кампанія робіць акцэнт на паляпшэнні работы, накіраванай на ліквідацыю бар'ераў на шляху да сучаснага інфармацыйнага грамадства і павышэнні яго даступнасці для людзей сталага ўзросту.

### АД ПК ДА ШТУЧНАГА ІНТЭЛЕКТУ

Як заўважыў Ні Таа, развіццё інтэрнэта ў Кітаі можна ўмоўна падзяліць на тры "дзесяцігодкі". 1996-2006 гады: эпоха персанальных камп'ютараў, выхад праз браўзеры на ПК. 2006-2016 гады: мабільны інтэрнэт, шырокае распаўсюджванне дадаткаў. 2016-2026 гады: штучны інтэлект, дабаўленая рэальнасць, так званы "акулярны інтэрнэт".

Адпаведна змянялася і інфармацыйная прастора. Як адзначыла прафесар Кітайскага ўніверсітэта камунікацый Чжан Яньцю, адбываецца імклівая трансфармацыя традыцыйных медыя. Адзін з адметных прыкладаў такіх змяненняў — вопыт развіцця партала "Хуаньцюван". Ён адзін з самых наведвальных у Паднябеснай — штодзённая аўдыторыя дасягае больш чым 100 мільёнаў чалавек. Пачынаўся гэты маштабны праект з адпаведнага аддзела ўплывовай кітайскай газеты "Хуаньцю шыбаа" (падраздзяленне "Жэньмінь жыбаа"), якая галоўным чынам распрацоўвае міжнародную тэматыку.

Адпаведнае тэматычнае поле і ў huanqiu.com. Як заўважыў галоўны рэдактар "Хуаньцюван" Шы Дзін, "мы з'яўляемся адным з галоўных пастаўшчыкоў міжнародных навін". Гэтае сеткавае выданне сярод найбольш аўтарытэтных у Паднябеснай. "Хуаньцюван" аператыўна рэагуе на выклікі часу, у прыватнасці, у плане візуалізацыі кантэнту, актыўнай работы на розных платформах, сацыяльных сетках. Як адзначае галоўны рэдактар партала, цяпер узрастае канкурэнцыя не толькі сярод медыя, актыўна падключаюцца і блогеры. Цяпер гэта не толькі знакамітасці, а і простыя людзі, якія "злавілі хвалю". Блогерамі паспяхова могуць выступаць нават хатнія жывёлы.




Партал актыўна перафарматаваўся на прыярытэтную падачу відэанавін, прымяняе дроны, тэхніку віртуальнай рэальнасці. Адметна, што важнае месца ў навінавай стужцы "Хуаньцюван", як заўважыў галоўны рэдактар партала, займаюць паведамленні з Беларусі. "Мы аператыўна рэагуем на важныя падзеі ў вашай краіне", — заўважыў Шы Дзін.

### "ЗОРКІ" З ГЛЫБІНКІ

У Кітаі актыўна развіваюцца камерцыяныя платформы, мабільныя дадаткі, сацыяльныя сеткі. Праўда, са сваімі асаблівасцямі. Ва ўсіх на слыху шматфункцыянальныя платформы Weibo, WeChat, насамрэч рэвалюцыйны сэрвіс TikTok (у Кітаі вядомы як Douyin, працуе на асобным серверы). Між тым, гэтым інфаплынь Паднябеснай зусім не абмяжоўваецца.

Сэрвіс Kuaishou, які дазваляе звычайным людзям публікаваць кароткія відэа, выйшаў на IPO у Ганконгу і прыцягнуў 41,3 млрд ганконскіх долараў ($ 5,4 млрд). Гэта найбуйнейшае тэхналагічнае IPO з моманту выхаду Uber на біржу. Kuaishou можа паўтарыць поспех свайго канкурэнта — TikTok, лічаць эксперты.

Kuaishou заснавалі былы супрацоўнік Google Су Хуа і праграміст Чэн Ісяа. Су Хуа нарадзіўся ў правінцыі Хунань, у горнай мясцовасці на поўдні Кітая. У яго роднай вёсцы да 1998 года не было электрычнасці. Ён атрымаў ступень бакалаўра мастацтваў і навук ва Універсітэце Цінхуа, адной з лепшых навучальных устаноў КНР. Пасля працаваў праграмістам у пекінскім офісе Google. Ісяа таксама праграміст: ён спачатку вучыўся ў Паўночна-усходнім універсітэце ў правінцыі Ляанін, а потым працаваў у амерыканскай Hewlett-Packard і кітайскай сацсетцы Renren.

Як заўважыў віцэ-прэзідэнт Kuaishou Лю Чжэнь, на платформе звычайныя людзі распавядаюць пра сваё жыццё і пры гэтым становяцца папулярнымі. Гэта дазваляе павышаць свой дабрабыт. Напрыклад, Юань Гуйхуа з невалічкай горнай вёскі ў правінцыі Гуйчжоў прыцягнула 3 мільёны падпісчыкаў, распавядаючы аб лоўлі рыбы, падрыхтоўцы мясцовай ежы і сельскай гаспадарцы. Гэтая сацсетка прывабная для рэкламадаўцаў, паколькі патэнцыйныя пакупнікі давяраюць відэаролікам такіх жа, як яны, людзей і больш ахвотна купляюць тавары, якія ў іх рэкламуюцца. Як паведаміў Лю Чжэнь, у Kuaishou ёсць карыстальнікі з Беларусі.



### АДНЫМ ШЛЯХАМ

Шматаблічнасць інфармацыйных прадуктаў Паднябеснай задавальняе не толькі ўнутраныя патрэбы 1,4-мільярднай аўдыторыі, а і мае вялікі попыт у замежных карыстальнікаў. Паводле меркавання Чжан Яньцю, у Кітаі імкнуцца развіваць і ўсяляк падтрымліваць канструктыўную журналістыку, якая вельмі запатрабаваная ў час fake news. КНР актыўна развівае інфармацыйнае супрацоўніцтва з шэрагам краін, у тым ліку і з Беларуссю. Як заўважыла карэспандэнту "Звязды" прафесар Чжан Яньцю, у гэтым плане аб'яднальнай пляцоўкай для медыя можа выступіць транснацыянальны праект "Пояс і Шлях", які развівае Кітай па ініцыятыве старшыні КНР Сі Цзіньпіня.

Кітай з'яўляецца стратэгічным партнёрам Беларусі. Супрацоўніцтва развіваецца па многіх напрамках, рэалізуюцца шэраг важных праектаў. Беларусь, па прызнанні экспертаў, стала адным з важных удзельнікаў глабальнага "Пояса і Шляху". Пры гэтым развіццё індустрыяльнага парка "Вялікі камень" у Паднябеснай узгадваюць як узорны праект плённага двухбаковага супрацоўніцтва. 31 жніўня 2015 года была падпісана ключавая Дырэктыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 5 "Аб развіцці двухбаковых адносін Рэспублікі Беларусь з Кітайскай Народнай Рэспублікай".

Зразумела, мы не маглі застацца ў баку. У верасні 2015-га ў рамках Форуму медыясупрацоўніцтва "Адзін пояс і адзін шлях", у якім бралі ўдзел 170 прадстаўнікоў СМІ з 60 краін усіх кантынентаў, "Звязда" падпісала Мемарандум аб узаемаразуменні і супрацоўніцтве з адным з вядучых у сусветнай медыяпрасторы і самым уплывовым выданнем у Кітаі — газетай "Жэньмінь жыбаа". На партале zviazda.by ў кастрычніку 2015 года быў запушчаны глабальны праект "Весткі з Кітая", кантэнт якога пераважна фарміруецца матэрыяламі ўплывовых кітайскіх выданняў і інфармагенцтваў, у першую чаргу — "Жэньмінь жыбаа". У сваю чаргу публікацыі "Звязды" актыўна выкарыстоўваліся пры фарміраванні навінавай стужкі на інтэрнэт-партале "Жэньмінь жыбаа анлайн", што дазволіла прэзентаваць сацыяльна-эканамічны і грамадска-культурны патэнцыял Беларусі на шматмільённую аўдыторыю штодзённага наведвання партала people.com.cn. У сваю чаргу, у верасні 2016 года на сайце russian.people.com.cn з'явіўся тэматычны банер "Вести из Беларуси. Звязда". Цікава, што ў музеі "Жэньмінь жыбаа" "звяздоўскаму" праекту адведзена пачэснае месца. Мы — за канстуктыўную журналістыку!

Мікалай **Літвінаў**

# СТРОГАЕ ЗАПАТРАБАВАННЕ ЧАСУ

**Моцная ўлада патрэбна для мірнага і спакойнага жыцця краіны. Аб гэтым у інтэрв'ю газеце "СБ. Беларусь сегодня" заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка**

"Нічога няма важней. Без гэтага не можа быць ні стабільнасці, ні развіцця, ні проста нармальнага чалавечага быцця. Таму мір, спакой і правапарадак у грамадстве — дзяржаўная каштоўнасць, пытанне нумар адзін для Прэзідэнта і ўсіх галін улады. Жнівеньскія падзеі мінулага года паказалі, што трэба ўзмацніць рэгулюючае ўздзеянне заканадаўства на ўсе бакі палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця грамадства, удасканаліць нашу прававую сістэму ў кантэксце знешніх і ўнутраных пагроз суверэнітэту і незалежнасці дзяржавы, — адзначыў спікер. — Была праведзена вялікая комплексная работа з улікам міжнароднага права, вынікам якой стала прыняцце на пятай сесіі парламента вялікага пакета рэзанансных заканадаўчых актаў, якія ўмацоўваюць нацыянальную бяспеку".

БЕЛТА



Уладзімір Андрэйчанка

Паводле слоў Уладзіміра Андрэйчанкі ёсць строгае запатрабаванне часу абараняць і ўмацоўваць беларускую дзяржаўнасць. "Роля права і праватворчасці ў сувязі з гэтым павышаецца. Мы будзем рэагаваць на пагрозы і выклікі суразмерна, заканадаўча забяспечваючы бяспеку краіны і грамадзян. Прымаючы законы, парламент ідзе па такім шляху, каб краіна жыла мірна і спакойна, эфектыўна працавала і паступова развівалася", — сказаў старшыня ніжняй палаты парламента.

БЕЛТА



# МЕРЫ ПАТРАБУЮЦЬ УЗГОДНЕНАСЦІ

**Падтрымку турыстычнай галіны краін СНД ва ўмовах пандэміі абмеркавалі ў Мінску**

У Выканаўчым камітэце СНД з выкарыстаннем відэа-канферэнц-сувязі прайшло пасяджэнне рабочай групы па рэагаванні на выклікі ў турыстычнай сферы пры Савеце па турызме дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Узбекістана і Выканаўчага камітэта СНД. Члены рабочай групы абмеркавалі пытанні рэалізацыі Стратэгіі развіцця супрацоўніцтва дзяржаў СНД у галіне турызму на 2021-2030 гады і ўзаемадзеяння краін Садружнасці ва ўмовах распаўсюджвання інфекцыі COVID-19.

Было адзначана, што ў дзяржавах СНД актыўна ўкараняюцца патрабаванні да абавязковага папярэдняга тэсціравання або вакцынацыі замежных грамадзян, якія прыбываюць у краіну, прадаўжаюць прымяняцца дадатковыя меры падтрымкі турыстычнай галіны, у тым ліку на аснове доўгатэрміновых прагнозаў уздзеяння пандэміі COVID-19 на развіццё турызму. З улікам эпідэміялагічнай сітуацыі праводзяцца запланаваныя турыстычныя форумы, канферэнцыі, круглыя сталы і іншыя мерапрыемствы турыстычнай накіраванасці з выкарыстаннем анлайн-фармату, а таксама змешанага характару правядзення.

Удзельнікі пасяджэння прызналі мэтазгодным арганізаваць работу па рэгулярным інфармаванні партнёраў аб патрабаваннях краіны да праходжання асобамі, якія ажыццяўляюць міжнародныя паездкі, тэсціравання на COVID-19 або вакцынацыі, а таксама выпрацоўцы агульных падыходаў да гэтых працэдур і пацвярджальных дакументаў. Яны таксама заслухалі і прынялі да ведама інфармацыю Рэспублікі Узбекістан аб прапановах па ўкараненні сістэмы санітарна-гігіенічных стандартаў у сферу турызму краін СНД і ацэнцы ўздзеяння пандэміі COVID-19 на індустрыю турызму.

Наступнае пасяджэнне рабочай групы вырашана правесці ў верасні 2021 года.

Аляксандр **Піменаў**

# ПАМЯЦЬ ПРА ВОІНАЎ У ЗЯЛЁНЫХ ФУРАЖКАХ

**У Інстытуце пагранічнай службы адбылася цырымонія гашэння спецыяльным памятным штэмпелем мастацкага маркіраванага канверта "Подзвіг пагранічнікаў у пачатку Вялікай Айчыннай вайны"**

У мерапрыемстве прынялі ўдзел старшыня Дзяржпагранкамітэта генерал-лейтэнант Анатоль Лапо і міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган. Гэтая цырымонія — чарговая ў цэлай серыі мерапрыемстваў, прымеркаваных да 80-годдзя подзвігу пагранічнікаў у пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

22 чэрвеня 1941 года пачалася Вялікая Айчынная вайна. Першымі ў няроўны бой з фашыстамі ўступілі воіны-пагранічнікі. З амаль дваццаці тысяч воінаў у зялёных фуражках, якія паўсталі на шляху фашыстаў на заходніх рубяжах СССР, у першыя дні вайны загінулі больш за 16 тысяч. Ніводная з атакаваных застаў не адышла без загаду. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў першых баях Вялікай Айчыннай вайны, 826 пагранічнікаў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. 11 абаронцаў рубяжоў былі ганараваны званнем Героя Савецкага Саюза, з іх 5 чалавек — пасмяротна.

"Мы хочам, каб усе жыхары нашай краіны памяталі аб той трагедыі, якая здарылася 22 чэрвеня 1941 года, і ведалі аб тым гераізме, які праявілі воіны ў зялёных фуражках у першых баях Вялікай Айчыннай вайны", — адзначыў у сваім выступленні старшыня Дзяржпагранкамітэта Беларусі Анатоль Лапо.




БЕЛТА

Паштовы праект, які складаецца з мастацкага маркіраванага канверта і спецыяльнага памятнага штэмпеля, падрыхтаваны Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі і рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам паштовай сувязі "Белпошта" ў цесным узаемадзеянні з Дзяржаўным пагранічным камітэтам. На канверце адлюстраваны фрагмент размешчанага ў Гродне мемарыяльнага ансамбля "Загінулым, але непераможаным воінам Беларускай пагранічнай акругі" і контур Холмскай брамы мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой". Тыраж спецыяльнай партыі, якая будзе выкарыстоўвацца для перасылкі простых пісем у межах Беларусі, склаў 25 тысяч экзэмпляраў. Канверт ужо даступны ў паштовых аддзяленнях краіны.

Віктар **Емяльянаў**

# ВАЙНА НЕ АДМЯНЯЛА ЖЫЦЦЁ...

**Фотавыстава "Лёсы, складзеныя ў трохкутнік" прайшла ў Брэсцкай крэпасці**

Гэтая фотавыстава была заснавана на аднайменным сумесным інтэрнэт-праекце Беларускага тэлеграфнага агенцтва і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Праект расказвае пра лёсы загінулых і тых, хто прайшоў усю вайну, праслаўленых і самых звычайных — праз сапраўдныя асабістыя пісьмы перыяду Вялікай Айчыннай вайны, паштовыя карткі, паштоўкі, адпраўленыя з агнявых рубяжоў родным, архіўныя фотаздымкі.



БЕЛТА

Знаёмства з экспанатамі выставы

Вайна не адмяняла жыццё. У пісьмах салдаты апісвалі цяжкасці франтавога побыту, атакі, раненні, дзяліліся радасцю перамог і надзеямі на хуткую сустрэчу. У праекце раскрываецца сіла духу народа, які мужна абараняў Радзіму ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З пісьма Героя Савецкага Саюза Барыса Коўзана родным: "Мама і тата, паведамляю, што я не падкачаў і вам не будзе сорамна за сына... У паветраных баях збіў 24 самалёты, асабіста 4 тараны і 8 у групе". Барыс Коўзан — адзіны ў свеце лётчык-знішчальнік, які ў гады вайны ажыццявіў чатыры паветраныя тараны і застаўся жывым.

Пісьмы і фотаздымкі — сведчанні падзей, што закранулі лёс кожнай беларускай сям'і. Прадстаўленыя на выставе матэрыялы даюць магчымасць адчуць той трагічны час, далучыцца да лёсаў людзей, якім кожны дзень даводзілася адстойваць права на жыццё.

Сімвалічна, што напярэдадні трагічнай для мільёнаў людзей даты — 22 чэрвеня — фотавыстава "Лёсы, складзеныя ў трохкутнік" экспанавалася ў мемарыяльным комплексе "Брэсцкая крэпасць-герой". Абаронцы крэпасці здзейснілі адзін з найвялікшых подзвігаў савецкага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенныя гады гісторыя абароны Брэсцкай крэпасці стала сімвалам гераізму і вернасці прысязе.

Уладзімір **Міхайлаў**

# ЯКАЎ ПЕЎЗНЕР — ЯПАНІСТ З "ШАНХАЙСКАЙ ПЯЦЁРКІ"

**Здараецца, што ў жыцці чалавека галоўным складнікам яго біяграфіі з'яўляецца пэўны эпізод, які займае зусім няшмат часу. А далей чалавек жыве ўспамінамі пра тое важнае здарэнне, той важны адрэзак часу, які спраектаваў яго біяграфію на ўсё астатняе жыццё. І ўжо, здаецца, нічым болей яркім і не вызначаецца яго лёс.**

У біяграфіі ўраджэнца Гомеля Якава Аляксандравіча Пеўзнера (Хацкелевіча), які нарадзіўся ў Гомелі 15 студзеня 1914 года, сапраўды, быў такі яркі эпізод, якога хапіла б і на некалькі жыццяў. Дакументальныя крыніцы пра яго сведчаць досыць лаканічна: "... У 1941 годзе быў накіраваны ў Кітай. Афіцыйна працаваў дырэктарам арганізацыі "Саўэкспартхлеб". Уваходзіў у склад "шанхайскай пяцёркі" савецкіх разведчыкаў. У канцы 1942 года арыштаваны японскай жандармерыяй. Прайшоў праз турму і катаванні. Быў абмяняны і вярнуўся ў СССР..."

Хто не ведае, патлумачым адносна "шанхайскай пяцёркі"... У Кітаі існавала разгалінаваная сетка Галоўнага разведвальнага ўпраўлення Узброеных Сіл СССР. Склалася яна не за адзін дзень. І з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны, несумненна, Савецкі Саюз асабліва цікавіла дзейнасць японскіх мілітарыстаў, якія акупіравалі кітайскія правінцыі, непасрэдна — Шанхай. Але і японцы не спалі ў шапку, як той казаў. І ў выніку цэлага шэрагу арыштаў нанеслі значныя страты савецкай ваеннай разведцы. Былі разгромлены некалькі шанхайскіх рэзідэнтур. У тым ліку — і рэзідэнтура Разведупраўлення Галоўнага штаба ВМФ, якую ўзначальваў Якаў Пеўзнер. Усяго было затрымана 17 разведчыкаў. Але толькі пяць з іх з'яўляліся грамадзянамі СССР. Пасля допытаў і жорсткіх катаванняў японскі ваенна-палявы суд прысудзіў усім смяротнае пакаранне. Але расстралялі толькі аднаго кітайца, як прадстаўніка краіны, з якой Японія знаходзілася ў стадыі вайны. Астатнім замянілі расстрэл на тэрміны зняволення ад двух да дзесяці гадоў. А 23 лютага 1945 года (сімвалічная дата — Дзень нараджэння Узброеных сіл СССР) адбыліся перамовы паміж СССР і Японіяй, у выніку якіх 7 сакавіка прайшоў абмен савецкіх разведчыкаў на пяць японскіх грамадзян, арыштаваных у Савецкім Саюзе.

Вярнуўшыся ў Маскву, Якаў Пеўзнер пайшоў працаваць у Інстытут сусветнай гаспадаркі і сусветнай палітыкі. Варта ўзгадаць, што яшчэ да вайны Якаў Пеўзнер паступіў вучыцца ў Інстытут філасофіі, літаратуры і гісторыі. Пасля першага семеста перайшоў на японскі факультэт Маскоўскага інстытута ўсходазнаўства. Закончыў гэты інстытут, пасля закончыў аспірантуру Інстытута сусветнай гаспадаркі і сусветнай палітыкі. Пасля абароны дысертацыі нашаму земляку было прысуджана званне кандыдата эканамічных навук. Дарэчы, вучоную ступень малады чалавек атрымаў у самы пярэдадзень Вялікай Айчыннай — 11 чэрвеня 1941 года... У 1947 годзе інстытут быў зліквідаваны. Частка яго супрацоўнікаў (у тым ліку і Якаў Аляксандравіч) была пераведзена ў аддзел капіталістычных краін Інстытута эканомікі АН СССР.




З 1956 года наш зямляк працаваў у Інстытуце міжнароднай эканомікі і міжнародных адносін, дзе кіраваў японазнаўчымі даследаваннямі. Абараніў у 1961 годзе доктарскую дысертацыю, атрымаў званне прафесара. Быў кіраўніком групы па вывучэнні Японіі, кіраўніком аддзела эканомікі Заходняй Еўропы і Японіі, а пасля і ўзначаліў аддзел Японіі. У 1977 годзе Якаў Пеўзнер ўганараваны званнем лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР. Быў узнагароджа-

ны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Навуковую руплівасць былога разведчыка заўважылі і ў Японіі — адзначылі ордэнам "Святога скарба" III ступені (адбылося гэта ў 1994 годзе). Да канца свайго жыцця (памёр Якаў Аляксандравіч у 2003 годзе) вучоны займаў пасаду галоўнага навуковага супрацоўніка Інстытута міжнароднай эканомікі і міжнародных адносін, працаваў у Цэнтры Азіяцка-ціхаакіянскіх даследванняў гэтага інстытута. У 1990-я гады займаўся пытаннямі тэорыі сацыял-дэмакратыі і крытыкі камунізма і артадаксальнага марксізма. І сёння Якаў Пеўзнер у навуковым свеце застаецца адным з найгалоўнейшых расійскіх японазнаўцаў. Менавіта наш зямляк стварыў школу японазнаўцаў, якія аспрэчылі класавы падыход і сцвердзілі строгую навуковую аб'ектыўнасць галоўным крытэрыем ацэнкі творчых, навуковых памкненняў. Вучэбныя дапаможнікі, манаграфіі Я. Пеўзнера застаюцца настольнымі кнігамі для новых пакаленнячў даследчыкаў Японіі. Дарэчы, вайсковая біяграфія зрабіла Я. Пеўзнера на доўгія дзесяцігоддзі "нявыязным". І толькі ў 1984 годзе Якаў Аляксандравіч наведаў Японію.

Доктар эканамічных навук Якаў Пеўзнер — аўтар кніг "Манапалістычны капітал у Японіі ("дзайбацу") у гады другой сусветнай вайны і пасля вайны" (1950), "Эканоміка Японіі пасля другой сусветнай вайны" (1955), "Дзяржава ў эканоміцы Японіі" (1976), "Дзяржаўна-манапалістычны капіталізм і тэорыя працоўнага кошту" (1978), "Крах камунізма і сучасныя грамадскія адносіны" (1999), "Уводзіны ў эканамічную тэорыю сацыял-дэмакратыі" (2001)...

Вялікае жыццё пражыў савецкі разведчык і савецкі, расійскі эканаміст. Прайшоў праз усе выпрабаванні XX стагоддзя. За смугою гадоў, хаця і памёр Якаў Пеўзнер параўнальна нядаўна, шмат што з яго біяграфіі і не разгледзіш. Але і тое, што засталося ў памяці нашчадкаў, сведчыць пра вартасці яго лёсу, пра выключную працаздольнасць і мужнасць гэтага чалавека. Дык чаму б яго імя не ўвасобіць у назве вуліцы ў родным для Якава Аляксандравіча Пеўзнера Гомелі?..

Алесь **Карлюкевіч**




# ТЫЯ НЕЗАБЫЎНЫЯ ДНІ...

**Валянціна Пятроўна Баранава не тоячыся гатовая расказваць і пра сваё ваеннае каханне, і пра рэпрэсіраванага бацьку, і пра свой дружны клас, які прыйшоў у ваенкамат у чэрвені 1941-га. Але не толькі пра гэта. Для яе вельмі важна данесці да сённяшніх пакаленняў асалоду мірнага жыцця. А яна атрымлівае яе спаўна. І кулінарыць, і на трэнажорах рэгулярна займаецца, і ў цырульню ходзіць, і нават клумбу пад акном высаджвае.**

Ветэрана Валянціну Баранаву ў Гродне ведаюць добра. Яна — чаканы і любімы госць на розных сустрэчах, мерапрыемствах і святах. Яе імя ўнесена ў Кнігу славы Гродзенскай вобласці. Але не толькі заслугі выклікаюць вялікую павагу да гэтай жанчыны. Яна яшчэ і вельмі светлы, пазітыўны чалавек. Наўрад ці памылюся, калі выкажу такую думку: той, каму давялося хоць раз у жыцці пабачыцца з Валянцінай Пятроўнай, наўрад ці забудзе гэтую сустрэчу.

Дзякуючы журналісцкай прафесіі мне неаднаразова выпадала магчымасць узяць у яе інтэрв'ю, а дакладней, пагаварыць пра жыццё. Здаецца, што ўжо няма ў яе лёсе ніякіх таямніц. Але ўсё роўна з'яўляецца чарговая нечаканасць. Вось і на гэты раз. Раней Валянціна Пятроўна ніколі не згадвала пра сустрэчу з Канстанцінам Сіманавым. А яна была, хоць і мімалётная. У пераможным 1945 годзе...

Наша чарговая сустрэча адбылася... у двары. Менавіта з нагоды 76-й гадавіны Перамогі двор Валянціны Баранавай уяўляў сабой святочную пляцоўку. Сцяжкі, шары, натоўпы школьнікаў і ваенны аркестр, букеты і падарункі ад абласных і гарадскіх улад. Як сказала сама жанчына, такога яе двор яшчэ ніколі не бачыў.

Яна прыгадала, што пры засяленні ў 1957 годзе ў кожнай кватэры былі ветэраны. Цяпер іх толькі двое. За гэты час вырасла не адно пакаленне, а Валянціна Пятроўна па-ранейшаму

БЕЛТА



Валянціна Баранава ў маладосці

"трымае марку" і жадае толькі аднаго — каб на зямлі быў мір. "Пакуль будзе мір на зямлі, будзе і жыццё", — упэўнена яна. Без перабольшвання, гэты дэвіз яна стараецца данесці да кожнага. А як не верыць ветэрану? Па-мойму, гэта самыя сумленныя людзі. Валянціна Пятроўна пагаджаецца:

— На фронце больш такіх — сумленных, каму можна давяраць, можна спадзявацца. Ведаеш: яны не кінуць у цяжкую хвіліну. Мне ўспамінаецца шмат добрага, як мы тады дружна жылі. А тыя жахі, бамбёжкі, смерць мы выкрэслілі са свайго жыцця, бо з гэтым жыць вельмі цяжка. Таму аб гэтым не хацелі ўспамінаць.

Мы сядзім на двары Валянціны Пятроўны ў майскі перадсвяточны дзень і зноў "гартаем" старонкі яе жыцця. Яны паўстаюць, нібыта кадры з фільма. Магчыма, так калі-небудзь і здарыцца. Напішуць сцэнарый, запросяць рэжысёра і артыстаў... "Так, сапраўды, сенсацый дастаткова", — усміхаецца маім фантазіям жанчына.

А хіба не цікавы лёс? Ісці "па блату" на вайну! Толькі адно гэта выклікае здзіўленне. Між тым Валянціна Пятроўна была дачкой "ворага народа", яе бацьку расстралялі ў 1937-м. Таму і на фронт напачатку браць не хацелі. Яна пісала заявы адну за другой, але атрымлівала адмову. І тады звярнулася да сваёй сяброўкі, якая працавала ў абкаме камсамола. Нарэшце яе адправілі добраахвотніцай на фронт.

— Мы былі патрыётамі сваёй краіны. Ужо на трэці дзень вайны ўсім класам — 24 чалавекі! — прыйшлі ў ваенкамат, — расказвае ветэран. — Да нас тады выйшаў мужчына і сказаў дзяўчатам, што на вайне без іх абыдуцца, а хлопцам загадаў чакаць павесткі.

Чакаць прыйшлося год. Гэта быў 10-ы клас, усім па сямнаццаць. 21 чэрвеня 1941 года прайшоў выпускны, а назаўтра прачнуліся — вайна! Горад Абакан, што ў Хакасіі, дзе ў той час жыла сям'я Валянціны Пятроўны, апусцеў літаральна за некалькі дзён. А праз пару месяцаў пачалі прыходзіць эшалоны з параненымі. Новую школу пераўтварылі ў шпіталь.

Валя ўладкавалася на работу ў аздараўленчы лагер, была там і выхавальніцай, і піянерважатай, і музыкай, і прыбіральшчыцай... А вечарамі дапамагала ў шпіталі, нават выступала там з песнямі. З дзяцінства была вельмі музыкальнай, марыла пра балет і кар'еру артысткі. Але замест гэтага пайшла на фронт сувязісткай. Між тым артыстычны талент спатрэбіўся і на вайне: падчас навучання яна была запявалай роты.

— Пакуль ішлі да сталовай, адной песні якраз хапала. У мяне ў рэпертуары меліся розныя. Калі на фронце было складана, спявалі "Вставай, страна огромная", калі без перамен — "Махорачку", — успамінае Валянціна Пятроўна.

Яна трапіла ў жаночую роту 63-га асобнага батальёна сувязі. Асноўная нагрузка была на марзістак (тэлеграфістак, якія працавалі на апараце Морзэ. — **Аўт**.). Звесткі, што перадаваліся ў часці, былі вельмі сакрэтныя, ішлі цяжкія баі. Як аказалася, інфармацыя мела каласальнае значэнне. А работа марзісткі ацэньвалася як подзвіг. Якраз адзін такі важны выхад у эфір скончыўся для маладой дзяўчыны... ордэнам Чырвонай Зоркі.

"Гэта было ва Украіне. Я была начальніцай змены на ваенна-тэлеграфнай станцыі. Раптам адчыняюцца дзверы і заходзіць цэлы натоўп на чале з генералам. А заходзіць у пакой наогул ніхто не меў права. Тым часам генерал патрабуе даць патрэбны напрамак. У дзяўчыны, якая працавала з гэтай дывізіяй, ад страху перастала слухацца рука. Ён як закрычыць на ўвесь пакой: "Дайце мне сапраўднага тэлефаніста! І наш камандзір узвода паказвае мне — ідзі! Я ўзяла ключ, зрабіла выклік, рука слухаецца, паварочваюся да генерала і кажу: "Гаварыце". І ён 20 хвілін размаўляў, і шыфроўкамі, і адкрытым тэкстам. І калі яму сказала, што яго перадачу прынялі, ён выцер з ілба пот, узяў маю руку і пацалаваў. Сказаў на ўвесь пакой: "Прадставіць да ўзнагароды! Відаць, вельмі важная была інфармацыя, якраз ішло наступленне, 1944 год", — перадае падзеі той пары Валянціна Баранава.

Было нямала небяспечных сітуацый, асабліва падчас наступлення. Адна з такіх адбылася на Сандамірскім плацдарме ў Польшчы, дзе прыйшлося амаль паўгода стаяць у абароне. А калі пачалося наступленне, машыны, у якіх ехалі сувязісты, перакуліліся з гары. Потым пяцёра дзяўчат цягнулі скрыні з цяжкай апаратурай, трэба было спяшыць, бо фронт ішоў далей.

— Гэта быў 1945 год. Мы ўжо ехалі па нямецкай тэрыторыі, калі ўбачылі, што па насыпе падымаецца цэлы ланцуг немцаў, а мы едзем у "палутараўцы". З намі некалькі аўтаматчыкаў. Яны ўжо былі гатовыя ўступіць у няроўны бой, і тут я бачу: у аднаго немца белая павязка ў руцэ, у іншага — на рукаве. Гэта значыць, яны здаюцца. Тады мы праехалі за некалькі метраў, а калі б нашы адкрылі агонь, яны б нас размялі, — не сумняваецца Валянціна Баранава.

Шасцёра яе сяброўак загінулі за два месяцы да заканчэння вайны. Цягнулі тэлефонную лінію па ўсходняй Германіі,

і каля дома лесніка з гарышчы па іх ударыла аўтаматная чарга. Выжыў толькі ваенны тэхнік, але і яго праз колькі часу накрыла бомба ў бліндажы. Ва ўмовах бамбёжкі сувязісты працавалі бесперапынна. А вось калі наступалі свае, ужо было не так страшна. Валянціна Пятроўна згадвае, якая магутная пачалася артылерыйская атака перад уступленнем у Берлін. Тады яе нават паклікалі на назіральны пункт, і яна бачыла, як падчас атакі з траншэй выскокваюць немцы. А пад горкай наступалі савецкія часці...

Пакуль мы размаўлялі, дачка ветэрана Наталля прынесла маці шалік. "Раскажы, як ты з Сіманавым танцавала", — папрасіла яна. Сапраўды, было ў Валянціны Пятроўны такое спатканне, хоць і кароткае. З аўтарам вядомага верша "Жди меня, и я вернусь" яна пазнаёмілася падчас вечарыны ў Берліне, калі быў падпісаны Акт аб капітуляцыі. Яе і яшчэ некаторых дзяўчат-сувязістак папрасілі дапамагчы арганізаваць стол. А калі пачаліся танцы, яе на тур вальса запрасіў Канстанцін Сіманаў. Многія дзяўчаты ёй зайздросцілі.

З мужам Мікалаем Баранавым яна пазнаёмілася падчас вучобы ў інстытуце ў Волагдзе. Калі яго накіравалі на работу ў Гродна, яны пераехалі сюды. Разам уладкавацца ў сельгасінстытут не ўдалося, і Валянціна Пятроўна з трыма дзецьмі ў 32 гады асвоіла новую прафесію — музычнага работніка. Гэта была яе мара — ісці па жыцці з песняй. Так і адбылося. Яна ўпэўнена, што з песняй можна вытрымаць многія нягоды.

...Валянціна Пятроўна спяшалася: за ёй павінна была прыехаць машына і адвезці на чарговую сустрэчу з моладдзю, а праз некалькі гадзін ужо чакалі ў гуманітарным каледжы, дзе яна вучылася. Пры развітанні ўсё ж забегла ў кватэру (менавіта забегла) і прынесла некалькі ватрушак уласнай выпечкі. "Цяпер яе вельмі шчыльны графік, — паведаміла дачка Наталля. — Усе дні занятыя, вельмі многа сустрэч".

А я глядзела і здзіўлялася. Неверагодна, але і ў свае 97 гадоў, якія жанчына не ўтойвае, яна застаецца спрытнай, мініяцюрнай і, сказала б, моднай. З прычоскай, на тонкіх абцасах, з вясёлым і адкрытым характарам — чым не прыклад жаноцкасці і пазітыўнага стаўлення да жыцця? Потым, ідучы па горадзе, успамінала мудрыя словы Валянціны Пятроўны: "Я па жыцці аптыміст. А каб доўга жыць — варта ім быць, бо доўга жывуць толькі аптымісты, хоць гэта і патрабуе пэўных намаганняў. А яшчэ ў нас у сям'і не прынята нікога абмяркоўваць, асуджаць. Лепш пажадаць дабра — і сабе, і іншым".

Пакідаючы двор, Наталля засяродзіла маю ўвагу на акуратнай клумбе пад домам, якая засаджана кветкамі: "Маміна работа. Мы разам усё апрацавалі, яна ўзрыхляе, выбірае, якія кветкі пасадзіць, вельмі любіць цюльпаны, іх тут большасць, вось-вось зацвітуць..."

На жаль, ветэранаў становіцца ўсё менш. Вось чаму сустрэчы з імі — на вагу золата. Толькі гледзячы на жывых сведкаў тых падзей, разумееш сапраўдную цану сённяшняга дня.

Маргарыта **Ушкевіч**


БЕЛТА

Валянціна Пятроўна па жыцці аптыміст

# ДЗМІТРЫЙ КУЗЬМІН: "ДЗЯКУЙ ДЗЕДУ ЗА ЎСЁ!"

**Пра Аляксандра Кузьміна, штурмана звяна бамбардзіроўшчыкаў авіяпалка на Паўднёвым і Закаўказкім франтах у час Вялікай Айчыннай вайны, кавалера ордэнаў Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны I ступені, сакратара ЦК кампартыі Беларусі па ідэалогіі (1971-1986) успамінае яго ўнук Дзмітрый Кузьмін. Шчырая гаворка і пра тое, якім бачыў унук Аляксандра Трыфанавіча зблізку, як жыла яго сям'я і як паўплываў на лёс Дзмітрыя прыклад самога дзеда-афіцэра.**

* Колькі сябе памятаю, як стаў я хадзіць і бегаць, так і пачалі мяне падкідваць то аднаму дзеду, то другому... Але жыў я ў Мінску пастаянна ў дзеда Аляксандра Трыфанавіча ды бабулі Таісіі Андрэеўны на Браняявым завулку, дом 4, кватэра 1. У мяне, дарэчы, быў там асабісты ўваход у дом: наўпрост з балкона першага паверха. І мне тое вельмі падабалася. Дзед ад'язджаў на працу рана і вяртаўся позна. Але стараўся паспець, каб уключыць тэлевізар і глядзець праграмы навін — «Время» ў першую чаргу. І вячэраў ён разам з намі. У выхадныя дні мы ездзілі то на Нарач, то кудысьці пад Лагойск — на рыбалку ды па грыбы ці ягады. Быў дзед заўзяты рыбак і грыбнік. Здараліся і паляванні — але то былі, можна сказаць, своеасаблівыя палітычныя мерапрыемствы. Я тых выхадных заўсёды чакаў, бо ведаў: калі ніякія справы не адцягнуць дзеда, то мы куды-небудзь паедзем. А гэта заўсёды было для мяне прыгодай. Бабулі, як правіла, часу не хапала на выезды. Калі ж выбіралася, то побач з кіроўцам сядзела. А мы з дзедам на заднім сядзенні. Дочкам іхнім гэта было не вельмі цікава, ды і не жылі яны з намі.

* З дзедам было класна. Ён са мной шмат размаўляў. Распавядаў розныя выпадкі з вайны. І гэта, напэўна, у канчатковым выніку паўплывала на тое, што я пайшоў і далей па шляху сваіх дзядоў: у 83-м у Сувораўскае, потым і ў Ваеннае вучылішча. Праўда, пагадзіўся не адразу на Сувораўскае. То было нялёгка... Уявіце сабе: пацан, галоўны ў Драздах правадыр чырванаскурых, мяне так называла Наталля Машэрава, і тут яго р-раз — і за плот, у казарму. Вельмі мне таго не хацелася. Але дзед сказаў, ударяючы кулаком па стале: «Пойдзеш!» Аўтарытэт у доме ў яго быў бясспрэчны. Я нават не плакаў, бо ведаў, што гэта будуць дарма пралітыя слёзы. Калі дзед сказаў — так і будзе. Але ён не проста камандаваў — ён граматна падводзіў пад свае рашэнні нармальную доказную базу. За тыдзень тэзісы закіне — каб "праварылася" патрэбная інфармацыя. Потым выведвальны допыт правядзе: як ідзе працэс яе засваення. І потым ужо апошні бомбавы ўдар, кажучы мовай ваенных лётчыкаў, нанясе, калі трэба.



*Аляксандр Кузьмін быў штурманам звяна бамбардзіроўшчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Пачаўшы з 1942-га "радавым партыі", даслужыўся да "генерала": на пачатку 1971-га быў абраны сакратаром ЦК КП Беларусі па ідэалогіі. Амаль 30 гадоў напружанай працы спатрэбілася ўраджэнцу вёскі Даброціна (цяпер Кіраўскі раён, Магілёўшчына), каб заняць месца штурмана ў высокай партыйнай структуры.*

*Ён заставаўся сакратаром ЦК 15 гадоў. І толькі ў 1986-м, пасля прынцыповых разыходжанняў з тагачасным рэспубліканскім парткіраўніцтвам вышэйшага рангу па "пытаннях" Чарнобыльскай трагедыі, Аляксандр Кузьмін падаў у адстаўку... Ён пражыў яркае жыццё, гэты неардынарны чалавек, з якім некалькі вечароў запар мы мелі зносіны напярэдадні 2001 года. І пасля яго смерці да 60-годдзя вызвалення Беларусі ў двух нумарах часопіса апублікавалі прыжыццёвае з ім інтэрв'ю («Беларусь», №2, 3-2004). Да таго ж тэкст «Александр Кузьмин: "...Я один из тех, которых не стало!"» быў змешчаны і ў газеце "Советская Белоруссия" (13.09.2003), ён жа ёсць у інтэрнэце.*

* У яго нават і свая зброя з вайны выпадкова засталася: пісталет ТТ. Калі дзеда кідалі па шпіталях, то ў яго лётчыцкім планшэце, паміж картамі, пісталет і ляжаў. Дзед расказваў, што ніхто ў ваенны час на тое ўвагі не звяртаў. Форму з планшэтам узялі, пераклалі ды адправілі разам з параненым афіцэрам Кузьміным у іншы шпіталь. Так з ім пісталет і прыбыў з вайны. Ляжаў ён у сейфе ў будынку ЦК. Ціхенька, як дзед меркаваў. А я адзін раз-такі патрымаў яго ў руках. Там жа, у ЦК, на пачатку 80-х. Быў тады ў класе пятым-шостым. Часам так атрымлівалася, што забягаў я ў будынак на Карла Маркса, 38 да дзеда ў кабінет. А ў той раз ён кудысьці хутка сышоў. Сейф і я засталіся сам-насам, а ў замку ключ... Ведаючы, што там ёсць нешта цікавае, зазірнуў. За што, вядома, потым па шыі атрымаў. Такая гісторыя была... А калі ў дзеда са Слюньковым (Мікалай Слюньковоў — беларускі савецкі партыйны



Аляксандр Кузьмін
у святочныя дні




Лейтэнантскія пагоны Аляксандра Кузьміна, штурманская лінейка ды іншыя рэліквіі зберагаюцца Дзмітрыем як памяць пра дзеда

дзеяч. — **Аўт.**) спрэчкі з-за Чарнобыльскай аварыі пачаліся, ён сказаў: «Да пабачэння, хлопцы, нам далей не па дарозе». І сышоў з ЦК. Ён думаў, што ў апошні працоўны дзень як прыйдзе, то забярэ адтуль свае рэчы. Прыйшоў, а сейфы ўжо стаялі ўскрытыя. Пытанне пра баявую зброю не было каму задаваць у такой сітуацыі.

* Ці падабалася мне, што пайшоў па вайсковай частцы? Спадабалася ў 2007-м, калі пайшоў нарэшце на дэмбель. Да Сувораўскага з 5-га класа я вучыўся ў Мастацкай школе-інтэрнаце імя Ахрэмчыка, планаваў ісці ў Тэатральна-мастацкі інстытут, на скульптара. З цацкамі дзіцячымі тады было цяжкавата, вы ж памятаеце. А вось унукі вядомага палітычнага дзеяча Фёдара Сурганава, Сашка з Воўкам, такія цацкі мелі. Машынкі, індзейцы рознакаляровыя гумовыя… Ім родзічы такое рэгулярна падкуплялі. І веласіпеды, дарэчы, у іх былі, у Воўкі нават гоначны. Менавіта гэты веласіпед неяк у сябра, што катаўся на ім ў Драздах, міліцыя забрала ды ў збройным пакоі замкнула. Ну а я пайшоў Воўку выручаць: прабраўся ў штаб, падабраў ключ да пакоя — і адкрыў яго. Сірэна вые, а я хоп той велік ды ходу... А мне веласіпеды ў маім жыцці бацькі куплялі ажно два разы: гады ў 4 і ў 8. А потым сам што з лома збіраў, што выменьваў. Так і з індзейцамі-салдацікамі: нешта вымяняў, штосьці дзед прывёз — але гэта ж асобныя светлыя моманты, а сістэмы папаўнення арсенала дзіцячых цацак не было. Дарэчы, я нядаўна на магілу Сашкінаму бацьку зрабіў партрэт надмагільны: ён таксама быў кадравы афіцэр, з кадзетаў. У нашай камандзе ў Драздах — там, дзе ўрадавыя дачы — быў яшчэ старэйшы за мяне Андрэй Прытыцкі, унук вядомага грамадскага дзеяча Сяргея Прытыцкага. Неяк мы задумалі ваенныя баталіі, баі праводзіць — але нам было малавата цацак, якія мы з самаробных "пнеўмавінтовак" — з веланасосаў зробленых — расстрэльвалі. Прычым у некаторыя моманты бітвы нават бензін на поле бою падлівалі, масты палілі — фантазія працавала, было цікава. Нават лес там чуць не пачаў гарэць. Далі нам тады па шапках. Я, вы ўжо зразумелі, не падарунак быў і ахове на дачах клопатаў падкідваў, але ж без злых намераў. Міліцыянеры былі розныя, з большасцю з іх я сябраваў. І ў мясцовы буфет для іх бегаў то па курыва, то па ежу. Мы ў сажалку донкі разам ставілі па начах. Лёня Драбеня тады ж навучыў мяне нажы кідаць, а з іншымі караблікі з кары рабілі. А былі і



Дзед і унук. Моманты шчасця.

такія, хто ненавідзеў усіх дачных насельнікаў. Такі мог і пад дых урэзаць: яны ведалі, што дзеду я не паскарджуся. А Драбеня неяк пра тое даведаўся і з такім калегам сам разабраўся. Мы і пасля з ім падтрымлівалі адносіны ў 90-х. Ён, як і я пазней, служыў у адным

рукі, а я, калі ішлі праз рэквізітарскі пакой, "згубіўся". І ўцёк адтуль, вырашыўшы, што лета трэба правесці на дачы, а не на здымачнай пляцоўцы.

* *Адчування выбранасці нейкай, прыналежнасці да асаблівай касты людзей у мяне ніколі не было. Тым

* Што мой дзед — герой, я ведаў з самага ранняга дзяцінства: бачыў ягоныя ордэны і медалі. З узростам пачаў разумець, чаго кожная ўзнагарода вартая. І дзед, як я ўжо казаў, распавядаў мне пра вайну. Помніцца, напрыклад, яго апавяданні пра баявыя па-



Дзмітрый з маці і вынікам сваёй дзіцячай творчасці — салдацікамі



Ката Буню Дзмітрый знайшоў напаўжывым кацянём на Нарачы ў свой дзень нараджэння 6 ліпеня

са спецпадраздзяленняў Беларусі.

* Дразды зусім побач з Мінскам, амаль у горадзе. Па праспекце Пераможцаў (тады Машэрава) калі едзеш — там старыя могілкі, новы корпус Акадэміі фізкультуры, храм новы справа — і туды ж паварот. Метраў 700 — і ўпіраешся ў плот. У будучую рэзідэнцыю Прэзідэнта я ў той час рэгулярна заходзіў: то з дзедам, то да Каці з Ленай, унучак Пятра Машэрава. Мы з Воўкам Сурганавым прымудрыліся ў сажалцы Машэрава нават асятра падчапіць-вывудзіць. І як мы тады беглі! Спрыту надавала, што гнаўся за намі дзядзька-міліцыянер. Хоць і не дагнаў, але ж без наступстваў не абышлося.

* Лета, дача для мяне былі ўсім. Я нават лёс, які ў будучыні мог быць звязаны з кінематографам, прамяняў на дачу, на сяброў з салдацікамі. Так-так. Мяне адабралі і зацвердзілі на ролю Бураціна. І здымкі павінны былі пачацца менавіта летам. Добра памятаю, як мама адвезла мяне на кінастудыю "Беларусьфільм, здала некаму ў

больш у дзяцінстве. Дзеці жывуць у сваім свеце, у сваёй сям'і, для іх гэта норма. Ім няма з чым асабістае жыццё параўноўваць. Таму і я заўсёды лічыў: у кожнага чалавека павінна быць дача — калі не ў Драздах, то ў іншай мясцовасці... Хоць не скажу, што жыццё нашае было нейкае асаблівае. Так, былі сталы заказаў, і мы туды ездзілі. І нам смятану там налівалі. Дык і ў крамах гэтак жа налівалі. Я больш памятаю тыя заказы ў сувязі з тым, што маці дзеда жыла ў Бабруйску, з яго айчымам. І раз у месяц на выхадныя дні — гэта было правіла — мы туды стартавалі. Як яны жылі там — я бачыў. Але параўноўваць і аналізаваць стаў пазней, калі пасталеў. А сваю бабруйскую прабабулю Ліду я добра памятаю. Яна 98 гадоў пражыла. Гены ў Кузьміных нядрэнныя. Да прыкладу, у Валянціны Аляксандраўны Кузьміной, маёй мамы, здароўе моцнае. Яна з 45-га родам, і цяпер бадзёрая. Была ў мяне і цётка родная, сястра маміна, маладзейшая, была і сястра ў іх стрыечная — ды іх ужо з намі няма.

лёты ў густым тумане ў раёне Казбека: як самалёты вінтамі хрыбты чаплялі. У яго быў медаль "За абарону Каўказа". Лётчыкі ж інтуітыўна падымаліся вышэй, каб не зачапіць вяршыні гор. Дзед расказваў, як падаў там неаднаразова — самалёты збівалі. Мне было зразумела — няпросты ў дзеда быў жыццёвы шлях. Але ў дзяцінстве яно ўсё, вядома ж, па-іншаму ўспрымалася. Усведамляць пачынаеш потым. Дзед у 37-м сам пайшоў у лётнае вучылішча. І да пачатку вайны якраз падаспеў. Дарэчы, я ў сне часам таксама лётаю за штурвалам.

* Дзед мяне заўсёды браў на парады. Усе яны праходзілі тады на Кастрычніцкай плошчы, былі пад маім кантролем (усміхаецца). На трыбуну з дзедам не хадзіў, мне вызначалі месца дзе стаяць. Казалі: вось тут стаіш і глядзіш. Я ведаў: крок управа ці крок улева будзе мець наступствы. І стаяў. Здаралася, тата, калі яшчэ з намі жыў, неяк раз насіў мяне на парад на плячах. А ў асноўным — з дзедам ішлі. Дарэчы, і рыбалкі, і грыбы, паездкі да

месцаў і назад па гадзіне-дзве ў машыне, на рыбалцы ў лодцы — усё размаўлялі. У асноўным ён мне расказваў нешта. І я, напэўна, быў самым удзячным слухачом яго гісторый, меркаванняў пра што-небудзь. Да таго ж дзед сам чытаў шмат усялякай літаратуры, рэлігійнай у тым ліку. Бо па абавязку службы кіраўнікі такога рангу ў савецкі час былі «прымацаваныя» да храмаў. І дзед быў адказным па адным храме, здаецца, у сяле Краснае за Радашковічамі: там ёсць царква Покрыва Прасвятой Багародзіцы. Калі мы ехалі на Нарач, дзед рэгулярна туды заварочваў. Гутарыў, бывала, гадзіну ці больш з бацюшкам.

* Службовая машына ў дзеда была, і ў выхадныя ён, калі некуды збіраўся, то загадзя казаў кіроўцам, каб вырашалі: хто зможа паехаць. І яны ўжо самі вызначаліся. Часам ездзілі з яго братам Валодзем: ён — былы аўтагоннік і заўсёды быў "на колах". Нават цяпер ездзіць на лецішча ў Бярэзінскі запаведнік, а яму 89 гадоў. Адзін кіроўца — па прозвішчы Рыбакоў, ён у выніку нашых паездак нагледзеў і купіў сабе ў Бярэзінскім дом. Таксама быў рыбак добры. І яны кааперавaліся. «Паедзеш? — Паеду». І браў нас з дзедам. А другі кіроўца быў дзядзька Міша Мельнікаў, наш сваяк, таксама грыбнік.

* Аляксандр Трыфанавіч таксама вадзіць умеў. У нейкі перыяд жыцця ў яго была свая «Победа». Але калі з'явілася службовая машына, то ён доўга за рулём не быў. Казаў: увесь час патрэбна практыка кіравання, і за руль не лез. Па лесе мог паездзіць — так, здаралася: калі ён сам ведаў дарогу. Тады перасаджваўся на месца кіроўцы і руліў — каб рукамі не махаць, не паказваць, куды ехаць. У 86-м звольніўся, пайшоў з ЦК. Але яшчэ заставаўся членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета да 1989 года. І таму яго з першых Драздоў выселілі, далі домік у другіх Драздах — і там лецішча наша было. Стала ясна, што і з ім прыйдзецца развітацца, пачалі думаць пра свой дом. Разам з Ігарам Лучанком, а мы сябравалі, у Ждановічах вырашылі будавацца. Ды гэта ён і знайшоў тыя ўчасткі. Якраз тады, у 89-м, я звольніўся: ішло скарачэнне Узброеных сіл. Куды размеркавалі ў канцы 88-га, не атрымалася мне патрапіць, і я вырашыў звольніцца. Вучыўся ў Мінскім агульнавайсковым палітычным вучылішчы імя Варшаўскага дагавора. Гэта было вучылішча сухапутных войск. Там замежнікаў шмат вучылася: кубінцы, немцы, афганцы, курсанты з краін Каба-Вэрдэ, Бераг Слановай Косці (цяпер Кот-д'Івуар), Гвінея-Бісау... Была ў нас падрыхтоўка сур'ёзная, усе афіцэры-выкладчыкі — з баявым досведам: хто з Афгана, хто не мог сказаць, дзе служыў. Вучылі добра...

* Рашэнне аб звальненні з Узброеных сіл было няпростае, мы з дзедам яго старанна прадумвалі. Былі варыянты з'ехаць служыць па Саюзе, але з некаторых месцаў можна было і не вярнуцца. Ці мала куды пашлюць. Да таго ж развал Саюза пачынаўся, дзед сітуацыю прадчуваў... Наогул той перыяд гісторыі быў вельмі цікавы.

* Дзед быў сапраўдны афіцэр. І ў яго, як у афіцэра, было непарушнае паняцце афіцэрскага гонару, годнасці. Ён гэта не выяўляў, не паказваў спецыяльна, але ва ўсіх ягоных учынках тое можна было заўважыць. І, як цяпер кажуць, халявы ён не любіў. Памятаю, нейкім чынам дзед, я, бабуля і маці мая з сястрой (маёй цёткай) апынуліся ў цікавай сітуацыі. У нейкі раён дзеда разам з намі паклікаў мясцовы начальнік: маўляў, прыязджайце па грыбы! У выхадныя паехалі. Дзед, памятаю, быў не пры гальштуку, і ў ботах — бо ў грыбы ж паклікалі, відавочна не дзелавая сустрэча. Прыехалі. А там ужо такі прыём-прыём! Начальнік яму: «Аляксандр Трыфанавіч! Хочаце — мы вам паляванне зладзім, хочаце — рыбалку, што хочаце!» Я дзеда штурхаю: на паляванне, дзеда, на паляванне давай! А мы толькі прыехалі. Дзед паглядзеў на тое ўсё: нейкі будынак, накрыта мноства сталоў, людзі запрошаныя (так званае вузкае кола абмежаваных асобаў). Дык вось дзед паглядзеў тады на сітуацыю і кажа: «Усё! У машыну і паехалі!». Ён усіх загнаў у машыну, нешта начальніку сказаў — той у разгубленасці. Дзед: "Прабачце, нам трэба ехаць". І з'ехалі. Дзед зразумеў: запрашэнне задумалі не проста так.

* Я заўсёды і ставіўся да дзеда як да афіцэра. Таму што былых афіцэраў не бывае. І з Машэравым яны сышліся. А ведаеце чаму? Бо Пётр Міронавіч шчыра дбаў за Беларусь — і дзед мой шчыра. Вось таму яны і былі разам. Я памятаю той жах, калі падлеткам чуў грэблівае: "Ты што, камуніст?" Пацаны, падлеткі такое казалі. І быць камуністам у іх вачах было ўжо дрэнна… А я не ведаў, што гэта кепска. Бо я ведаў сапраўднага камуніста Аляксандра Кузьміна, ведаў Машэрава, Прытыцкага… Так, людзі ж бачылі з боку, што ў партыі былі і прыстасаванцы, і кар'ерысты,



Аляксандр Кузьмін (справа) разам з жонкай Таей.
Побач сябар, член экіпажа з жонкай. Франтавы здымак.




Падчас прыезда ў Мінск Фідэля Кастра 5 ліпеня 1972 года. У цэнтры — Пётр Машэраў, першы сакратар ЦК КПБ. Аляксандр Кузьмін — уверсе злева.

якія выкарыстоўвалі партрэсурс для сваіх мэтаў: каб заняць нармальныя пасады. І палівалі брудам тых, хто не даваў ім ходу, не даваў разгарнуцца ў поўную сілу... Дзеда ж і ў Маскву клікалі. А калі ён на з'ездах павыступаў з дакладамі — па гадзіне! без папер! — дык ад ганцоў з спакою не было. Але дзед адмовіўся. Ён Беларусі не здраджваў.

* Добра памятаю дружбу Аляксандра Кузьміна з Пятром Машэравым. Гэта ж яны ўдвух уздымалі санаторый «Сосны» на возеры Нарач: яны з Пятром Міронавічам разам праект прадумвалі. У мяне яшчэ здымкі ёсць: дзве сям'і там на пустой палянцы. Туды мы прыязджалі ў выхадныя: грыбы, ягады, рыбалка. Машэраў з дочкамі, а потым і з унучкамі, дзед з намі. Там усе разам і бавілі час. Спачатку пабудавалі проста домікі драўляныя. Прычым бацька мой нібыта галоўным інжынерам быў, калі будавалі «Сосны». Ніхто ж ісці не хацеў на адказны цэкоўскі аб'ект. З часам з'явілася там уся інфраструктура. Мама з бацькам разышліся недзе ў 79-80-м, цяпер ён жыве ў Канадзе. І ў яго там свая сям'я, сваё жыццё.

* Не забываецца, як дзед паважліва ставіўся да людзей. Я ніколі не заўважаў, каб ён ставіў сябе вышэй за суразмоўцу. І не важна, хто быў перад ім. Калі пачынаў з кімсьці размову — па службе альбо не — у яго не было пагарды. І потым гэта ўсё пэўным чынам спрацавала на карысць дзеда. У 90-х практычна ўсе парткіраўнікі апынуліся без справы. А з дзедам, нягледзячы ні на што, сяброўскія стасункі падтрымлівалі вельмі многія людзі. У Бярэзінскім запаведніку Уладзімір Іванавіч Мяшчанаў быў начальнікам паляўнічай гаспадаркі. Дык вось яны і пасля ўсіх падзей заставаліся ў добрых стасунках. Так і я з Уладзімірам Іванавічам і па гэтую пару сустракаюся. Аляксандр Кузьмін заўсёды падкрэсліваў: я такі ж просты хлопец, як і вы. А я ж бачыў, як у храме ён размаўляў з прыхаджанамі, з бацюшкам, і той з ім. Ды і з іншымі...

* У яго была выразная пазіцыя: ты ідзеш па жыцці сам, ты сам пражываеш наступствы таго, што нарабіў. Я ішоў сам — і ты сам. Параіцца — так, але каб ён кагосьці за мяне прасіў, кудысьці хадзіў, камусьці тэлефанаваў — такога не было. Я ведаю, быў у яго памочнік адзін, памёр ужо, і потым усплываць стала, што якраз ён шматлікія пытанні ад імя дзеда вырашаў на сваю карысць. І чалавек той разумеў: ніхто Кузьміну не пазвоніць і не запытае: «Трыфанавіч, ты даваў каманду ці не?»...

* Увогуле за ўсе гады службы ў мяне былі выдатныя, годныя камандзіры, усіх іх памятаю і паважаю. Мы і цяпер падтрымліваем добрыя, таварыскія адносіны. І дапамагаем адзін аднаму. Праўда, быў у вучылішчы такі палкоўнік, які прымусіў мяне трымаць абарону. Былі у яго на тое асабістыя прычыны. Крыві папсаваў. Але ад гэтага я стаў толькі мацнейшым.

* Я не адчуваў сябе ў абойме «залатой» моладзі, калі стаў дарослым. Сувораўскае, потым Ваеннае — гэта ж не такой моладзі шлях. Я ў тую абойму не трапіў. Мы з Наталляй Пятроўнай Машэравай знаёмыя, рос я з яе дочкамі, мог бы, можа, стаць яе зяцем. У яе дзве дачкі — Лена і Каця, унучкі Пятра Міронавіча, і мы сябравалі вельмі. Асабліва з Кацяй. Яны да нас нават у ваеннае вучылішча ў каравулку прыходзілі, то давялося там іх аднойчы хаваць, калі ротны прыйшоў службу правяраць. У выніку Ленка-такі выйшла замуж за Кузьміна — майго цёзку. Шляхі нашы разышліся. Унукі Сурганава ўжо даўно не ў Беларусі: Саня жыве ў Польшчы, Валодзя — у Францыі. Унучкі Машэрава ў ЗША жывуць, і Наталля Пятроўна да іх ездзіць, да ўнукаў сваіх. А ў мяне па-іншаму ўсё склалася. У 89-м я, паўтаруся, звольніўся з Узброеных сіл СССР. Мы з дзедам будавалі дачу ў Ждановічах. Цэглу, бярвёны разам цягалі. Час няпросты быў, будматэрыялы ў дэфіцыце. Але ж Радзіма не забыла мяне, і я ўжо ў 90-я прадоўжыў службу ў Мінску, хоць і ў іншым ведамстве.

* Скульптура ў маім жыцці важнае месца заняла з пятага класа: вучыўся ў Мастацкай школе. Дзед пазнаёміў з майстрамі Іванам Ахрэмчыкам, Іванам Міско — я ў яго ў майстэрні нешта ляпіў, з гіпсу адліваў... Вырашылі аддаць мяне ў Мастацкую школу імя Ахрэмчыка і аддалі. Але тая школа не вытрымала мой падлеткавы ўзрост. Зусім не вучыўся, пасля першай чвэрці 8-га класа пайшоў адтуль. Па "мастацтве" ў мяне было ўсё ў парадку, але агульнаадукацыйныя прадметы… Толькі па біялогіі была тады адзіная тройка — выкладчыца мяне любіла, астатнія двойкі. Думаю, дырэктар чакаў, калі гэта дзед-цэковец прыйдзе за

ўнука прасіць, але Аляксандр Трыфанавіч па-іншаму вырашыў праблему.

* Кузьміны ніколі не купаліся ў раскошы. Жылі ўмерана. Калі я наведваў Машэравых, то бачыў, што там і памочнікі па доме былі, і на кухні кухары працавалі. Людзі хадзілі ў белых халатах, не з членаў сям'і. Але так было трэба: становішча абавязвала. Бо Машэраў працаваў і дома, і на дачы. Да яго пастаянна хтосьці прыязджаў. У яго там нават свой кінатэатр, більярд на цокальным паверсе быў, дзе нейкія фільмы пракручвалі на дзелавых сустрэчах. І, натуральна, штосьці пры тым падавалі: чай, кава, бутэрброды... Ды ў іх там хатнія такое б не вытрымлівалі. А яны, Машэравы, да таго ж працавалі, хадзілі на службу.

* А з намі яшчэ жылі бацькі бабулі, яна перавезла іх з Сальска, што ў Растоўскай вобласці. У нас у двары адзін час дворніка не было, то дзед Андрэй падмятваў, і я ў тым удзельнічаў. З ім і снег зімой чысцілі. А прабабуля мая, Дуня, гатавала ежу на ўсю сям'ю. Боршч украінскі, бульба-юшка і ўсе іншыя стравы ў сям'і Кузьміных — гэта ўсё ад яе. Побыт мае бабуля і прабабуля забяспечвалі. Я таксама там круціўся: бульбы накапаць, нешта некуды перанесці. Агароды ж у нас былі свае пры дачах. І нармальныя агароды ў Драздах: метраў 50 на 50. Маліна, клубніцы раслі. Вось там я памятаю: хтосьці з агародам дапамагаў, з праполкай. Дзяўчынка была крыху старэйшая за мяне з маці. Я і потым з імі сустракаўся. А ў самой дачы, як і ў гарадской кватэры, у нас ніколі нікога са старонніх не было.

* Ці ёсць нашае жыццё вынікам нашых учынкаў ці выпадку? Аляксандр Трыфанавіч так лічыў: мы самі — кавалі свайго шчасця. Што сам пасееш — тое і пажнеш. І пляцецца ланцуг падзей твайго жыцця табой, а не кімсьці іншым. Калі што не падабаецца — вінаваціць у тым можна толькі сябе. Гэта адзін з пастулатаў, які я вынес ад дзеда. Ён заўсёды гаварыў: за свае ўчынкі рана ці позна давядзецца адказваць. І калі ты накасячыў, то цябе "аддача" заўсёды дагоніць. Дзед пастаянна вельмі шмат чытаў, як я казаў, і рэлігійнай літаратуры, і кніга Райманда Моудзі "Жыццё пасля смерці" была ў яго. З кімсьці ён пагаджаўся, з кімсьці не. У яго запісах гэта ёсць, сёе-тое з іх у мяне засталося. Адзін нататнічак бабуля Тая пасля яго смерці з ардэнамі перадала. Ён там піша, спрачаецца з Моудзі. Прыгадвае: у Бярэзінскі паехаў — яму дрэнна стала ў лодцы. Страціў прытомнасць. І піша, што ў той час нічога не было. Пустэча. Змрок. Ён аналізаваў, запісваў свае адчуванні. І вырашыў: вось там, за вялікай заслонай, нічога няма. Пераканаўся на ўласным досведзе. Ён і мне казаў: не было там ні калідора, ні анёлаў, нічога не было. Так і піша: мяне ў гэты момант проста не было. Але быў у лётчыка Кузьміна і такі досвед: калі знайшлі яго за 200 метраў — дзвесце метраў! — ад месца падзення самалёта замураваным у каркасе штурманскай кабіны. Там, расказваў дзед, яму прыбачыўся і тыгр агромністы, і нейкі старац, і былі фарбы-колеры такія, што не знойдзеш у гэтым свеце. Так што ён і сам не ўпэўнены быў: ці ёсць ТАМ нешта, ці няма. У яго яшчэ быў Чарнобыльскі сшытак — у ім ён таксама нешта запісваў. Яшчэ пасля трагедыі на ЧАЭС яны з Алесем Адамовічам рыхтавалі матэрыялы, і двойчы адпраўлялі пісьменніка з імі ў Маскву... Прэса пазней пісала, што пасля выбуху атамнага рэактара ў Чарнобылі Адамовіч быў адным з першых у Беларусі, хто стаў актыўна звяртаць увагу грамадскасці на тое, што здарылася. Цяпер зразумела: больш у нас было б гора, калі б не было ў Беларусі такіх людзей, як ён, як Аляксандр Кузьмін, Мікалай Барысевіч (Мікалай Аляксандравіч Барысевіч — савецкі і беларускі фізік, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, акадэмік АН СССР. — **Аўт.**). Васіль Несцярэнка (Васіль Барысавіч Несцярэнка — савецкі і беларускі вучоны, член-карэспандэнт АН БССР. — **Аўт.**) ды іншыя. Гэтыя мужныя людзі адкрыта гаварылі пра рэальныя маштабы забруджвання, пра наступствы катастрофы.

* Я мару, каб нехта напісаў пра майго дзеда. Менавіта цяпер такі час, калі маладняку, які вырас на зломе стагоддзяў, трэба прыклад браць з такіх асобаў, як Аляксандр Кузьмін. Для выхавання — глыбока пераканаваны — таксама патрэбна выбудаваная, прадуманая ідэалагічная праца. Дзед мой пакуль мог пісаць — пісаў. Яшчэ ў 2003-м пісаў канцэпцыі развіцця Беларусі тым, хто да яго прыходзіў, прыязджаў з Дома Урада. Я ведаю: шмат было тады хадакоў, прасілі яго пісаць на розныя тэмы. Думаю, праца дзеда была не дарэмнай. Ён фактычна ўдзельнічаў у палітычным жыцці гра-



Аляксандр Кузьмін разам з жонкай Таісіяй на адным з урадавых канцэртаў



Дзмітрый Кузьмін з жонкай Наталляй у дні адпачынку ў Празе

мадства. І ў тым, як Беларусь рухалася, мне бачыцца і развіццё яго думак, ідэй. Пэўна што выкладкі Кузьміна ў такой складанай працы — выкарыстоўваліся. Калі ж казаць вобразна, то ваенны штурман Аляксандр Кузьмін у складаны перыяд жыцця Беларусі пракладваў маршрут у будучыню для ўсёй краіны.

* Дзе цяпер "Чарнобыльскі сшытак" Аляксандра Трыфанавіча — складана сказаць. У сілу розных прычын ёсць пэўныя цяжкасці ў зносінах паміж яго нашчадкамі. Стосы рукапісаў, каштоўны архіў Кузьміна мне цяпер недаступныя. У доме быў падвал, там стэлажы былі застаўлены паперамі. Дзед мяне просіць: вось гэта занясі, гэта звяжы... Ён тэмы падпісваў, каб потым было прасцей сістэматызаваць. Я стосы ў падвал насіў. На жаль, кватэру дзеда мае родзічы прадалі. Спадзяюся, калі нешта ад архіва засталося, то хтосьці паглыбіцца ў змест і ўсё тое перадасць у дзяржархіў. Тое-сёе Наташа, адна з дачок Кузьміна, кудысьці перадавала. Дык можа і "Чарнобыльскі сшытак" там...

* Яшчэ я бегаў з ідэяй зрабіць кінафільм пра Кузьміна да рэжысёра Яфрэмава. (Аляксандр Яфрэмаў, мастацкі кіраўнік Тэатра-студыі кінаакцёра. — **Аўт.**). Ён сказаў: вельмі цікавая тэма. Няма беларускага фільма пра лётчыкаў ды з пераходам-працягам лёсу ў нашыя дні. А ў выпадку з Аляксандрам Трыфанавічам можна перайсці ад штурмана-лётчыка да штурмана партыі. Можна працэсы грамадскія адлюстраваць. Як ён "Верасам" даў дарогу ў жыццё, як "Песняроў" падтрымліваў. З Міхаілам Савіцкім яны ў сяброўскіх стасунках былі, і дзякуючы Кузьміну мастак атрымаў магчымасць весці свае курсы (цяпер у тым будынку на вуліцы Някрасава, 3 у Мінску — Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў. — **Аўт.**). Я трохі ў курсе, як падобныя праекты абмяркоўваліся, у тым ліку і на дачах. Выданне "Кніг памяці" ва ўсіх раёнах Беларусі — таксама, можна сказаць, маштабны праект Аляксандра Кузьміна.

* Дадому дзед прыносіў з сабой кучу папер і мог над імі прасядзець амаль да раніцы. З такім вось настроем і прыходзіў. Бывала, з'яўляўся пахмурны і стомлены. Але раздражнёным яго я не бачыў: дзед заўсёды трымаў сябе ў руках. Не памятаю такога, каб на кагосьці, як гаворыцца, скідваў ён свой негатыў. Бывала, папікіруюцца дзед з бабуляй, але нязлосна і не доўга. Канфліктаў не было.

* Дзеда у сям'і ўсе не толькі слухалі, але і чулі. І быў толькі адзін чалавек, які мог паставіцца да яго словаў без належнага піетэту: ваш пакорны слуга. Першы раз я не паслухаўся, калі мяне аддавалі ў Сувораўскае. Проста расчыніў акно — і мяне не стала на пару дзён. Балазе, першы паверх, гэта было на лецішчы. Але такой была першая рэакцыя. А потым усё ж такі я дзеда пачуў. Угаварыў, пераканаў дзед унука. Сувораўскае закончыў — думаў пайсці далей па скульптуры. Была ў Піцеры ваенная мастацкая акадэмія. Але мяне туды не адпускалі, нешта іх спыніла. Я ім: дык я ж там буду за плотам, як і тут. Якая розніца? І буду ж мастацтвам займацца ўсё ж такі. Не пераканаў. А па размеркаванні патрапіў якраз у мінскае вучылішча.

* Унутры сябе я ў сваім жыцці адчуваю барацьбу паміж "не хачу" і "трэба". Спачатку "трэба" казаў дзед, потым — афіцэры. Але я заўсёды знаходзіў аддушыну ў мастацтве, у музыцы. Мама ж музыкантка. Разам з сястрой яны заўсёды выкладалі ў педуніверсітэце ігру на фартэпіяна. Я дагэтуль іграю. У мяне Ямаха 550-я ёсць, сінтэзатар — я так расслабляюся. Паляплю, паіграю. Імправізую ў джазавым стылі. Сам трохі нешта магу скласці.

* Пра цацкі дзіцячыя ўжо распавёў. І навыкі, набытыя ў Мастацкай школе імя Ахрэмчыка, нікуды не дзеліся. Я, можна сказаць, скульптар-самавук, бо не маю дыплома. Працую для ўласнага задавальнення. Надмагільны помнік Аляксандру Трыфанавічу Кузьміну на мінскіх Усходніх могілках зроблены па маім праекце. Там бронза мая: партрэт дзеда зрабіў. Адлівалі ў прыватнай фірме. У 89-м я там жа і першую сваю працу адліў: рашотку для каміна. Калі звольніўся, думаў: чым займацца? Меў зносіны з паважанымі людзьмі з Саюза архітэктараў... Сябраваў з Жорам Скрыпнічэнкам, які мяне па-свойску сынком зваў, яго партрэт зрабіў. (Георгій Скрыпнічэнка — мастак, прадстаўнік беларускага сюррэалізму. — **Аўт.**) Гэта быў абсалютна таленавіты і адданы мастацтву творца. Але гэта ўсё, як гаворыцца, факультатыўныя справы. Вось Сурганаў Сашка папрасіў: Дзіма, зрабі бацьку партрэт на магілу. Я зрабіў. Маім сябрам, былым педагогам працы мае падабаюцца.

Ды практыкі малавата. Скульптару, як і музыканту, кожны дзень трэба быць пры справе, а я гэтым займаюся перыядычна. У нас розная хуткасць у працы. Я магу завіснуць у нейкай дэталі, а ў прафесіяналаў больш досведу, напрацовак, майстэрства.

* Працуючы з матэрыялам, адчуваю: лепш бы я з ім і працаваў па жыцці. Вось бы не ленавацца, вучыцца, застацца ў Мастацкай школе — і паіншаму жыццё склалася б. Можа паступіў бы на скульптурнае аддзяленне ў Тэатральна-мастацкі інстытут, павучыўся, дыплом атрымаў. А ён часам патрэбны. Бо праводзяцца конкурсы, а для ўдзелу ў іх трэба мець мастацкую вышэйшую адукацыю...

* У 92-м я ажаніўся з дачкой палкоўніка ў адстаўцы і, як аказалася потым, сябрам начальніка майго вучылішча. Ён былы афганец. Мая жонка — дачка афіцэра, і адпаведна выхаваная. У нас двое дзяцей: Мікіта з 93-га года і Вольга з 98-га. Дачка таксама ўмее ляпіць і маляваць, пайшла па гэтым шляху, вось цяпер заканчвае ружы для магілы Яўгена Фёдаравіча Сурганава. Бо Саша, унук Фёдара Сурганава, як я казаў, жыве ў Польшчы. Мама яго ўжо ва ўзросце. А Саня вырашыў, што на магіле павінны ляжаць кветкі.

* Паколькі ў дзеда былі дзве дачкі, то мы разумелі: прозвішча Кузьмін трэба зберагчы. Так хацела мама: па пашпарце яна дагэтуль Кузьміна. Развялася, калі я ў 4-м класе быў. Паміняць прозвішча — гэта тэма года 1994-га. Я ж раней быў на прозвішчы бацькі, памяняў яго на Кузьміна. Дзеду такое маё рашэнне было прыемнае. Так я стаў Дзмітрыем Аляксандравічам Кузьміным.

* У 2003-м дзеда не стала. Памяць пра яго ў Мінску яшчэ не ўвекавечана. У 1937-м Аляксандр Кузьмін апрануў пагоны курсанцкія і сумленна служыў Радзіме фактычна да апошніх дзён. Ёсць вуліца Сурганава, ёсць Прытыцкага, Кісялёва, праспект Машэрава. У Кузьміна, яго правай рукі, пакуль нават завулка няма. Калі казаць пра патрыятызм і выхаванне на прыкладах, то гэтага чалавека, на мой погляд, беларусам варта памятаць. Ягоны лёс "вывозіць" нас з гераічнага ваеннага мінулага ў новую Беларусь. Для яе развіцця і росквіту Аляксандр Трыфанавіч зрабіў вельмі шмат. Тое, як пражыў ён жыццё, як прайшоў зямны шлях, можа быць добрым прыкладам для іншых, у першую чаргу для моладзі. Гэта адзін з годных прыкладаў служэння не тое каб партыі, а служэння менавіта Айчыне. Пасля апошняга цяжкага ранення яго дэмабілізавалі, прадставілі да ўзнагароджання ордэнам Чырвонай зоркі... Ды накіравалі на партработу, а гэта ж таксама служба была. І жыць маладая сям'я пачынала ў нейкай прыбудове ў Траецкім прадмесці. Ледзь хапала ім грошай на хлеб, мне бабуля распавядала. Прыгадваю фільм "Афіцэры", дзе акцёр Юматаў прыносіць боршч жонцы. Прыкладна ў такой жа будцы і ў такіх жа ўмовах Кузьміны ў Мінску пачыналі жыць.

* Дзедавы лейтэнанцкія пагоны і штурманскую лінейку захоўваю свята як памяць пра яго.

* Важна не забываць нам людзей, якія шчыра служылі сваёй Бацькаўшчыне. Эпізоды з жыцця Аляксандра Кузьміна выпісаны і ў мастацкіх творах. У аснове апавядання "Нерухомасць" Алеся Адамовіча, напрыклад, быль пра тое, як цяжка паранены, увесь пераламаны ды замураваны ў гіпс афіцэр (адно вочы блішчаць), лежачы нерухома на насілках, "збег" з аднаго шпіталя і дабраўся з перасадкамі па чыгунцы ў іншы, да свайго сябра-пілота. У аснове ж аповесці "Трэці пілот" Анатоля Сульянава таксама ўспаміны майго дзеда. Там гісторыя пра тое, як медсястра два тыдні выходжвала параненага лётчыка ў закінутай саклі, на Каўказе. Дзед яе потым успамінаў праз усё жыццё. Яна выратавала яго ад немінучай смерці: раны перавязвала, грэла, карміла і нават ад мясцовых бандытаў адбіла. І яны дачакаліся машыну, якая адвезла параненага ў шпіталь. У нас ёсць прыклады годнага, гераічнага жыцця, і пра іх не трэба забываць. Каб не страціць не проста памяць пра верных Айчыне людзей — не страціць саму Айчыну. На жаль, цяпер здымаецца мноства серыялаў па 15-20 серый — і ні пра што. А вось на лёсы, як у майго дзеда, варта б творчую ўвагу скіраваць. Спадзяюся, хто-небудзь зможа гэта зрабіць. І я ўдзячны вам за тое, што вы памятаеце пра Аляксандра Кузьміна.

Гутарылі Іван і Валянціна **Ждановічы**.

Здымкі з асабістага архіва Дзмітрыя Кузьміна.



"Мае салдацікі". Ліццё, бронза, падстаўка з малахіта.



Скульптурны партрэт Георгія Скрыпнічэнкі, беларускага мастака. Аўтар — Дзмітрый Кузьмін, яго сябар.




Надмагільны помнік Аляксандру Кузьміну выкананы па праекце Дзмітрыя. Адобраны Таісіяй Кузьміной, як і скульптурны партрэт з бронзы, зроблены ўнукам.

# НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ — НОВЫЯ ЎРАЖАННІ

**Тое, што турыстычная галіна ва ўсім свеце перажывае не лепшыя часы — далёка не навіна. Галоўная праблема гэтага, якая не абмінула, вядома ж, і Беларусь, таксама добра вядомая. Пандэмія. Менавіта яна ўнесла тыя негатыўныя карэктывы, што наўпрост закранаюць і сферу абслугоўвання. А таму найбольш актуальным стала пытанне аб тым, у якой меры змаглі своечасова перафарматаваць сваю працу беларускія турыстычныя арганізацыі. Наколькі прафесійна тут ўмеюць адказваць на выклікі, што ёсць у арсенале турпрапаноў для запытаў турыстаў, у якім кірунку сёння фарміруюцца новыя турыстычныя трэнды? Пра ўсё гэта мы пагутарылі са старшым выкладчыкам кафедры міжкультурных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Паўлам Сапоцькам.**

***— На ваш погляд, ці змагла беларуская турыстычная галіна перабудавацца, рэагуючы на нечаканыя ў пэўным сэнсе выклікі апошняга часу?***

— У сувязі з глабальнай эпідэміяй каранавіруса цэнтр цяжару перамясціўся ў краіне на ўнутраны турызм. Высвятляецца, што менавіта ён уяўляе сабой магутны рэсурс з пункту гледжання і сацыяльна-эканамічнага развіцця, і адраджэння рэгіёнаў, і грамадзянска-патрыятычнага выхавання. Сёння ў Беларусі актыўна развіваюцца культурна-пазнавальны, ваенна-гістарычны, сельскі, прамысловы, медыцынскі, гастранамічны турызм. У мінулым годзе былі распрацаваны новыя турыстычныя праграмы, абноўленыя экскурсійныя маршруты, з'явіліся цікавыя ідэі кластараў, якія аб'ядноўваюць аб'екты і славутасці адразу некалькіх рэгіёнаў краіны. У беларускіх аграсядзібах значна пашыраны пералік паслуг, заявілі аб сабе новыя прапановы, звязаныя з гістарычнай рэканструкцыяй. Не застаюцца ў баку музеі, якія актыўна ўкараняюць розныя мабільныя дадаткі, сродкі віртуальнай і дапоўненай рэальнасці, аўдыягідаў. Усё гэта напаўняе турызм новым зместам, стымулюе беларусаў і гасцей ездзіць, глядзець, знаёміцца з краінай.

***— Як, на ваш погляд, будзе набываць развіццё турыстычная сфера Беларусі ў бліжэйшай перспектыве?***

— Сёння ў прыярытэце — стварэнне новых канкурэнтаздольных турыстычных праграм. Для гэтага выкарыстоўваецца рэсурс матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны, прыроднай спадчыны, сацыяльна-культурных устаноў — музеяў, галерэй, тэатраў, Дамоў рамёстваў, цэнтраў фальклору, паркаў культуры і адпачынку. Мяркую, што яшчэ больш актыўна могуць заявіць пра сябе аграсядзібы, арганізацыі грамадскага харчавання, санаторыі. Велізарны рэзерв у падзейных мерапрыемствах — фестываляў, святаў, выставак-кірмашоў, праграм гістарычнай рэканструкцыі.

Адна з найважнейшых задач — шырокае інфармацыйнае суправаджэнне сферы турызму: правядзенне прэс-тураў, арганізацыя спецыяльных праектаў са СМІ, падрыхтоўка спецвыпускаў друкаваных выданняў, запуск тэматычных рубрык у сацыяльных сетках, падрыхтоўкі цыкла праграм на тэлебачанні. Уяўляецца актуальным



Павел Сапоцька

стварэнне ролікаў аб турыстычных магчымасцях Беларусі, кожнай вобласці і горада Мінска з далейшым забеспячэннем шырокай іх трансляцыі на Беларускім тэлебачанні, інфармацыйных рэсурсах дыпламатычных місій Беларусі за мяжой, сайтах арганізацый беларускай дыяспары ў розных краінах свету. Важна развіваць лічбавыя платформы, электронныя сродкі турыстычнай навігацыі, мабільныя дадаткі пры прасоўванні турыстычнага прадукту.

І за мяжой, і ў нас перспектыўным з'яўляецца стварэнне паўнавартасных праектаў у форме "залатых кольцаў", турыстычных кластараў, дэстынацый. Гэта калі чалавек, прыбыўшы ў які-небудзь рэгіён, больш, па сутнасці, ужо ні аб чым не клапоціцца. Яго паўнавартасны адпачынак фарміруецца з сеткі турыстычных кампанентаў, якая ўключае гістарычныя аб'екты, аздараўленчыя комплексы, аб'екты харчавання, культурныя ўстановы і гэтак далей. Турыст можа актыўна і з цікавасцю, максімальна разнастайна правесці свой вольны час. У выйгрышы цяпер будуць тыя рэгіёны і суб'екты турызму, якія змаглі своечасова аб'яднацца і на канкурэнтнай аснове прапанаваць цікавыя прадукты. Добрыя прыклады падобнага роду ёсць цяпер у сферы аграэкатурызму, калі сядзібы аб'ядноўваюцца і прымаюць турыстаў на тэрыторыі якога-небудзь рэгіёну, прапаноўваючы ім унікальную, насычаную праграму. Да прыкладу, у адной аграсядзібе дэманструецца батлеечны спектакль, у другой навучаюць граць на старажытных музычных інструментах, у трэцяй праводзяць майстар-клас па стварэнні вырабаў з гліны, у чацвёртай сплаўляюць на байдарках, у пятай запрашаюць у кантактны заапарк, у шостай праводзяць дэгустацыю страў нацыянальнай беларускай кухні. Атрымліваецца, што турыст знаёміцца з рэгіёнам праз прызму актыўнасцяў, культурнай спадчыны і гістарычнага мінулага, а таксама мае зносіны з людзьмі. У выніку такі адпачынак, несумненна, запомніцца падарожнікам, а выгаду атрымаюць не адна, а некалькі аграсядзіб.

У свой час, у рамках праекта USAID "Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё", які рэалізуецца Праграмай развіцця ААН, мясцовыя супольнасці атрымалі стымул да стварэння парадку 20 турыстычных дэстынацый у розных рэгіёнах Беларусі ў выглядзе кластараў аграэкатурызму: у Брэсцкай вобласці — "Белавежскі тракт", "Даліна ракі Ясельда", "Зялёнае кальцо Барановіч", "Мотальскі шлях", "Мухавэцкая кумора", "Пінскае Палессе", "Палеская Амазонія", у Гродзенскай вобласці — "Зялёны абярэг Гродна", "Зэльвенскі дыяруш", "Зямля Міцкевіча", "Край пушчанскіх цудаў і сакрамэнтаў", "Мірское графства", "Спадчына Гедыміна", "Па слядах старажытных шахцёраў", "Паўночныя Афіны", "Паўночны вектар Гродзеншчыны", "Шчучынская дэстынацыя".



Ельня. Удзельнікі фэсту "Жураўлі і журавіны"

Статыстыка паказвае штогод у Беларусі ў сярэднім распрацоўваецца каля 15 турыстычных маршрутаў. Летась, напрыклад, з'явіліся такія маршруты, як "Мемарыяльны комплекс "Трасцянец", "Архітэктурныя і гістарычныя помнікі Слоніма, Жыровічаў і Сынкавічаў", "Паміж Баранавічамі і Ганцавічамі: на скрыжаваннях гісторыі", "Аршаншчына — падарожжа ў мінулае і сапраўднае краю", "Страчаны рай: жыццё і катастрофа беларускіх штэтлаў". Цэлы шэраг экскурсій праводзіцца на замежных мовах — на англійскай, нямецкай, кітайскай. Гэта такія экскурсіі як "Брэст — горад старажытны і сучасны", "Курган Славы", "Мемарыяльны комплекс "Хатынь", "Архітэктурныя і гістарычныя помнікі Косава і Ружан", "Дарога ў Дудуткі".

Нягледзячы на складаную эпідэміялагічную сітуацыю, не варта скідаць з рахункаў магчымасці міжнароднага і трансгранічнага культурнага турызму. З 1987 года Саветам Еўропы рэалізуецца маштабны праект "Еўрапейскія культурныя маршруты", які ставіць у якасці асноўных задач заахвочванне падарожжаў грамадзян розных краін і вывучэння іх гістарычнага мінулага, выяўленне самабытнасці мясцовых культур у кантэксце сусветнай культурнай спадчыны. Налічваецца больш за 40 культурных маршрутаў, кожны з якіх дазваляе шырока інтэрпрэтаваць разнастайнасць культурнага патэнцыялу Еўропы. Беларусь удзельнічае ў двух маршрутах: "Еўрапейскі шлях габрэйскай спадчыны", які прадугледжвае знаёмства турыстаў з багатай матэрыяльнай і духоўнай спадчынай габрэяў (сумесна з Азербайджанам, Бельгіяй, Босніяй і Герцагавінай, Харватыяй, Чэхіяй, Францыяй, Грузіяй, Германіяй, Італіяй, Літвой, Польшчай, Румыніяй, Сербіяй, Іспаніяй, Партугаліяй, Турцыяй, Вялікабрытаніяй) і "ВІА РЭДЖЫА", які з'яўляецца самай старой і доўгай дарогай, што злучае Усходнюю і Заходнюю Еўропу, якая раней служыла для перасялення мігруючых плямёнаў у каменным стагоддзі і садзейнічала развіццю гандлю ў сярэднія вякі, а цяпер вядомая як Пан'еўрапейскі транспартны калідор III (сумесна з Францыяй, Германіяй, Польшчай, Беларуссю, Украінай).

Лічу важным узаемадзеянне па лініі гарадоў-пабрацімаў — рэгіёнаў, паміж якімі ўстаноўлены дружалюбныя сувязі з мэтай развіцця супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы. Дыпламатыя гарадоў з'яўляецца эфектыўным сродкам міжкультурнага дыялогу і трансляцыі каштоўнасцяў міжнароднай дружбы, згоды, адзінства і партнёрства,



Юраўскі карагод

інструментам папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны пароднёных гарадоў і павелічэння турыстычных патокаў, магчымасцю рэалізацыі гуманітарных праграм.

***— Улічваючы міжнародны аспект турызму, нельга не пацікавіцца пра тое, чым Беларусь, перш за ўсё, прывабная для замежных гасцей? Якія тут канкурэнтныя перавагі краіны, калі так можна выказацца?***

— Наш магутны патэнцыял — у велічных замках і палацах, старадаўніх храмах розных канфесій, маляўнічых прыродных ландшафтах, унікальных нацыянальных парках і запаведніках, яркіх фестывалях і святах, багатай нематэрыяльнай спадчыне, цудоўнай нацыянальнай кухні і ў многім іншым. Хачу нагадаць, што ў 2016 — 2018 гадах Рэспубліка Беларусь займала лідзіруючыя пазіцыі ў намінацыі "Агратурызм" рэйтынгу "National Geographic Traveler Awards". У 2017 годзе аўтарытэтнае брытанскае выданне "Таймс" уключыла Мінск у топ-30 гарадоў, прывабных для адпачынку на ўік-энд. У 2019-м ужо брытанская газета "Independent" прадставіла беларускую сталіцу ў спісе еўрапейскіх гарадоў, якія рэкамендуецца наведаць. Беларусь трапіла ў дзясятку лепшых краін для падарожжаў у тым жа 2019 годзе па версіі міжнароднага выдавецтва "Lonely Planet".

Сусветна вядомыя нашы нацыянальныя паркі: "Белавежская пушча", "Нарачанскі", "Прыпяцкі", "Браслаўскія азёры", а таксама Бярэзінскі біясферны запаведнік і Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік.

Беларусь годна прадстаўлена ў спісе Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА — такімі знакавымі месцамі як Нацыянальны парк "Белавежская пушча", Замкавы комплекс "Мір", архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у горадзе Нясвіж, пункты трансгранічнага аб'екта "Геадэзічная дуга Струвэ". У спісе нематэрыяльнай культурнай спадчыны — калядны абрад "Калядныя цары" ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці, вясновы абрад "Юроўскі карагод" у вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. У Рэпрэзентатыўным спісе нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва — каталіцкі фестываль "Урачыстасць у гонар ушанавання Абраза Маці Божай Будслаўскай (Будслаўскі фэст)" у Валожынскім раёне Мінскай вобласці, традыцыі ляснога бортніцтва Беларусі і Польшчы.

У нас у краіне знаходзяцца цудоўныя аб'екты спадчыны: Спаса-Праабражэнская царква XII стагоддзя ў Полацку, Гомельскі палацава-паркавы ансамбль XVIII — XIX стагоддзяў, Барысаглебская (Каложская) царква XII стагоддзя ў Гродне, Камянецкая вежа XIII стагоддзя Брэсцкай вобласці, Аўгустоўскі канал XIX стагоддзя ў Гродзенскім раёне, цэрквы абароннага тыпу XVI стагоддзяў у вёсцы Сынкавічы Зэльвенскага раёна і ў вёсцы Мураванка Шчучынскага раёна, комплекс былога манастыра езуітаў XVI — XIX стагоддзяў у Нясвіжы, комплекс фартыфікацыйных збудаванняў Брэсцкай крэпасці XIX — XX стагоддзяў і многія іншыя. Завершаны аднаўленчыя работы на такіх знакавых аб'ектах, як Косаўскі палацава-паркавы ансамбль, Свята-Успенскі сабор у гарадскім пасёлку Жыровічы Слонімскага раёна, палацавы комплекс Сапегаў у Ружанах Пружанскага раёна, палацава-паркавы ансамбль у вёсцы Жылічы Кіраўскага раёна. Працягваюцца рэстаўрацыйныя работы на Старым замку ў Гродне, Гальшанскім замку Ашмянскага раёна і Крэўскім замку Смаргонскага раёна, у палацава-паркавым комплексе ў вёсцы Свяцк Гродзенскага раёна.

***— Як вядома, важным звяном у сістэме турызму заўсёды выступаюць музеі...***

— Сёння беларускія музеі валодаюць цікавымі пастаяннымі экспазіцыямі, арганізуюць часовыя выставачныя праекты, праводзяць праграмы гістарычнай рэканструкцыі, ствараюць інтэрактыўныя комплексы, прапануюць разнастайную сувенірную прадукцыю. Паход у музей — гэта пранікненне ў гісторыю і знаёмства з багатай культурай беларусаў. Цікавымі экспазіцыямі змаглі заявіць аб сабе параўнальна новыя музеі. Такія як музей Бялыніцкага — Бірулі ў Магілёўскай вобласці — філіял Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча — гэта філіял Віцебскага цэнтра сучасных мастацтваў, музей Станіслава Манюшкі — філіял Чэрвеньскага раённага краязнаўчага музея ў гарадскім пасёлку Смілавічы. Турыстам, несумненна, будзе цікава пазнаёміцца з новымі пастаянным экспазіцыямі — такімі як "Музей вайны — тэрыторыя міру" ў Мемарыяльным комплексе "Брэсцкая крэпасць-герой", "Мінск. Верхні горад. Археалагічны музей" у Музеі гісторыі горада Мінска, "Беларускія яўрэі" ў Іўеўскім музеі нацыянальных культур. Немалую цікавасць таксама ўяўляюць ведамасныя, школьныя музеі.

Разнастайная фестывальная карта Беларусі. Гэта і міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", Рэспубліканскае свята "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў") у аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці, Міжнародны фестываль "Беларуская музычная восень" у Мінску, Міжнародны маладзёжны тэатральны форум "M. art.кантакт" у Магілёве, Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва "Славянскія

тэатральныя сустрэчы" ў Гомелі, Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый "Кліч Палесся" ў аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці, Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі, які праходзіць у Маладзечне.

А якія ўражанні застануцца ў замежніка пасля наведвання балетаў "Шчаўкунчык" альбо "Лебядзінае возера" ў пастаноўках Валянціна Елізар'ева ў Вялікім тэатры Беларусі! Або візіту на БелАЗ і знаёмства з занесеным у Кнігу рэкордаў Гінеса самым вялікім у свеце 450-тонным самазвалам! Або падарожжа па казачнай Белавежскай пушчы і Прыпяцкім Палессі! Ён ніколі не забудзе Беларусь і абавязкова захоча вярнуцца сюды зноў!

Унікальная з'ява, з якой Беларусь стала шырока вядомая ў апошні час, — гэта аграэкатурызм. Сёння беларускія аграсядзібы прапануюць цікавыя экскурсіі па рэгіёнах, анімацыйныя праграмы, веласіпедныя і водныя паходы, майстар-класы па рэканструкцыі нацыянальных абрадаў, інтэрактыўныя конныя шоу, музычныя вечары, паказы батлеечных спектакляў, дэгустацыі страў нацыянальнай кухні.

Нельга не сказаць і пра тое, што дзякуючы кваліфікаваным спецыялістам і сучасным медыцынскім цэнтрам у Беларусь едуць на лячэнне, а таксама для атрымання кансультацый медыкаў. З мэтай аздараўлення ў беларускіх санаторыях нашу краіну наведвае вялікая колькасць замежнікаў. Папулярнасцю карыстаюцца санаторыі "Юнацтва" (Мінскі раён), "Сосны" (Мядзельскі раён), "Беларусачка" (Мінскі раён), "Лясныя азёры" (Ушацкі раён), "Сасновы Бор" (Маладзечанскі раён), "Белая Вежа" (Камянецкі раён), як, зрэшты, і іншыя.

Між тым, вельмі цікавыя праграмы для турыстаў прапануюць і беларускія прамысловыя прадпрыемствы, сярод якіх БелАЗ, МТЗ, кандытарская фабрыка "Камунарка". Турыстам ужо палюбіліся наведванні шклозавода "Нёман", фабрыкі "Слуцкія паясы", малочных зводаў "Бабушкина крынка" і "Савушкін прадукт", дзе экскурсіі суправаджаюцца лекцыямі, сустрэчамі са спецыялістамі, аглядам прадукцыі, дэгустацыямі, майстар-класамі. У бліжэйшы час будуць праведзены азнаямленчыя мерапрыемствы для экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў на прадпрыемствах канцэрна "Беллегпрам". Упэўнены, што для турыстаў будзе цікавы працэс стварэння фільмаў як у павільёнах, так і на натурнай пляцоўцы Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", якая таксама мае ўнікальны фонд гульнявога рэквізіту.

***— А якая, на ваш погляд, роля турызму ў справе грамадзянскага і патрыятычнага выхавання?***

— Турызм — эфектыўны сродак патрыятычнага і маральнага выхавання, у першую чаргу маладога пакалення. Нядаўна ва Усіхсвяцкім храме адбыўся семінар, прысвечаны тэме патрыятычнага выхавання сродкамі адукацыйнага турызму. Я быў здзіўлены і захоплены тым, наколькі цікавыя, інфармацыйна насычаныя мерапрыемствы праводзяцца па лініі Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства. Дарэчы, чаму б школьныя музеі не ўключаць у паўнавартасныя турыстычныя маршруты? Не ўсе яны, можа, багатыя візуальна, але многія валодаюць унікальнымі прадметамі і, бывае, там трапляюцца рэдкія экспанаты, пра якія марылі б і рэспубліканскія музеі. Я прыгадваю словы Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Дзмітрыя Мезенцава, які вельмі дакладна адзначыў у адным са сваіх выступаў: "Як толькі мы перастанем прыходзіць да помнікаў, то для сябе і нашай моладзі закрыем маральную шкалу ацэнкі таго, што было зроблена для нас". Упэўнены, Брэсцкую крэпасць, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Хатынь, мемарыяльныя комплексы "Трасцянец", "Ала", "Чырвоны Бераг" трэба паказваць і нашым, і замежным турыстам. Такія аб'екты больш, чым якія-небудзь яшчэ сродкі, дапамагаюць эфектыўна змагацца з фальсіфікацыяй нашай гісторыі, не заўсёды адэкватнымі трактоўкамі яе асобных фактаў, супрацьпастаўляючы ўсяму гэтаму дакументальную праўду, нават калі часам яна занадта жорсткая. Сёння гэтая тэматыка запатрабавана грамадствам і вельмі актуальная. Сведчаннем таму і Закон "Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму", падпісаны нядаўна Прэзідэнтам. Увогуле, тэма вайны, памяць аб ёй увекавечана ў Беларусі вельмі эмацыйна. А як па-іншаму можа быць у краіне, якая страціла кожнага трэцяга жыхара ў тыя страшныя гады?! Настаяцель Усіхсвяцкага храма Фёдар Поўны неяк падзяліўся сваім назіраннем: экскурсійная група падлеткаў прайшла па экспазіцыі Музея памяці, зайшла ў крыпту Храма-помніка, паслухала аповяд экскурсавода... Пасля гэтага было адчуванне, што дзеці пасталелі на год.

Размову вёў Уладзімір **Міхайлаў**



Мірскі замак

# ПРЫГАЖОСЦЬ НА ВУЛІЧНАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ

**У юбілейны год праекта "Мастак і горад" выстава на адной з мінскіх вуліц прысвечана творчасці народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва**

Без перабольшвання, гэта чалавек дзіўнага творчага лёсу, які зрабіў велізарны ўнёсак у скарбніцу нацыянальнага выяўленчага мастацтва. Ніколі не прыцягвалі яго толькі адгалоскі надзённых тэм, не прыцягвалі модныя мастацкія павевы, а тым больш салоннае псеўдамастацтва, часам папулярнае ў пэўных колах і сёння. Адным словам, у яго творчасці не было, вобразна кажучы, слізгання па паверхні, лёгкай жыццепадобнасці, мелкаводдзя імгненных задач.

— Характэрнае для гэтага мастака пачуццё часу вяло да глыбінь, да высокіх вобразна-пластычных пошукаў, не проста да выявы, а да філасофскага спасціжэння свету, да думак аб яго сутнасці, — адзначае заслужаны дзеяч мастацтваў, даследчык творчасці мастака, арт-крытык Барыс Крэпак. — Падняць пласт сучаснасці або гісторыі, выявіць раскідзістую каранёвую сістэму пэўных жыццёвых з'яў і працэсаў, злавіць "гены" вобраза чалавека, прыроды, рэчаў — вось так фарміраваў Леанід Шчамялёў патрабаванні да сябе і бліскуча сцвярджаў іх сваёй творчай практыкай. У яго не было твораў, прадыктаваных "розуму халодным назіраннем", пазбаўленых хаця б часцінкі асабістай веры, запалу, трывогі, любові, надзеі.

Леанід Шчамялёў нядаўна пайшоў з жыцця. Прайшло яшчэ зусім мала часу, каб паспрабаваць асэнсаваць вялікую страту. Але пачынаеш яшчэ больш разумець, што да яго твораў будзем звяртацца заўсёды — у смутку і ў радасці. І знаходзіць калі не адказы на ўсе жыццёвыя пытанні, то, ва ўсялякім выпадку, адчуваць тое нешта, што сугучна сваймy сэрцу.

— Таму што ягоны жывапіс — не толькі ўнікальны факт нацыянальнай культуры, але і фактар, які вызначае і фарміруе своеасаблівасць духоўнага свету беларуса другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзя, — сцвярджае Барыс Крэпак.

Дзе б не выстаўляліся працы Леаніда Шчамялёва, нават як цяпер у вулічнай прасторы беларускай сталіцы, мастак заўсёды паўстае ў дзіўнай цэласнасці свайго творчага абліччa. Не толькі бліскучым жывапісцам, не толькі вытанчаным віртуозам рукатворнай графікі, але Шчамялёвым — цэльным творцам свету незвычайнага. Свету не прыдуманага, а ўбачанага як бы ў натуры, але глыбока пераасэнсаванага і казачна пульсуючага ў кожным фрагменце жывапіснага палатна, у кожным мазку, у кожным уздыху пэндзля. Яго палотны — гэта самапазнанне сучаснага чалавека, самапазнанне духу. Усведамленне не проста прыгажосці, але і яе сэнсу. У гэтым і ёсць сутнасць яго творчасці.

Паэтычна-няўлоўны, казачны, містычны ў сваіх старажытных каранях беларускі край... Зямля неспасціжнай прыгажосці і светлай прыцягальнасці. Колькі мастакоў спрабавалі падабраць ключы да яе запаветных дзвярэй, і як нячаста гэта ў іх атрымоўвалася! У Леаніда Шчамялёва шмат святла — яснага, спакойнага, раўнамернага, які ажыўляе і запаўняе палотны. І шмат фантазіі. У яго ўсё арганічна перапляталася: паэзія, гісторыя, гарадскія вуліцы, прырода, сельскія рытмы, боль вайны. І роздум аб пражытым жыцці, аб творчасці.






Леанід Шчамялёў заўсёды адчуваў сябе лістом вялізнага дрэва, адчуваў галінку, на якой рос, галіну, на якой тая галінка трымалася. Адчуваў і ведаў сваю крону і ствол. І карані, якія сыходзяць углыб. Карані Айчыны. Рэальна і іншасказальна, за межамі часу, быццам бы ў іншым вымярэнні, якое ледзь-ледзь зрушылася, жывуць у яго і бела-блакітная зіма ў Полацку, і чырвона-залатыя снапы івянецкага лёну, і вераснёвае золата чароўнага ліставея, і сумныя коні на пясчанай касе, і вечар на сенажаці пад Ракавым, і млявыя дзяўчыны пры месячным святле на рацэ Ясельдзе, і вячэрні луг у туманным блакітным малаку, і звонкая цішыня на Астрашыцкім возеры, і неба — блакітнае, як акно ў космас, і шумнае вяселле дзе-небудзь у Новым полі ці ў мінскім дворыку, і брутальнае месіва блакітнага, белага, вохрыстага ў сваёй аголенай гучнасці восеньскага возера; і хрэсны ход у Багданаве, і асляпляльна шыкоўныя букеты півонь альбо руж; і аблічы блізкіх і родных яму людзей, пазнавальна падобныя, такія, як у жыцці, і не такія... А побач — захаваныя пэндзлем майстра дзеячы беларускай культуры: Янка Купала, Якуб Колас, а таксама шматлікія выдатныя персанажы "былых часоў", узятыя ў разнастайных падзейных вымярэннях.

— Універсалізм Леаніда Шчамялёва, глабальнасць праблематыкі, з аднаго боку, і глыбокая ўкаранёнасць у роднай культуры, — з другога, — такое двуадзінства было характэрна для мастака на працягу ўсяго яго доўгага творчага шляху, — упэўнены мастацтвазнаўца Барыс Крэпак. — Леанід Шчамялёў любіў сваю Радзіму, яе людзей і прыроду. Цяпер такія душэўныя сувязі творцаў прыгожага з першароднай зямлёй губляюцца. І гэта трэба прызнаць. Урбаністычная цывілізацыя ў многіх выпадках спальвае чалавечае абліччa.

Вядома, такога мастака як Шчамялёў па палічках не раскласці, нават калі гэтых палічак будзе мноства. Занадта шмат усяго і рознага. Леанід Дзмітрыевіч пісаў свет такім, якім яго бачыў і ўяўляў. І кожны ў шчамялёўскім свеце можа знайсці і ўбачыць сваё, блізкае яго душы і сэрцу — незалежна ад нацыянальнасці, прафесіі, узросту, рэлігіі...

Так, традыцыі наладжваць ў Мінску выставы ў адкрытым гарадскім асяроддзі ўжо дзесяць гадоў. Большасць гэтых выстаў прайшло на плошчы Якуба Коласа беларускай сталіцы. Сёння ў экспазіцыі — іншы адрас. Напэўна і таму, што літаральна побач з цяперашняй выставай, усяго ў нейкіх пяці хвілінах хады, знаходзіцца Гарадская галерэя Леаніда Шчамялёва. Вельмі зручна: можна лёгка працягнуць дзіўнае падарожжа па лабірынтах творчасці гэтага найцікавага мастака, пачатае на вулічнай пляцоўцы.

Веніямін **Міхееў**











PLANETABELARUS.BY



# ХАДА ў СТЫЛІ ФЭНТЭЗІ

## Нататкі пра пешае падарожжа, якое ніхто пакуль не паўтарыў

*Працяг. Пачатак ў №2,3,4*

Як жа мы смяяліся раніцай, калі прачнуліся ў вясковай хаце. А Саламея Канстанцінаўна, гаспадыня, аж заходзілася. На яе твары нават слёзы блішчалі. Мы ж яшчэ і няёмкасць адчувалі: так напалохалі жанчыну, якая жыве зусім адна ў аддаленні ад вёскі. "Ой, не магу... Памерці можна... Ручкі склала, нібы моліцца: пусціце ў хату пераначаваць... У капелюшы, як карэйка якая... А я ж яшчэ і гаворку пачала: вы ж чужыя, як жа я вас пушчу... А ён з барадой, наводдаль, у брылі таксама... Чаго не падыходзіць? То, думаю, адчыню, а калі што — то паспею зачыніцца... А яна ж яго Ванем кліча, па-беларуску... Падыдзі, кажа, Ванечка. І ён загаварыў, ды па-нашаму... Не чужыя, відаць... Сабака ж не брахаў..."

Вось такі маналог ад нашай ратавальніцы мы чуем уранні. Прызнаецца: "Такія думкі бегалі ў маёй галаве перад тым, як адкрыць вам дзверы. Страх крычыць: не адчыняй, а сэрца шэпча: дапамажы чалавеку". І ўсё тое бабуля Саламея прагаворвае, ладзячы на стол сняданак: хлеб рэжа, ставіць патэльню з яешняй, слоік з малаком. "А я ж, — выгаворваецца, — усю ноч не спала. Сякеру пад ложак паклала і вачэй не заплюшчыла, пакуль у хаце светла не стала. Гляджу: ён сапе на падлозе, скруціўшыся, а яна ціхенька на ложку спіць, галаву на далоньку паклаўшы. Ну, думаю, дзіва якое, па Беларусі пайшлі. Навошта? Сапраўды мо журналісты... Відаць, такі прайшлі ўчора аж 34 кіламетры, як казалі... Хоць страляй, не прачынаюцца. От мае перапужаюцца, як даведаюцца, што я ноччу дзверы чужым людзям адчыніла..."

У такім добрым і жартаўлівым настроі мы і снедалі, не спяшаючыся. Расказвалі пра сябе: хто такія, адкуль і куды ідзем. Пачаставалі спадарыню Саламею сваёй гарбатай з цукеркамі, распыталі пра жыццё-быццё. Працавала яна раней у паляводстве, цяпер на пенсіі. Карову трымае, куры ёсць. А вёска Леанішкі ўваходзіць у сельсавет Дрысвяты, раён Браслаўскі. Па словах Саламеі Канстанцінаўны, мясцовыя ўсе, нават маленькія дзеці маюць пашпарты, каб прапускалі свабодна за мяжу: Літва зусім побач. Муж яе памёр у 1975-м. Жыць адна прывыкла, дочкі-ўнучкі наведваюць. Прыязджаюць са Снечкуса і Віцебска. Са Снечкуса і на роварах, бывае, у добрае надвор'е, а з Віцебска зрэдку бываюць. А ўзімку жыла, як у крэпасці: ніхто не мог да яе дабрацца. Паштарка хіба зробіць сляды, то па іх да дарогі яна і пройдзе хлеба купіць. Машына-аўталаўка падвозіла, звычайна прыязджае кожны панядзелак, "дык стаю, тупаю — чакаю". Астатняе ж купляе ў Вазгелянцах, гэта за паўтара кіламетра ад яе хаты-хутара...

Слухалі мы гаспадыню хаткі на адзін пакой з сенямі ўважліва, і сэрцы поўніліся вялікай ўдзячнасцю. Як потым гаварылі, кожны думаў і пра тое, ці змаглі б мы вось так познім вечарам адчыніць дзверы незнаёмцам, жывучы на хутары, як наша дабрадзейка.

У дарогу выйшлі амаль у 9 раніцы і цэлую гадзіну, адышоўшы з кіламетр ад хаты Саламеі Шукель, пісалі допісы ў "Чырвонку" і на радыё Алене Сцяпановай. У "ЧЗ" Іван адпрацаваў амаль пяць гадоў, са жніўня 1982 па сакавік 1987-га, у той час было 75-годдзе газеты, то ён з вандроўкі віншаваў супрацоўнікаў рэдакцыі і чытачоў.

Згадвалі-запісвалі, як напярэдадні рухаліся па пракапанай у пагорках дарозе. Было бачна, што капалі нядаўна. Там гліна растрэскалася, і аж плыла па баках-адкосах. Увогуле дарога выдалася цяжкая, брудная, непрыгожая. А вышэй, на пагорку, бярозкі растуць, вока радуюць. І яшчэ вышэй — празрысты блакіт высвечанага сонцам неба.

Зрэшты, зямля — ці ж вінаватая ў сваім брудзе? Аголенасць яе такая пачварная не ўсюды, як было паўз дарогі з Дрысвятаў да Відзаў: там пахадзілі бульдозеры з экскаватарамі, раўлі бензапілы. Калі дарога змярцвела, састарэла, то абнаўляюць яе варта, калі ў тым ёсць патрэба. Але назіраць занябад, разлад, пні ды ламачча з рытвінамі паўз шляху — цяжка. Прыгнятае псіхіку, асабліва нашу, здарожаную і, можна сказаць, вымучаную такой дарогай.

І чаму толькі радыяцыйная небяспека прызнаецца найперш як тое, што разбурае арганізм чалавека і яе ўсе асцерагаюцца? А ёсць жа забружанасць наваколля хімічнымі рэчывамі альбо проста смецце, звалкі, высечкі. Нават непрыгожа ссечанае ці зламанае дрэва, разрытая бязладна і кінутая зямля — і такія "дробязі" ствараюць, як нам падаецца, псіхалагічнае забруджанне. Што ўжо казаць пра шэрыя бязлікія мікрараёны ў гарадах, бяздахія бетонныя каробкі жытла ў пасёлках: мы такіх нямала бачылі ў "Хаджэнні..." А "псіхзабруджваемся" мы чаму? Бо адчуваем, трапляючы ў дысгарманічнае наваколле, дыскамфорт у душы. Часам і самі не заўважаем, але з'яўляецца павышаная нервовасць, мы хутчэй стамляемся, становімся агрэсіўнымі — ці, наадварот, млявымі пафігістамі, у залежнасці ад асаблівасцяў псіхікі. Зрэшты, можна і так сказаць: моцныя арганізмы адаптуюцца да такіх змен у наваколлі. А хто абароніць слабых? Вунь жа і настаўнік Вайцяховіч казаў: вучня са слабай псіхікай да дошкі не варта лішні раз выклікаць. Вось такія развагі выпісалі пасля "негарманічнай" дарогі.


Наша смелая дабрадзейка Саламея Шукель

Зайшлі ў Відзаўскую агульнаадукацыйную школу. У ёй тады вучылася 364 вучні. З 20 па 30 красавіка там праводзіцца дэкада зямлі. Праходзяць конкурсы малюнкаў, насценгазет: 26 красавіка — дзень памяці пра Чарнобыль. Дзеці шпакоўні робяць. Тыдні праз два ў лес пойдуць: высаджваць дрэвы, як зямля падсохне. Такую акцыю школа праводзіць сумесна з лясніцтвам. Уборка тэрыторый — таксама актуальная. Ёсць у нашым падарожным дзённіку круглая пячатка Відзаўскай школы, 4-я па ліку.

Заглянулі мы ў прыгожы, непаўторны па архітэктуры касцёл Святой Тройцы. Гэта, бадай, галоўная славутасць Відзаў. Храм узвялі з чырвонай неатынкаванай цэглы ў 1909-1913 гадах. Высозны: 59 метраў! Вельмі ўражвае. Унутры храма тады працаваў столяр Чэслаў Жураўскі з сынам і майстар Садоўскі. Запісалі: "Прышывалі столь". Разважаем, пішучы нататкі: а якая столь патрэбна была ў касцёле? І прыходзім да высновы: гэта ўжо ім, мясцовым вернікам ды ксяндзам, відней... У касцёле замест падлогі проста былі пакладзены дошкі, усюды будматэрыялы. Людзі папрыносілі з дамоў свае крэслы, але былі на той час там і самаробныя лаўкі.

Відзы — чыстае мястэчка. Ля хат прыбрана, вымецена, усё дагледжана. І марожанае там смачнае: хто туды трапіць, абавязкова пакаштуйце.

Пры дарозе на Казяны, Паставы, непадалёк ад выезду з Відзаў злева, спыняемся ля магілы Тамаша Ваўжэцкага. Пазней удакладнілі: то быў вядомы ўраджэнец Браслаўшчыны, грамадска-палітычны і вайсковы дзеяч ВКЛ, харужы браслаўскі, адзін з кіраўнікоў Паўстання 1794 года пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі.

Бабулі відзаўскія ў нас пыталі: што прадаем. І былі расчараваныя. Вельмі цікаўныя дзеці — у адрозненне ад дарослых. У Відзах, згадваем, ля школы адна жанчына і не павярнула галавы да нас, калі ў двор заходзілі, хоць чула, што на пытанне "хто такія?" адказалі: падарожнікі мы. (Нібыта ў Відзах падарожнікі ў брылях саламяных штодзень бываюць...) А дзеці, выбегшы на вуліцу, абкружылі нас і каляску, проста з усіх бакоў абляпілі. Шчабяталі як птушкі ўвесну: вось бы і нам з вамі... Яшчэ вельмі цікавіліся, як змайстравана каляска. І здзіўляліся, што мы ўжо столькі прайшлі пешшу.

Толькі цяпер усё часцей мы гаворым пра тое, як важна з гадамі не згубіць цікаўнасць да жыцця, да людзей, да ўсяго, што адбываецца навокал. І адзін да аднаго. Як прыкра бывае бачыць, калі сужонкам у сталым узросце нецікава разам, няма пра што гаварыць.

Пасля Відзаў, у беларуска-літоўскім прымежжы, істотна змяніліся краявіды. Палі тут разараныя, шырокія, па іх амаль не відаць кустоўя і хмызоў, як тое было раней. Дарога яшчэ шырэйшая, чым на Карасіна, гравійка падсохлая. Пыліць. Абедалі пры дарозе.

Усюды па дарозе вяскоўцы ды мястэчкоўцы, нават гараджане працуюць з дровамі. Напэўна, узімку нарыхтавалі, а цяпер пілуюць, колюць: бо цёпла працаваць і яшчэ калоды не ўсохлі. Ды і працы іншай няма — гароды пакуль не ўскопваюць, зямлю не аруць. Пасля Відзаў толькі сям-там відаць снег, так што вясна ўжо прыйшла канчаткова.

У бабулі Саламеі, успомнілася, у двары было шмат птушак, спявалі шпачкі. А сабака яе не брахаў, а падлашчваўся да нас. Уранні дык зусім

скакаў ад радасці. Так бы мовіць, пусцілі іх начаваць — значыць, свае. Разумны!

Яшчэ згадка. Спадарыня Саламея, як і жанчыны ля Відзаўскай школы, пыталі: ці плацяць нам за тое, што пайшлі абыходзіць Беларусь. І здзіўляліся, што не. У людзей чамусьці ёсць упэўненасць, што за такую нялёгкую працу нехта ж павінен плаціць.

Праходзім вёску Ждэгелі: тут прыветлівыя людзі. Самі з намі вітаюцца. І назва вёскі нам спадабалася, яна з нейкім беларускім жартаўлівым водарам. Часам у вандроўцы мы і пазней, у добрым настроі, прамаўлялі сакавітае слоўца, трохі адрознае ад афіцыйнай назвы: Жджэглі...

У вёсцы Трэйбшы куплялі малако. І былі зачараваныя такой карцінкай: дзед з бабуляй сядзяць у промнях сонца, што заходзіць, абодва ў добрым настроі перабіраюць буракі. А вушы ў яго вялізныя — нібы ў Буды, і на сонцы прасвечваюць. Такі цуд! Нам дзядуля расказвае: любіў ён граць на скрыпачцы па маладосці. Ды і ў сталым узросце граў. Часам і цяпер іграе, "але ўжэ менш". А ў жонкі яго ўсмешка добрая, светлая, гаворка з гумарам. Кажа: "Як прынясе з вяселля завязана — а там і яды, і грошай, то ўвесь вечар лічу. Добра было! Граў на слых, можа падстроіцца пад любую музыку. Цяпер унучка грае на баяне, а сыноў няма — то няма й каму перадаць скрыпачку". А яна ж у дзеда ладная. І музыку ён, відаць, па-ранейшаму любіць. Цяпер, кажуць нам, у вёсцы радыёкропкі зліквідавалі — выдалі прыёмнікі, што працуюць ад электрычнасці. Добра цягне і Літву. Дзед светла ўсміхаецца:"Дык як у прыёмніку зайграе — то, хоць і стары, але хочацца стограмовачку кульнуць ды ў скокі".

Добрыя нашы знаёмыя прапаноўвалі нам і пераначаваць, і пагасцяваць, але мы ідзем далей. Мы ў дарозе, ды і цяпер, расказваючы пра сустрэчы ў "Хаджэнні...", з цеплынёй згадваем і бабулю, і яе дзеда-музыку з вушамі Буды. І помніцца той цёплы сонечны вечар з яго вясновым водарам, калі завіталі мы да светлых вяскоўцаў на падворак. Сапраўды, калі яркае ўражанне ад людзей — памяць лёгка зберагае і нейкія дэталі праз гады.

Цераз рэчку Дзісну, калі глянуць управа ад дарогі, бачная і тэрыторыя Літва. Вада вясновая разлілася вельмі шырока. Фіксуем у дзённіку, што Валя, п'ючы малако, убачыла пры дарозе ўжо 30-га бусла. Відаць нам і нейкі горад літоўскі за рэчкаю, трубы высокія і шматпавярховыя дамы. Можа, глядзім цяпер карту, то была Ігналіна?

Рабілі невялікі перадых пры вадзе. Бачылі ў канаве шчучку можа з локаць, а ў сухой траве нешта юркнула: ці то змейка маленькая, ці то яшчарка. І вуж высунуўся з травы, падняў невялічкую галаву з жоўтымі адмецінамі ды затрымаўся ля нас.



RU.WIKIPEDIA.ORG

Касцёл Святой Тройцы ў Відзах

Праходзілі ўжо вечарам праз вёску Бучаны, там хлопчыкі кармілі лебедзя ў мясцовай сажалцы. Ён, казалі, жыў там і летась, і нядаўна з выраю прыляцеў. А мы сустрэлі пару лебедзяў і ля Казянаў, Валя іх карміла.

Начавалі на гэты раз у Казянскай сярэдняй школе. Яе дырэктар — Генрых Францавіч Абаровіч. Школе ў 1995-м было 100 гадоў, найстарэйшая ў Браслаўскім раёне. А раней царкоўна-прыхадская была. 126 дзяцей, 20 настаўнікаў. На восень, казаў дырэктар, будзе 145 дзяцей. Паступаюць у розныя ВНУ — "узровень ведаў высокі даецца". Раніцай Валя запісвае у дзённіку:

"Дзень шосты. Ад пачатку хады пройдзена 140 км. Учора ад хаты бабкі Саламеі прайшлі 35 км. Заначавалі ў Казянах у школе. Раніца цудоўная. Сонейка дасылае сваю літасць зямлі і нам. Спакоўваем рэчы. На школьнае падвор'е збіраюцца дзеці. 8.30. Твары ў іх светлыя, адкрытыя. У вачах зацікаўленасць: хто такія, адкуль.

А вечарам да школы суправаджаў нас мужчына-карлік з дачкою Аксанаю, шасцікласніцаю. Ідучы, мы запавольвалі ходу, каб ён паспяваў за намі. Вёў да дырэктара гасцей з ахвотаю і ўсё смяяўся, што ніколі такога не бачыў. А "такое" — гэта, вядома ж, мы. Віктар (так яго завуць) сказаў: вось толькі мне засталося з вамі ісці падарожнічаць. З'ява тыповая. Асабліва яскрава такое адлюстравана ў мастацкіх кінафільмах, дзе ідзе аповед пра вандроўны цырк, дзе сярод цыркачоў-падарожнікаў ёсць і карлік — добры, паслужлівы. Ну а нас, пэўна ж, успрымалі б у тым цырку як блазнаў, гэта значыць клоўнаў. Дарэчы, такую назву мы пра сябе ў Казянах і пачулі... Віктар вечарам сказаў нам, што дзеці, якія стаялі побач з ім і ягоным сябрам, угледзеўшы нас прыцемкамі на вясковай вуліцы, так і сказалі: тата, гэта, пэўна, ідуць клоўны...

Кім толькі нас потым ні называць! Яшчэ не раз клоўнамі, афраазіятамі, бамжамі, карабейнікамі, "з неба зваліліся"... Але што цікава, усе тыя мянушкі гучалі з вуснаў людзей някрыўдліва, добразычліва.

Ініцыятарам стварэння школы ў Казянах быў Андрэй Кандратавіч Жыгалка. Ён сам асвоіў грамату, арыфметыку, калі служыў у войску. Шмат можа зрабіць нават адзін мэтанакіраваны чалавек: вось і школа з яго ідэі вырасла, і цяпер пра яго памятаюць.

Тры рэчкі цякуць ля Казянаў (а сустрэчны дзед казаў нам мякка, і пэўна ж у мясцовай традыцыі: Казяні) —

гэта Дрысьвятка (нават на мясцовай шыльдзе пры рэчцы назва напісана з мяккім знакам), Дрыса і Бірвіта. І зусім жа няшмат паселішчаў такіх сустрэнеш нават у азёрна-рачной Беларусі — каб пры іх ажно тры рэчкі!

Выйшаўшы за ваколіцу, бачылі прыгожую карціну: дзве дзікія казы з белымі задкамі беглі ад нас уздоўж рэчкі, было відаць у падзорную трубу добра. Так што назва паселішча, па ўсёй бачнасці, ад гэтых жывёлін паходзіць. Мы жартавалі: можа ў іх там недзе "вялікае гняздо"...

Перад Паставамі спыняемся, каб паабедаць у ляску злева ад дарогі. Нават засынаем хвілін на 10. Надвор'е проста шапоча пра цуд быцця. Вабюджэт не дазваляе. Гасцініцы проста выключаюцца — як нефармат — з нашых планаў на бліжэйшыя месяцы, як і ўсялякія пад'ездкі на чым бы там ні было. Самі разумееце: "Хаджэнне ў трыдзясятае царства"... Фэнтэзі... Вось калі б якая бабуля з мятлой і ступай прапанавала пераначаваць у сваёй хатцы на курыных нагах — пэўна ж, мы падумалі б і пагадзіліся. Але такую экзотыку мы за чатыры месяцы ў нашым царстве не сустрэлі.

Да Алеся Касценя мы не ідзем, бо па дарозе трапляем у школу-інтэрнат для дзяцей-сірот, накшталт дзіцячага дома. Толькі заходзім на яго тэрыторыю — і дзеці як шалёныя кідаюцца да нас...

фонды, якія дапамагалі вывозіць дзяцей на аздараўленне за мяжу: маленькія беларусы жылі ў сем'ях у Італіі, Іспаніі, Англіі, Германіі, Францыі, нават ЗША. І Паставы трапілі ў кола тае дабрачыннасці. Мы гутарылі з Таццянай Клімята — галоўнай выхавальніцай, Валянцінай Друзік — дырэктаркай і Валянцінай, медсястрой.

Расказваюць: "Італьянцы ім цяпер як бацькі, а пра сваіх дзеці забыліся. Гэтая школа лічыцца нармальнай, базавай. А як мы ставімся да таго, што ў жыцці дзяцей-сірот з Пастаў з'явілася Італія? З аднаго боку — гэта цудоўна, бо пашыраецца кругагляд дзяцей. Там іх апранулі, абкружылі ўвагай, цяплом. Арганізацыяй паездак дзяцей у


Школа-інтэрнат у Паставах


Развітанне з выхаванцамі

кол —ні душы. Над намі высока кружыць бусел ці то воран. Адпачывай, не адпачывай, а рухацца трэба. Затрымліваемся на мосце, перакінутым цераз рэчку Мядзелку, за ёй — Паставы. Праходзім праз прыгожы, чысты сасновы бор ля Паставаў. Яшчэ не ведаем, дзе будзем начаваць. Азерцы мясцовыя часткова ўжо адкрыліся ад лёду.

У пошуках начлегу ў Паставах запісваем у дзённік тэлефоны. Рэдактар райгазеты Пётр Пятровіч Курыловіч раіць звярнуцца да Алеся Касценя, уласнага карэспандэнта газеты "Звязда", які жыве па вуліцы 17 верасня. І міліцыянеры, пабачыўшы нас у цэнтры гарадка, цікавяцца, хто мы. Расказваем.

Небяспечна ж нам, аднак, заходзіць у мястэчкі-гарады, дзе ёсць гасцініцы. Там у людзей ці ў школе начлегу не папросіш. А спыняцца ў такіх камфортных умовах не толькі наш вандроўны

Начуем у мясцовым медпункце на тэрыторыі школы-інтэрната: у так званым ізалятары на койках. Добра, што ніхто ў тую ноч не захварэў. Толькі раніцай знаёмімся з дзяўчынкай Аксанай: яна ў суседнім пакоі ў ізалятары ляжыць. У яе боль у жываце. Паказвае нам "дзе" баліць, з большай ахвотай свае фламастары італьянскія, ручку, плэер і тое-сёе з рэчаў. Кажа, што яе мама і тата ў турме. Сама з Лепеля, сястрычка ёсць. Мы пажадалі Аксане хуткага выздараўлення.

Дзеці тут кажуць: "У нас в Италии... Я итальянец..." Спачатку мы не зразумелі, чаму. Такое ўражанне, што на шляху ў трыдзясятае царства мы недзе няправільна павярнулі. Ці то ў іх галовах нешта не так павернута? А можа гульня такая... Але ўсё аказалася проста. Гэтай школе дапамагаюць італьянцы. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС у Беларусі сталі з'яўляцца

Італію займаецца Фонд гуманітарнай дапамогі "Крыніца", што ў Мінску. Ёсць там Тамара Шчукіна, займаецца гэтымі пытаннямі. У мінулым годзе (1990 год. — **Аўт.**) адправілі 110 чалавек, сёлета — 80. На лета ізноў едуць. Усё б добра, але ж калі дзеці сюды вяртаюцца, то робяцца непаслухмянымі. Нават кажуць на беларускую мову: "Это деревенская мова, а я — итальянец". І з гордасцю ўжываюць італьянскія словы. "Si, Si!" — "Ну, ну!", "Prego!" — "Пачакай!", "Бонсера!" — "Добры вечар!" А выхавальніцы часам ім, калі не слухаюцца, прамаўляюць: "Я цябе зараз як адпрэгаю!" Пасля паездак у Італію з імі вельмі цяжка.

Цяпер італьянцы ў інтэрнат прыязджаюць часта. Вельмі хочуць тых дзяцей, якія ў іх гасцявалі, усынавіць. Праўда, не так хутка яно вырашаецца. Тым часам дзеці лічаць італьянцаў сваімі бацькамі. У асноўным яны "за-

мкнёныя". Нядаўна прывезлі ў інтэрнат дзвюх брудных дзяўчынак — яны "ў бягах" былі, з інтэрната дадому збеглі. Вядома, ёсць сярод іх, хто, вырастаючы, і сем'і добрыя стварае, і працу прыстойную мае. Але не ўсе. У многім залежыць, якая кампанія ім па жыцці патрапіць. На кожны клас у інтэрнаце ёсць выхавальнік, старшы выхавальнік, у малодшых дзяцей — няні. Раней адна няня была на тры паверхі. У інтэрнаце ёсць музычны цэнтр, ладзяцца дыскатэкі. Дзецям казённае адзенне выдаецца. А з Італіі яны прывозяць плэеры і джынсы".

Нам расказвалі: усе тут сіроты ці "сацыяльныя сіроты" — пры жывых бацьках, якія пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Хтосьці трагічна страціў родных людзей, у кагосьці яны памерлі, а каго і забілі... Па 10 гадоў дзеці жывуць у інтэрнаце. Потым іх уладкоўваюць у прафесійна-тэхнічныя вучылішчы.

Псіхіка у такіх дзяцей вельмі тонкая, яны ранімыя. Падыход патрэбен індывідуальны. Размовы прыватныя тут — кожны дзень. Інакш працаваць, гавораць субяседніцы, проста нельга: трэба быць увесь час асцярожным, як з порахам. І з першага класа ідзе прафарыентацыя. У інтэрнаце ёсць гурткі, дзяўчынкі там вучацца шыць.У 5-6 класах ладзяцца экскурсіі на хлебазавод, малаказавод, у сталовую — туды, дзе можна будзе ім у будучыні знайсці працоўнае месца". Спортам таксама тут займаюцца, ёсць і прадметныя гурткі — усе дзеці ў іх па інтарэсам. Прафесіі пасля школы-інтэрната: повар, трактарыст, кандытар і іншыя. Некаторыя выхаванцы рыхтуюцца паступаць у інстытуты. Ёсць такія, каго ўсынавілі ў Беларусі. У інтэрнаце ёсць сваё поле, свінні. Кабыла Алеся. Яе неяк цыган украў. Дзеці пайшлі ўсе шукаць, ноччу. І клікалі: "Алеся! Алеся!" Кабыла і адазвалася. А хаваў яе цыган у разбураным доме. Спонсараў у дома-інтэрната няма. А дапамога патрэбная. Напрыклад, каб шпалеры ў пакоях паклеіць. Шмат залежыць ад фінансаў. Калгас выпісаў газеты. Праводзяцца "інфармацыйны дзень", "класныя гадзіны, "урокі маральнасці" ды іншае".

Яшчэ нам расказвалі: "Гэты дом так званы — Дом казённы. Усё тут па званку. Класы па 30 чалавек. Па 15-20 чалавек у групе. Спальні па 8-10 чалавек. Сабакі, каты бадзяжныя — усе ў школе. Дзеці бяруць сабаку ў лазню, памыюць яго там. Але нашы выхаванцы моцныя, хварэюць менш у параўнанні з "дамашнімі". З Пастаўскага раёна ў інтэрнаце 25 вучняў. Прыбывае ў сярэднім адзін чалавек на тыдзень, і ёсць тэндэнцыя да павелічэння колькасці насельнікаў. У нас дзеці не плачуць: адаптацыя ідзе хутка".

Нагадаем: гэта пагружэнне ў 1996 год. Зрэз тае рэальнасці. Праводзіць нас з інтэрната выхавацель Арнольд Пляшкун. І паказвае кірунак нашай дарогі: на Камаі. Калі выходзілі з інтэрната, сфатаграфаваліся з дзецьмі і Таццянай Клімята на памяць. Вучань другога класа Лёша Літоўка нават прачытаў верш "Я — беларус", а хлопчык Сцяпан Міхайлоўскі аддаў свой коржык са словамі "Это вам от сердца..." Расчуліў да слёз...

На развітанне мы запыталі ў новых знаёмых: "Што такое трыдзесятае царства?" І пачулі: "Гэта шчасце... дзе няма зла...там толькі дабро". " І яшчэ пытанне ад нас: "А што такое шчасце?" Адказ: "Шчасце — гэта радасць... калі дружна жывуць... любяць адзін другога". Пасля пагаварылі з імі пра тое, што лепш імкнуцца жыць па законе любові, па законе сумлення. Што любое выпрабаванне ў нашым свеце можна разглядваць як прыступку, каб падняцца вышэй. Што шчасце, радасць трэба шукаць найперш унутры сябе самога, у сэрцы сваім — а не ў Італіі ды іншых месцах. Часам і дыдактыка патрэбная, а то будуць у Паставах бегаць светлавалосыя італьянцы.

Выйшлі ў дарогу ў 11.30. Пройдзена ад пачатку 170 км, за мінулы дзень — 30 км. А сёння наперадзе, да Камаяў, кіламетраў 20.

Паводле слоў Арнольда Пляшкуна, у Паставах мала што было разбурана ў вайну. Запісалі з яго слоў: "Цяпер тут высокі ўзровень беспрацоўя, затрымкі зарплаты. Але многія гандлююць — ездзяць у Літву, бо мяжа практычна адкрытая: усіх пагранічнікаў гандляры ведаюць. Пяройдзеш — а там на аўтобус, і едзь куды хочаш. Зямлі можна таксама браць, але добрую, вядома ж, калгасы не раздаюць. Ваенныя з'ехалі з ваенных гарадкоў, там засталіся верталёты пагранічныя, але старыя. Маглі б выкарыстоўваць мясцовы аэрадром для транспарціроўкі грузаў для Прыбалтыкі, а ён можа і "Боінгі" прымаць. Ды няма разваротлівасці, каб здаць яго ў арэнду".



Жартаўлівы абрад свята народзінаў новага чалавека

Па дарозе на Камаі злева "аб'ект Малая рэчка" — нешта накшталт бункера. Можа з вайны?

У абед нас пасяваў верталёт. Нізка праляцеў. Пэўна, такім чынам на палі ўносілі нейкія мінеральныя ўдабрэнні. Жартуем: можа, і мы цяпер прарасцем...

Знайшлі пры дарозе блакітныя першацветы. Сустрэлі двух хлопчыкаў, гадоў ім па 6-8. Яны хадзілі глядзець на верталёт, прычым далёка ад Камаяў. Самастойныя!

Мясцовасць, праз якую ідзем, ужо ўзгорыстая, пагоркі не вельмі крутыя. У абед пісалі пісьмы, падпісвалі паштоўкі. Стаялі амаль тры гадзіны. Дае знаць стома, а Валя кажа, што гэтага не знае... Ёй нават цяжка гаварыць пра свой стан. Іван запісвае яе адчуванні: "У Валі няма сіл, каб нават сказаць, што стамілася, ёй хочацца паляжаць, уткнуўшыся ў што-небудзь цёплае". Пазней яна запіша: "І гэта было шчасце...". Вось і зразумей: ці то стома, ці то шчасце...

Нас у Камаях сустрэлі смехам. Чулася здалёк: "Гэта як іншапланецяне. Ці можа якія бапцісты?" Жанчына адна вельмі расчулілася. Але ўсе смяюцца! Кажуць, у горадзе сказалі б пра такіх: дурні ці што? І мы смяяліся таксама. І гэта было весела.

Вера ў Камаях каталіцкая. Едуць на святы на пакланенне да Маткі Боскай Будслаўскай, у мястэчка Будслаў.

У той вечар нам дапамог вызначыцца на начлег у Камайскай школе мясцовы настаўнік і паэт Аркадзь Нафрановіч — ён Іванаў знаёмы: бачыліся яны ў "Родным слове", там яго вершы друкаваліся. Мы і гасцявалі ў яго дома, ён з жонкай нас вячэрай частаваў. А начавалі ў школьным спартзале. А ў адным з класаў — ці ў спецыяльным пакоі? —дзяжурыла Яніна Сівіцкая, начны вартаўнік школы. Уранні бабуля малілася ў школе па-польску, гледзячы да сонца. Нам сказала: "Адна на свеце засталася. Сястра нядаўна памерла". Бабка Яніна шмат вышывае. І з добрым густам: паказвала нам вышыты настольнік. Расказвала, што ў Будславе бывала, што там вельмі прыгожа.



Сустрэча з настаўнікам-ветэранам Іосіфам Быхаўцом у Лынтупах

У Камаях мы сустрэлі вялікую грамаду. Там бытуе абрад: калі спраўляюць народзіны дзіцяці, то бабулю і дзядулю на возе "вязуць тапіць". Вяскоўцы "памочаць іх у рэчцы ці сажалцы", а яны ўсіх частуюць. Так, расказвалі нам, адпраўляюцца мясцовыя хрэсьбіны. Вельмі яскравыя два кадры Іван паспеў зрабіць у часе таго абраду. Хоць і чорна-белыя, але атмасферу, каларыт народнага звычаю перадаюць. А ці "возяць тапіць" старэйшых родзічаў у Камаях і цяпер, калі ў сям'і з'яўляюцца новыя? Магчыма, у абрадзе ў жартаўлівым выглядзе зафіксавана ідэя пра тое, што старым не трэба доўга затрымлівацца ў гэтым свеце, калі сваю "місію" выканалі. А што кажуць на гэты конт этнографы? Варта паглядзець... І яшчэ: каго ж хрысцілі ў той дзень? Той чалавек у 2013-м, калі "расшыфроўваўся" дзённік, можа, і школу ўжо закончыў... А ў 2021-м яму ўжо 25...

Нас цікавіць душэўна-псіхалагічны стан народа. Хай сабе і крыху пафасна гучыць, але нарэшце сфармулявалася ў словах, што нам важна даследаваць і назіраць у часе "Хаджэння..." Цытуем: "Запісы дзённікавыя адметныя і тым, што гэта "зрэз" таго самага душэўна-псіхалагічнага стану людзей з глыбінкі праз 5 гадоў пасля развалу Саюза, калі застаецца і разгубленасць перад жыццём, чаканне ад дзяржавы нейкай падмогі"...

Аркадзь Нафрановіч расказаў нам пра жыццё-быццё ў Камаях: "Старшыня калгаса абрэзаў цёплую ваду ад мясцовых дамоў-муравейнікаў. Цяпер кожны гаспадар у сваёй кватэры самастойна ставіць тэн, выводзіць на дах трубу, нарыхтоўвае сабе дровы..." Кажа яшчэ, што гэта ўсё з-за палітыкі. Бо прагаласавалі тут не за Кебіча, а за Лукашэнку...

Дзень восьмы. Першы раз учора не выканалі план па хадзе. Пераадолелі толькі 14 км.

Выходзім з мястэчка Камаі ў 9.00. У школе, дзе начавалі, 205 дзяцей, 23 настаўнікі. Дырэктар — Генадзь Рамбальскі. У дзённіку пастаўлена пячатка школы. Чытаецца дрэнна, але ў цэнтры — герб БССР, яшчэ савецкага часу.

Ля Паставаў была плоская, роўная, без звілінаў зямля. Ісці лёгка. Заўважаем 38-га бусла. Валя здзіўляецца: як бусел можа жыць на воданапорнай вежы, а не на дрэве. А гэта ж звычайная справа. Рэльеф пры дарозе змяняецца на ўзгорысты. Бачылі ястрабаў і яшчэ нейкіх даўгадзюбых птушак. Можа тое вальдшнэпы?... У гэты дзень Іван напіша прыгожы верш "Дарога між пагоркаў і лагчын".

Ідучы праз Лынтупы, затрымаліся у настаўніка-ветэрана Іосіфа Быхаўца. Ён паказаў сваю кніжку "Гарадок на ўзмежжы" — пра Лынтупы і наваколле. Адрас ведалі прыкладны (з яго публікацый у "Родным слове"), ды і ў людзей распыталі. Спадар Іосіф быў на двары з любімым сабакам і здзіўляўся, як гэта ён да Валі лашчыцца — звычайна ж на чужых брэша. Расказваў пра кнігу: "Даступная для ўсіх. Я і пісаў, каб людзі чыталі. І школа ўзяла больш чым 300 экзэмпляраў".

За гэты дзень наверсталі кіламетры, прайшлі аж 33. Пераначавалі ў лесе — адкрылі лясны сезон! — справа ад дарогі непадалёк ад вёскі Ігнацішкі (ад Лынтупаў прыкладна 4 км). Уночы на небе былі прыгожыя месяц і зорка Венера. — Валя кажа: "Як пейзаж!" (у сэнсе — прыгожа, як на карціне). Квакалі паблізу ў балотцы жабкі — а гук такі, нібы недзе далёка гудуць гоначныя матацыклы ці закіпае вада ў кацялку.

Валянціна і Іван **Ждановічы.**

Фота аўтараў.

# УПЕРШЫНЮ НА КІТАЙСКАЙ МОВЕ




Сюэ Цзінцянь, вучань гімназіі №29

Часопіс "Беларусь. Belarus", бадай — першая пляцоўка сучаснага часу, дзе пачалі друкаваць кітайскія пераклады беларускіх твораў для дзетак. Знакава, што спачатку звярнуліся да класікі — казкі Уладзіміра Караткевіча "Чортаў скарб". Затым з'явіліся пераклады казак "Пік-Пік і Пепіта на паляванні" Людмілы Рублеўскай і "Шчаслівая кніга" Кацярыны Хадасевіч-Лісавой. Перакладчыкам выступіў студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Сунь Фаньцы, а ініцыятарам праекта — папулярызатар беларуска-кітайскіх літаратурных стасункаў, дырэктар — галоўны рэдактар выдавецкага дома "Звязда" Алесь Карлюкевіч. Для сённяшняга нумара мы падрыхтавалі падборку дзіцячых вершаў беларускіх мэтраў — Янкі Журбы, Аўяр'яна Дзеружынскага, Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Караткевіча і Васіля Віткі. Гэта першая спроба перакладу беларускай дзіцячай паэзіі на кітайскую мову. Вершы пераклаў дзевяцігадовы хлапчук Сюэ Цзінцянь, вучань мінскай гімназіі №29.

Кітайскі чытач амаль незнаёмы з беларускай дзіцячай літаратурай, бо беларускіх твораў для дзяцей і падлеткаў на кітайскую мову было перакладзена зусім няшмат.

У пяцідзясятыя гады XX ст. — "залаты век" у савецка-кітайскіх адносінах, калі назіраўся сапраўдны ўздым цікаўнасці да савецкай літаратуры, на кітайскую мову былі перакладзены дзіцячыя апавяданні і аповесці Янкі Маўра і Івана Шамякіна.

У 1953 годзе ў выдавецтве "Шаонянь эртун чубаньшэ" адзіным зборнікам пад назвай "Маленькі партызан" былі надрукаваны пяць апавяданняў Янкі Маўра: "Сям'я", "На крызе", "Максімка", "Запіска" (на кітайскую мову назву апавядання пераклалі як "Маленькі партызан", адсюль і назва зборніка) і "Падарожжа вакол дома". Перакладчыкам пазначаны Дзін Жу.

Да маўраўскіх "Палескіх рабінзонаў" і "ТВТ" маленькі кітайскі чытач упершыню далучыўся таксама ў 1950-я гг. Кітайскія пераклады аповесцяў былі надрукаваны асобнымі кнігамі таксама ў выдавецтве "Шаонянь эртун чубаньшэ": "Палескія рабінзоны" (пад назвай "Два маленькія рабінзоны") у 1956 годзе, "ТВТ" (пад назвай "Неверагоднае таварыства") у 1957 годзе. Перакладчыкам абедзвюх аповесцяў выступіў Ван Вэнь.

Выбар твораў Янкі Маўра для перакладу на кітайскую мову падаецца натуральным. І "Палескія рабінзоны", і "ТВТ" былі своеасаблівымі зорнымі прыкладамі не толькі ў межах беларускай літаратурнай прасторы, а таксама і па ўсім Савецкім саюзе. "ТВТ" атрымала першую прэмію на ўсебеларускім конкурсе дзіцячай кнігі, і аповесцю зацікавіўся Максім Горкі. Па яго просьбе Маўр тэрмінова пераклаў рукапіс аповесці на рускую мову і выслаў яму. Гэта было напярэдадні І з'езда пісьменнікаў СССР, і Самуіл Маршак у сваім дакладзе "Аб вялікай літаратуры для маленькіх" сярод іншых адзначыў і "значную школьную аповесць, напісаную ў Беларусі".

Івана Шамякіна на кітайскую мову перакладалі звышактыўна: "Шлюбная ноч", "Снежныя зімы", "Атланты і карыятыды", "Глыбокая плынь", "Гандлярка і паэт", "Непаўторная вясна", "Сэрца на далоні" ды іншыя. Аднак гэтыя творы на кітайскай мове з'явіліся ўжо ў 1970-90-я гг. А вось у 1950-я на кітайскай мове надрукавалі асобнай кнігай яго пяць дзіцячых апавяданняў: "У Маскву", "Наташа", "Хлопчык з-за акіяна", "Падарунак праваднру" і "У снежнай пустыні". Зборнік пабачыў свет ў знаёмым нам выдавецтве "Шаонянь эртун чубаньшэ".

Пасля амаль пяцідзесяцігадовага зацішку, у 2000-х гг. адбылося некалькі перавыданняў з Янкі Маўра. І на гэтым зноў цішыня. Таму праект часопіса "Беларусь" — у пэўнай ступені паказчык адраджэння цікавасці да перакладаў твораў беларускай літаратуры на кітайскую мову.

Паэтычную падборку да гэтага нумара пераклаў Сюэ Цзінцянь. Ён вучыцца ў трэцім класе. Упершыню Цзінцянь сутыкнуўся з беларускай літаратурай на ўроках, і адразу ўсвядоміў, наколькі адрозніваюцца выразныя сродкі ў беларускіх і кітайскіх вершах. Тады ён паспрабаваў сам перакласці некалькі вершаў. "Працэс перакладу дапамог мне ўбачыць прыгажосць нашых моў, таксама кожны перакладзены верш дорыць мне адчуванне дасягнення, радасць ад завершанай працы", — кажа Сюэ Цзінцянь. Літаратурным рэдактарам перакладаў Сюэ Цзінцяня выступіў Сунь Фаньцы.

Вераніка **Карлюкевіч**

Уладзімір Караткевіч

## *Як размаўляюць звяры і птушкі*

*Закаханы ў жыццё і ў кожную мушку,*
*Я іду каля хат і росных садоў.*
*І са мной размаўляюць звяры і птушкі*
*На дзесятках і тысячах розных моў.*
*Ў валасы мае вішні свой снег завеялі,*
*Мне на вуха шэпчуць абшары ніў;*
*Маўляў, каго любіш, таго заўжды зразумееш,*
*У якой бы скуры ён ні хадзіў.*
*Галубы ў ліловых і сініх барвах,*
*На мяне паглядзеўшы, вуркочуць так:*
*— «Пр-роста вар-рвар, варвар,*
*стр-рашэнны варвар.*
*Крыл ня мае, а кр-рочыць, крочыць, дзівак».*
*Певень, палкай падбіты, скача, як конік,*
*І здзіўленым курам, як зрынуты бог,*
*Утрапёна крычыць ад болю і гонару:*
*— «Не па-паў! Не па-паў! Міма ног! Мі-ма ног!»*
*Калі ж ноч паплыве над зямлёю мілаю,*
*Размаўляюць дзве жабы ля соннай ракі:*
*— «Ку-ума, кума, а што ты вячэраць варыла?»*
*— «Боршч, боршч, буракі, бура-кі-кі-кі-кі».*
*Я, напэўна, таксама здаюся ім зверам,*
*І яны разважаюць у засені траў:*
*— «Вось ідзе двухногая птушка бязь пер'яў*
*Ці мядзведзь, што шубу ў ламбард заклаў».*



弗拉基米尔 科罗特克维奇
动物和鸟儿如何说话

带着对生命和每一只昆虫的迷恋，
我走过小屋和挂满露珠的花园。
动物和鸟儿
用成千上万种语言与我交谈。
樱桃花像雪片一样飘落，
田野上的麦浪在我耳边低语；
只要你爱，就能听懂，
无论它是哪种动物。
比如青紫色的鸽子，
冲着我，这样咆哮：
-"野人，野人，可怕的野人。
没有翅膀，一瘸一拐，就是个怪物"。
一只公鸡被棍子打到，像蚂蚱一样到处乱跳，
就像是被废黜的上帝似的，对那些傻眼的鸡，
执着的尖叫：
-"没打着，没打着，就是没打着！"
当夜幕降临在甜美的土地上，
青蛙在昏昏欲睡的河边交谈：
-"库玛，库玛，你做了什么晚餐？"
-"有美味的罗宋汤，和好吃的甜菜梆"。
在他们看来，或许我也像野兽，
他们在草荫下也许正这样想：
-"这是一只没长羽毛的鸟
也或者是一只当掉皮大衣的熊"。

Рыгор Барадулін

## «Уцякала зіма ад вясны...»

*Уцякала зіма ад вясны*
*Па кустах вербалозаў рагатых, —*
*Ёй каптан абарвалі яны,*
*І на голлі матляецца вата.*
*Уцякала зіма ад вясны,*
*Уцякала па рэках, азёрах,*
*Лёд затрэскаў, закрэктаў, заныў,*
*Здрадзіў лёд —*
*і вада на прасторы.*
*Толькі звон крыгалому ачах —*
*Брод шукаюць бярозы-бяглянкі*
*І трымаюць на ніцых плячах,*
*Як дзяцей палахлівых, буслянкі.*
*А вясна даганяла зіму;*
*Заяц скочыў у лужу блакіту,*
*Бо на хвост наступіла яму,*
*І пралескі распырскаў, раскідаў.*
*І ўцякала зіма ад вясны,*
*Пад нагамі ламачча затлела,*
*Парастрэсла па сцежках лясных*
*Снег апошні свой з ландышаў белых.*
*Уцякала зіма ад вясны — уцякала...*

雷格尔 巴拉杜林
冬天离春天而去. . .

冬天已经离春天远去
枝枝杈杈的马鞭草灌木丛，
刮开了冬天棉衣的一角，
棉花撒落在大门前。冬天离春天远去，
沿着河流、湖泊而去，
浮冰慢慢开裂，吱吱作响，
遭到背叛的冰—
如今是一望无际的水。
当破冰声归于平静—
逃难的白桦树开始寻找浅滩，
它们用自己脆弱的肩，
像惊恐的孩童，
托着大雁的鸟巢。
春天在追赶冬天；
野兔跳进倒映着蓝天的水洼，
就像是春天踩到了它的尾巴，
它碰散了，扬起了雪莲的花。
冬天离春天远去，
脚下踩着从雪里露头的枝杈，
它沿着林间的路挥霍最后的年华那最后的积雪
仿佛是来自山谷的百合花。
冬天离春天远去—
远去. . . . . .

Янка Журба

## Першыя сняжынкі

*Лётаюць, сыплюцца*
*Зоркі-сняжынкі —*
*Белыя, лёгкія,*
*Быццам пушынкі.*
*Роўна так сцелюцца*
*Ў вёсцы і ў полі,*
*Круцяцца, кружацца*
*Ціха, паволі.*
*Лётаюць, сыплюцца*
*Снежныя зоркі...*
*Будзем на саначках*
*Ездзіць мы з горкі.*

初雪
杨卡 朱尔巴
飞舞着，飘落下，
星星点点的雪花—
洁白而轻盈，
仿佛鹅毛一般。
在村庄和田野上，
漫延开来，
旋转着，旋转着，
宁静而缓慢。
飞舞着，飘落下，
晶莹的雪花……
我们坐上雪橇，
从山上滑下。

Авяр’ян Дзеружынскі

## *Настаўніца*

*У мяне ёсць лялька Маша,*
*У мяне ёсць лялька Даша*
*І Наташа ёсць таксама.*
*Я для іх ужо не мама,*
*Я настаўніца для іх —*
*Першакласнічкаў маіх.*
*Лялькі па складах чытаюць,*
*І малююць, і спяваюць.*
*Мне з-за гэтай дзетвары*
*Не да гульняў у двары.*

老师
阿弗里扬 哲鲁辛斯基

我有一个布娃娃叫玛莎，
还有一个布娃娃叫嗒莎，
娜塔莎也是我的布娃娃。
如今我不再是她们的妈妈，
而成为了她们的老师—
她们是我的学生。
我教她们读书，
唱歌和画画。
为了她们，
我不再到院子里玩耍。



Васіль Вітка

## *Сяброўкі*

*Хто там грукае ў акно?*
*Гэта вы, сінічкі?*
*Я прачнулася даўно,*
*Запляла касічкі.*
*Вось надзену кажушок,*
*Выбегу на ганак,*
*З лесвіцы змяту сняжок,*
*Вынесу сняданак.*
*Тут халва і тваражок,*
*Скрылічак каўбаскі,*
*Цёплы з мясам піражок —*
*Ешце, калі ласка.*
*У абед, сінічкі, зноў,*
*Прылятайце смела.*
*Ну, а мне — пара дамоў,*
*Я ж сама не ела.*

友谊
瓦西里•维特科
是谁在拍打窗户？
是你吗，小山雀？
我早就醒来啦，
还编好了辫子。
我披上外衣，
跑到门口，
清扫了廊前的积雪，
也带来了早餐。
这里有酥糖和奶酪，
还有香肠
和热馅儿饼，
快快来吃吧。
午饭时间也要来喔，
勇敢地飞来吧，
我也该回家去啦，
我也还饿着肚子呢。

Пераклад з беларускай мовы **Сюэ Цзінцянь**

# ВІВАТ ВЯЛІКІ!

**Нетрадыцыйны падарунак з нагоды свайго дня нараджэння — святочны канцэрт — паднёс Вялікі тэатр Беларусі прыхільнікам опернага і балетнага мастацтва**



Заслужаныя артысты Беларусі Людміла Хітрова і Канстанцін Геронік. Адажыа з балета "Шчаўкунок"

Яшчэ за гадзіну да пачатку імпрэзы ў той дзень, 25 мая, да пад'езда галоўнага ўваходу ў тэатр сцякалася публіка. У Вялікі, сама назірала не раз, прыязджаюць, як правіла, загадзя. Ледзь затрымаешся да першага званка, прыпаркаваць аўтамабіль на "тэатральнай" стаянцы не зможаш: давод зіцца руліць за межы тэатральнай тэрыторыі, а потым назад бягом, каб не спазніцца... А тут — дзень нараджэння, які да таго ж адзначаецца ў дні пандэміі, калі тэатры працуюць не ў поўную сілу.

Загадзя выбрацца — значыць, не страціць і магчымасць ужо пры падыходзе да тэатра няспешна пагрузіцца ва ўзнёслую атмасферу. Калі не спяшацца, то атрымаеш асалоду ад тонкіх водараў вясны, хай сабе і халаднаватай сёлета, заўважыш бляск кропель, бліскучых на сонца ў фантанах, што ажылі ўвесну перад тэатрам. І, вядома ж, усмешкі дам, якія хаваюцца за такімі ўсім надакучыўшымі маскамі, але адгадваюцца па іскрыстых вачах. Галантнасць мужчын, якія падтрымліваюць сваіх спадарожніц пад локцік, таксама не застанецца без тваёй увагі. А яшчэ загадзя выбрацца — значыць адчуць яднанне з усімі тымі, каму да душы наш цудоўны Вялікі тэатр, алмаз сярод алмазаў, як яго называюць. Прызнаюся, асабліва адчуванне — усведамляць сябе часткай цэлага!

І вось мы ў фае. Раскланьваемся са знаёмымі. Віншуем адзін аднаго з Днём нараджэння тэатра. Дарэчы, у сацыяльных сетках, у прыватнасці, Вконтакте, можна ў запісе пачуць мноства шчырых віншаванняў ад любімых артыстаў, зорных салістаў оперы і балета. Бачу Алену Балабановіч, вядучага рэдактара службы маркетынгавых камунікацый Вялікага. Нагадаю чытачам: Алена ўвесь час актыўна супрацоўнічае з намі, журналістамі: заўсёды ахвотна дае інтэрв'ю, інфармуе пра новыя праекты Вялікага, прэм'еры ды іншыя крэатыўныя падзеі, што праходзяць у тэатры. Алена сама — журналістка. Яна з задавальненнем, уручаючы праграмку, паспявае паведаміць, што на гэты раз Вялікі прапануе гледачам фармат незвычайнага і нечаканага святкавання Дня нараджэння тэатра. І дадае: кіраўніцтва тэатра вырашыла падрыхтаваць святочны канцэрт. Прыгадалі мы і пра тое, якія шырокія экскурсійныя праграмы праводзіліся ў былыя гады ў тэатры. Дзякуючы чаму гледачы знаёміліся з "кухняй" тэатра, з

тым, што схавана ад нашых вачэй. Гэта і праца грымёраў, бутафораў, рэквізітараў, рабочых самых розных майстэрняў і цэхаў. У публікі была магчымасць убачыць напружанаю і адказную працу усіх службаў Вялікага. Традыцыйна гэты дзень завяршаўся операй Жоржа Бізэ "Кармэн", у якую на галоўныя партыі запрашаліся знакамітыя артысты з іншых тэатраў свету. Менавіта гэтай операй у далёкім 1933-м адкрываўся Оперны тэатр. Праўда, дзея праходзіло на сцэне Беларускага драматычнага тэатра, — у тым будынку цяпер месціцца Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. У ролю Кармэн бліскуча ўжывалася Ларыса Александроўская, народная артыстка СССР.

Дарэчы, на сайце Вялікага тэатра можна запазычыць шмат цікавай інфармацыі пра гісторыю тэатра, даведацца пра тое, што яна пачыналася задоўга да яго афіцыйнага адкрыцця. Першая старонка — Беларускі музычны тэхнікум, у якім у 1928-м адкрыўся вышэйшы оперны клас, яго арганізатарам і кіраўніком выступіў Антон Пятровіч Баначыч. На базе таго класа ў кастрычніку 1930 года была створана Беларуская студыя оперы і балета з мэтай падрыхтаваць у рэспубліцы адкрыццё тэатра оперы і балета. А ў 1933-м студыю і рэарганізавалі ў тэатр.

У архіве Вялікага захоўваюцца афішы, праграмы, фотаздымкі, друкаваныя матэрыялы, пачынаючы з 1926 года і па цяперашні час. Шмат было сабрана дакументаў па гісторыі тэатра, але падчас вайны ўсё разрабавалі і вывезлі нямецкія акупанты. Пасля вяртання тэатра з эвакуацыі пачалося яго адраджэнне, ставіліся новыя спектаклі, ствараліся афішы, праграмы, фатографы здымалі сцэнічнае дзеянне, здымкі назапашваліся, пісаліся водгукі... Усё гэта беражліва збіралася і захоўвалася, нават акцёры аддавалі ў архіў тое, што было ў іх асабістых тэатральных сховах. На сённяшні дзень тэатр мае шмат афіцыйных архіўных матэрыялаў і найбагатую калекцыю афіш, праграм, фотаздымкаў, плакатаў, друкаваных матэрыялаў пра тэатр за ўсе гады яго існавання.

Вечар, які рыхтавалі да 25 мая пастаноўшчыкі рэжысёр Галіна Галкоўская і дырыжор Іван Касцяхін, уладальнікі медалёў Францыска Скарыны, атрымаўся! На сцэне Вялікага мы ўбачылі, якія магутныя творы сусветнай балетнай і опернай класікі цяпер ідуць на яго сцэне, і які найбагацейшы рэпертуар склаўся ў тэатры за мінулыя гады. У гэтым канцэрце, як ні ў якім іншым, былі прадстаўлены цэлыя сцэны, фрагменты, нумары з самых знакавых, самых вядомых класічных твораў. Задзейнічана была практычна ўся балетная трупа, вядучыя майстры оперы і балета, фантастычны хор, аркестр, міманс, юныя артысты Дзіцячага музычнага тэатра-студыі. Вялікі тэатр паказаў сябе ва ўсю сваю моц. Дарэчы, па словах Галіны Галкоўскай, нездарма ўсе, хто прымалі ўдзел у канцэрце, называлі гэта дзейства спектаклем. "Вось такая невыпадковая агаворачка", — казала яна незадоўга да канцэрта Алене Балабановіч, якая працытавала мне словы Галкоўскай. Прыводжу іх цалкам: "Сама з вялікім задавальненнем нацешылася канцэртам, седзячы ў глядзельнай зале, зноў і зноў пераслухоўваючы гэтыя вялікія класічныя творы. Боская музыка, фантастычная харэаграфія балетных і рэжысёрскіх рашэнняў оперных спектакляў — сапраўдныя "хіты", адзін за адным будуць радаваць публіку! І гэта сапраўды тое, чым трэба і варта ганарыцца. Таму што не кожны тэатр можа пахваліцца такім рэпертуарам... Мы жывем у час, калі дзякуючы тэхнічным магчымасцям, багатым фота- і відэадакументам можам лёгка здзейсніць палёт у мінулае — убачыць і пачуць легендарных дырыжораў, артыстаў, музыкантаў, якія стваралі славу Вялікага. Мы маем багатую тэатральную гісторыю, якую забываць нельга.

Галоўнае, каб гэтая традыцыя заставалася жывой. А наша традыцыя — гэта высокі ўзровень музычнай і харавой культуры, такая ж высокая прафесійная якасць оперных і балетных спектакляў... Паспрабуем, каб у гэты вечар гледачы акунуліся ў гісторыю тэатра, натхніліся тым, што ўбачаць і пачуюць на сцэне. Хочацца, каб яны, прыходзячы ў тэатр, адчувалі сапраўдныя эмоцыі ды ў іх узнікала непераадольнае жаданне вяртацца сюды. Яшчэ і яшчэ раз. Спадзяюся, публіка адчуе, што гэта сапраўдае свята — свята, кал валадарыць праўдзівае мастацтва... ".

Так яно і было. Дзякуючы па-майстэрску выбудаванаму канцэрту мы змаглі акунуцца ў гісторыю тэатра, якая была прадстаўлена на супер-заслоне ў выглядзе фотаздымкаў. І калі адно фота змянялася іншым, гучала музыка з тых спектакляў, фрагменты якіх былі захаваныя на здымках.

Гукі чароўнай музыкі Пятра Чайкоўскага, Джакама Пучыні, Джузэпэ Вердзі, Дзмітрыя Смольскага, Вячаслава Кузняцова, Жоржа Бізэ, Сяргея Пракоф'ева, П'етра Маскані, Шарля Гуно, Аляксандра Барадзіна, Карла Орфа, Арама Хачатурана пераносілі нас у мінулае, і ствралася ілюзія мяккага яго пранікнення ў нашы дні. Скажам, вось здымак Ларысы Александроўскай у ролі Кармэн. Падымаецца заслона — і на сцэне Кармэн заслужанай артысткі Беларусі Аксаны Якушэвіч, нашай сучасніцы. Заўважу, у Вялікім — дзве зорныя выканаўцы гэтай яркай і складанай ролі. І кожная цудоўная па-свойму. Аксана Волкава, заслужаная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, у той святочны вечар спявала малітву Сантуццы з оперы "Сельскі гонар".

Ва ўрыўках з рэпертуарных спектакляў мы ўбачылі выдатных салістаў оперы і балета. Народных артыстаў Беларусі Ірыну Яромкіну, Вольгу Гайко, Ніну Шарубіну, Настассю Масквіну, Уладзіміра Пятрова, Сяргея Франкоўскага, Уладзіміра Громава, Ігара Артамонава, Васіля Кавальчука, заслужаных артыстаў Беларусі Аксану Волкаву, Людмілу Хітрову, Канстанціна Геронiка, Станіслава Трыфанава,



Марта Данусевіч і Аляксандр Гелах ("Багема"), салісты оперы

Андрэя Валенція, Юрыя Кавалёва, Антона Краўчанку, Аляксандра Кеду, Алега Мельнікава, уладальнікаў медаля Францыска Скарыны Таццяну Гаўрылаву, Таццяну Пятрову, Ігара Аношку, Ягора Азаркевіча, Юрыя Гарадзецкага, лаўрэатаў міжнародных конкурсаў Марыю Галкіну, Алену Золаву, Крыксенцію Стасенку, Аляксандра Міхнюка, Такатошы Мачыяму, Дзмітрыя Шабецю, Аляксея Мікуцеля, Тараса Прысяжнюка, Аляксандра Гелаха, Віктара Мендзелева, а таксама Людмілу Уланцаву, Арцёма Банькоўскага, Таццяну Уласень, Ігара Мацкевіча, Эвена Капітэна ды іншых.

Вядома ж, гэты спіс можна прадаўжаць, каб назваць усіх тых, хто плённа працуе ў імя мастацтва оперы і балета. Асобна адзначу хор Вялікага, кожны саліст якога годны ўсялякай павагі і захаплення. Не раз ужо гаварыла і я пра высокі прафесіяналізм артыстаў хору, пра іх артыстызм і магутнае гучанне. Усё гэта — і талент выканаўцаў, і заслуга галоўнага хармайстра Ніны Ламановіч, народнай артысткі Беларусі.

У цяперашні час у рэпертуары Вялікага тэатра Беларусі больш за 80 назваў опер і балетаў (нацыянальныя спектаклі, шэдэўры сусветнай класікі і сучасныя пастаноўкі). Больш за 60 прэм'ерных пастановак ажыццёўлена з 2009 па 2019 год. Лаўрэатамі Нацыянальнай тэатральнай прэміі ў той перыяд сталі спектаклі: "Набука" Дж. Вердзі (2010), "Аіда" Дж. Вердзі (2012), "Лятучы галандзец" Р. Вагнера (2014), "Вітаўт" В. Кузняцова (2014), "Маленькі прынц" Я. Глебава (2016), "Царская нявеста" М. Рымскага-Корсакава (2016). За пастаноўку балета "Вітаўт" калектыў Вялікага тэатра ўдастоены высокай узнагароды — прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" (2014). Творчаму калектыву оперы Д. Смольскага "Сівая легенда" прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі (2017).

Кіраўніцтвам тэатра падпісана 30 мемарандумаў аб супрацоўніцтве з найбуйнейшымі тэатрамі блізкага і далёкага замежжа.

Сёння, у дзень 88-годдзя Вялікага тэатра, яго ядро складаюць дзясяткі выбітных імёнаў試 опернай і балетнай сцэны. Сярод салістаў, імёны якіх прагучалі вышэй, зоркі, якія ззялі на вядучых сцэнах свету — Гранд Опера, тэатр Ла Скала, Метрапалітэн Опера, Вялікі тэатр Расіі ды многіх іншых. Творчыя калектывы Вялікага тэатра Беларусі актыўна гастралююць, з мастацтвам артыстаў тэатра знаёмыя гледачы больш чым 30 краін свету.

Вялікі тэатр Беларусі ўдастоены памятнай медалі ЮНЕСКА "Пяць кантынентаў" за выбітны ўнёсак у папулярызацыю харэаграфічнага і опернага мастацтва ва ўсім свеце і з нагоды 60-годдзя членства Беларусі ў ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры. Нашы выканаўцы атрымлівалі найпрэстыжныя міжнародныя ўзнагароды, перамагалі ў найбуйнейшых конкурсах, дамагаліся высокіх званняў, міжнароднага прызнання. Вялікі тэатр Беларусі перажываў розныя перыяды, але ён заўсёды заставаўся верным свайму пакліканню: дарыць надзею, адкрываць прыгажосць свету і дапамагаць знаходзіць гармонію ў любой жыццёвай сітуацыі. У чым публіка яшчэ раз пераканалася на канцэрце. І яе ўдзячнасць, як тое здарэцце пры ўздыме пачуццяў, выявілася ў працяглых авацыях, кветках, усмешках і воклічах — "Брава!".

Міхаліна **Чаркашына.**

Здымкі прадастаўлены Вялікім тэатрам Беларусі.























Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь адзначыў 88-ы дзень нараджэння. Канцэртная мазаіка.

SB.BY



# АДКРЫВАЦЬ АДМЕТНАЕ Ў БУДЗЁННЫМ

## У Нацыянальным мастацкім музеі не засталася не заўважанай выстава графікі і акварэляў Леаніда Марчанкі "Летапіс маіх дарог", прымеркаваная да 80-годдзя з дня нараджэння майстра

Трэба адзначыць, што і раней працы мастака нярэдка экспанаваліся на рэспубліканскіх і міжнародных выставах. Графіка Леаніда Марчанкі ёсць у фондах многіх галерэй і музеяў, уключаючы Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Траццякоўскую галерэю, Музей сучаснага мастацтва ў Кёльне, у прыватных калекцыях.

Ён пайшоў з жыцця рана — у 54-гадовым узросце, пакінуўшы, тым не менш, пасля сябе багатую творчую спадчыну: афорты, літаграфіі, лінагравюры, алоўкавыя малюнкі, акварэлі, жывапіс. Так, сёння пра гэтага таленавітага мастака, нястомнага падарожніка, чалавека, замілаванага жыццём, расказваюць яго працы — яркія, выразныя, грунтоўныя. А галоўнымі героямі твораў Марчанкі часцяком становяцца самыя звычайныя матывы: дарога, ледзь асветленая нясмелым вясновым сонцам, утопленыя ў снезе хмурным зімовым днём пчаліныя вуллі, аксаміцісты фіялетавы вечар на беразе ўпрыгожанай восеньскім золатам ракі, магутныя корпусы старых караблёў, старажытныя пахаванні, закінутыя ў туркменскіх стэпах, горад, з дакументальнай дакладнасцю зафіксаваны з вышыні птушынага палёту... Але менавіта ў такіх, на першы погляд, непатрабавальных сюжэтах, на думку аўтара, і выяўляецца дзіўная шматграннасць навакольнага свету, раскрываецца рэчаіснасць ва ўсёй разнастайнасці яе праяў.

Леанід Марчанка нястомна вёў своеасаблівую "рэпарцёрскую" дзейнасць. Дзе б ён ні быў, аловак з'яўляўся яго самым верным і нязменным спадарожнікам, які дапамагаў зафіксаваць месцы, падзеі, людзей. Мастак пабываў у многіх кутках планеты: на поўначы, ля падножжа гор Туркменістана, падарожнічаў па краінах Заходняй Еўропы, прайшоўся па вузкіх вулачках шумнага Баку, вандраваў па ўсёй Беларусі. У выніку як памяць пра шматлікія паездкі з'яўляліся цэлыя серыі: "Палярны круг", "Па Туркменіі", "Мая Беларусь", "Жанчыны Палесся", "Мой край азёрны", "Край Нарачанскі", "Мінск", "Зямля і людзі", "Лета ў Залацінцы. БАМ". Некаторыя лісты з гэтых серый былі прадстаўлены і на цяперашняй выставе ў Нацыянальным мастацкім музеі. Стройныя, гнуткія лініі характэрныя для літаграфіі "Дзяўчаты" з серыі "Жанчыны Палесся", якая гучыць сапраўдным гімнам юнацтву. Спакойны веліч паўночных мораў паўстае з афортаў "Праводка", "Порт Ігарка", якія прадстаўлялі на выставе серыю "Палярны круг". Выразны рытм горада з уласцівым яму бесперапынным рухам перададзены ў афортах серыі "Мінск". Бясконцасцю сусвету дыхае старажытная туркменская стэп у афорце "Старажытныя пахаванні" (серыя "Па Туркменіі"). У той жа час парадаксальным чынам сюжэт распавядае пра непазбежную канечнасць быцця. Гімнам прыродзе роднай краіны, яе велічы і прыгажосці гучалі алоўкавыя малюнкі "Векавыя дубы", "Тры хвоі", афорт "Бераг".

Так, Леанід Марчанка вядомы перш за ўсё як майстар афорта. Але пры гэтым мастак ствараў і цудоўныя акварэлі. Да гэтай тэхнікі ён звяртаўся на світанку свайго творчага шляху, затым вярнуўся да яе, будучы ўжо дасведчаным майстрам, выпрабоўваючы патрэбу ў колеры, у жывапісу. Яго акварэлі — лёгкія, паветраныя, празры-

стыя. Створаныя на пленэрах практычна "ў адзін прыём", яны адрозніваюцца свежасцю ўспрымання і натуральнасцю выканання. Марчанка па-майстэрску перадаваў пераходны стан прыроды, калі ўсё вакол нібы апускалася ў цішыню, замірала перад будучымі зменамі. І гэтыя асаблівыя вібрацыі пераходзячага ў змярканне дня альбо разлітага ў празрыстым восеньскім паветры дыхання зімы ўмела перадаваліся ім далікатным дотыкам пэндзля па паперы, мяккім каларытам, які грае тонкімі гранямі і стварае адчуванне бязважкасці намаляванага. Такія працы "Восеньскі матыў", "Возера. Вечар", "Зімовы дзень", "Бярэзіна. Сіні вечар". А нібы ў процівагу іх зыбкасці, насычанасцю і буянствам фарбаў прыцягваюць "Бэз", "Яблыневая галінка", "Каложская царква", "Вясна. Вярба".

Пейзаж і нацюрморт — упадабаныя жанры ў акварэлі Марчанкі. Да выявы чалавека ён звяртаўся радзей, таму "Партрэт жонкі мастака (Ніна Марчанка)" прыкоўвае да сябе асаблівую ўвагу. Акрамя жанравай спецыфікі, праца напоўненая чароўным гучаннем асаблівай пяшчоты, самім жыццём, якое гучыць у залацістым паветры летняга дня.

Выстава "Летапіс маіх дарог" паказвае творча рознабаковага Марчанку: і як здольнага афартыста — аднаго з лепшых у Беларусі, і, несумненна, як тонкага акварэліста-каларыста. Аднак яго галоўны талент, па трапнымназіранні вядомага беларускага мастака Барыса Заборава, заключаўся ў тым, што Леанід Марчанка ўмеў адкрываць прыгажосць у штодзённым, бачыць у малым вялікае, у простым матыве — гармонію свету.

У пару свайго творчага станаўлення, у сярэдзіне 70-х гадоў, Леанід стварыў афортны трыпціх "Мой край азёрны". Асабліва адметны адзін з лістоў гэтай серыі пад назвай "Вясна": хлопчык-мастак стаіць на каленях перад мальбертам, углядаючыся ў велізарны квітнеючы свет. Быццам пытаецца: што чакае мяне наперадзе ў гэтым цудоўным свеце, напоўненым свежасцю паветра і водарам траў, надзеямі, адкрыццямі і неразгаданымі сусветнымі таямніцамі?

Леанід Марчанка пражыў у гэтым свеце нядоўга, але многае паспеў па-сапраўднаму ўвабраць у сябе, у свой характар, у сваё мастацтва: першародную прыгажосць зямлі і яе боль, чалавечую неабыякавасць і кліч гістарычнай памяці, доўгія вёрсты шматаблічных дарог і сучасныя рытмы бягучых будняў.

Так, свае ўражанні, адчуванні, свае мары мастак увасабляў у малюнку, афорце, літаграфіі, акварэлі, пакідаючы на памяць сучаснікам, і тым, хто будзе жыць пасля. У моманты радасці і ў гадзіны нялёгкіх перажыванняў Леаніда ніколі не пакідала глыбокая вера ва ўрачыстасць светлых праяў жыцця. А па дарогах творчасці яго заўсёды вяло імкненне да пазнання новага, нязведанага.

Паездкі па далёкіх і блізкіх паралелях і мерыдыянах тагачаснага Савецкага Саюза былі яго арганічнай патрэбай, а бясконцыя зносіны з людзьмі — крыніцай яго душэўнай раўнавагі. Ён любіў сваю Айчыну — Беларусь, як і малую радзіму — Бабруйшчыну. З зачараваннем і захапленнем маляваў Нарачанскі край і Лепельшчыну, вялікі Мінск і маленькія Паставы, Смаргонь і Лагойск, дзівосныя азёры, маляўнічыя рэкі Бярэзіну і Днепр, Свіслач і Прыпяць.







LIVEINTERNET.RU





Безумоўна, Леаніду пашчасціла ўбачыць свет: ён пабываў у Запаляр'і, Сібіры і Сярэдняй Азіі, у Крыме, Прыбалтыцы і на Каўказе, наведаў Іспанію, Польшчу, Германію, Сірыю, тройчы гасцяваў у Даніі. І ўсюды мастак займаўся творчасцю. А выніккі сваёй працы нёс людзям: звыш трыццаці рэспубліканскіх, больш за дзясятак замежных і міжнародных выстаў на яго рахунку, не кажучы ўжо пра тыя творы, якія сышлі ў прыватныя калекцыі і галерэі.

Сустрэча з вядомым графікам, народным мастаком Беларусі, акадэмікам Георгіем Паплаўскім, якая перарасла потым у шматгадовую цесную дружбу, стала для Леаніда Марчанкі значнай падзеяй у яго творчым і асабістым жыцці. Паплаўскі стаў не толькі яго духоўным настаўнікам у мастацтве, але і патрабавальным крытыкам.

Важна заўважыць, што маладым мастакам 70-х гадоў пашанцавала: як правіла, пасля заканчэння інстытута амаль усе яны сталі майстрамі, для якіх мастацтва было галоўнай справай жыцця, і свой хлеб надзённы здабывалі толькі творчасцю. Гэтаму спрыялі і Саюз мастакоў з добрай матэрыяльнай базай і дамы творчасці. У адным з такіх, вядомым як "Сенеж", што пад Масквой, Леанід Марчанка працаваў тройчы. І можна з упэўненасцю сказаць, што тут ён не толькі адшліфаваў сваё прафесійнае майстэрства ў галіне друкаванай графікі, але і ўвабраў у сябе тую дзіўную духоўную атмасферу, якую стваралі маладыя мастакі, хто прыязджаў сюды з розных куткоў краіны.

Леанід працаваў у розных галінах выяўленчага мастацтва, спрабаваў сябе ў жывапісу і кніжнай ілюстрацыі. Але найбольш поўна, як ужо адзначалася, праявіў сябе ў афорце, акварэлі і алоўкавым малюнку. Гэта быў для яго "роздум з алоўкам у руцэ". Ён па-сапраўднаму любіў графітны аловак за пяшчоту і пругкасць, аксаміцістасць і калянасць лініі, за празрыстасць і гушчыню рыскі. Ён маляваў усё, што клалася на яго душу, што магло спатрэбіцца для будучага афорта. Маляваў беларускія вёсачкі і сібірскую бязмежную тайгу, пейзажы Даніі і хвоі Крыма альбо Юрмалы, землякоў-беларусаў на будаўніцтве Байкала-Амурскай магістралі і старых ветэранаў-партызан, рабочых каспійскіх суднаверфей і маракоў ледаколу "Пётр Вялікі".

У апошнія гады жыцця ён стварыў вялікую серыю бліскучых афортаў, прысвечаных прыродзе Беларусі. Гэтую "лебядзіную песню" майстра, напоўненую пяшчотай да роднай зямлі, трапяткім пачуццём датычнасьці да яе і разважаннямі пра месца чалавека ў прыродзе, можна "слухаць" гадзінамі. А першую яе страфу Леанід Марчанка напісаў яшчэ ў канцы 70-х, заявіўшы пра сябе ў афортах "Возера Чаросава" і "Цішыня" як пра мастака вялікага эмацыйнага накалу. І працягваў ён гэтую лінію да канца сваіх дзён, лічыў сябе мастаком "сваёй зямлі і свайго неба".

Аляксандр **Піменаў**



Падчас выставы



Вясёлка над Свіслаччу непадалёк ад парка Перамогі ў Мінску


НОВОГРУДСКИЕ ДАРЫ
МАСЛО·МОЛОКО·СЫРЫ
СЫРЫ
ЦЕЛЬНАМАЛОЧНАЯ ПРАДУКЦЫЯ
МАСЛА
СУХІЯ МАЛОЧНЫЯ ПРАДУКТЫ
NOVDAR.BY
231400, Гродзенская вобл.,
г. Навагрудак, вул. 1-ае Мая, 59,
тэл. +375 (1597) 6-10-05